ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 5 (925) 30 СТУДЗЕНЯ — 5 ЛЮТАГА 2010 г.

# КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА



Фота Юрыя ІВАНОВА



**27 студзеня ў канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылося пасяджэнне выніковай калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь “Аб рабоце па выкананні галіновай праграмы “Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на 2006 — 2010 гг.” і задачах арганізацый культуры на 2010 год”.**

# АЗІРНУЦЦА Ў БУДУЧЫНЮ

С. 2 — 23.

**27 студзеня, каб падвесці вынікі працы галіны культуры, у канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі сабралася больш за 500 работнікаў сферы, дзеячаў культуры і мастацтваў з усёй краіны, прадстаўнікоў зацікаўленых устаноў і арганізацый.**

**У працы выніковага пасяджэння прымалі ўдзел члены калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, адказныя асобы з Адміністрацыі Прэзідэнта, Савета Міністраў краіны і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.**

**Найбольш вялікай колькасцю ўдзельнікаў былі прадстаўлены міністэрствы і ведамствы нашай дзяржавы. Абмяркоўвалі дасягненні і праблемы сферы культуры супрацоўнікі Міністэрства фінансаў, Міністэрства статыстыкі і аналізу, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Міністэрства спорту і турызму, Міністэрства адукацыі, Міністэрства інфармацыі, Камітэта дзяржаўнага кантролю, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства замежных спраў, кіраўніцтва Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Сярод гасцей калегіі — таксама і супрацоўнікі апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей, Прадстаўніцтва Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы ў беларускай сталіцы ды шэрагу іншых структур.**

**Кожная з падпарадкаваных Міністэрству культуры ўстаноў (а гэта 155 удзельнікаў пасяджэння выніковай калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь) прадставіла на вялікі сход галіны дэлегацыі, у склад якіх увайшлі дырэктары, мастацкія кіраўнікі калектываў, а таксама вядучыя дзеячы культуры і мастацтваў.**

**Агульны лік рэгіянальных дэлегацый — 230 чалавек. Кожная з іх — гэта начальнікі ўпраўленняў культуры аблвыканкамаў, аддзелаў культуры рай- і гарвыканкамаў, спецыялісты па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ўпраўленняў культуры рэгіёнаў краіны, кіраўнікі абласных камітэтаў прафсаюзаў работнікаў культуры, абласных навукова-метадычных цэнтраў, ССНУ, філармоній, тэатраў, бібліятэк, музеяў, кінавідэапракатных арганізацый, прадстаўнікі ўстаноў культуры абласцей — лаўрэаты прэмій і пераможцы конкурсаў 2009 года. Некаторыя з іх выказалі сваё меркаванне пра перспектывы на 2010 год на старонках гэтага нумара “Культуры”.**

**Даклад міністра культуры Рэспублікі Беларусь Паўла Латушкі на выніковай калегіі Міністэрства культуры краіны вызначыў асноўныя акцэнты дзейнасці сферы летась, акрэсліў перспектыву яе развіцця ў 2010-м годзе, узняў мноства актуальных пытанняў.**

**Рыхтуючы для гэтага нумара “К” асноўныя тэзісныя палажэнні выступлення кіраўніка сферы, мы вылучылі надзённыя аспекты, закранутыя міністрам культуры, у своеасаблівыя эпіграфы да падраздзелаў даклада.**

# Культурны падмурак для паспяховай дзяржавы

## З даклада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Паўла Латушкі

**Культура — гэта той фактар у жыцці грамадства, які разам з адукацыяй з’яўляецца галоўным стрыжнем, падмуркам пабудовы развітой і паспяховай дзяржавы. Культура забяспечвае развіццё здаровага грамадства, фарміраванне грамадзяніна як асобы.**

Ролю культуры дакладна вызначыў Прэзідэнт нашай краіны: “Цывілізаванай дзяржавы без культуры няма”. Увага і падтрымка з боку Кіраўніка дзяржавы і Урада краіны, удзел у мерапрыемствах, шматлікія нарматыўныя акты, скіраваныя на падтрымку ўстаноў культуры, кантроль за іх рэалізацыяй, шэраг дзяржаўных і галіновых праграм, што сёння паспяхова рэалізуюцца — даюць свой плён у справе развіцця нацыянальнай культуры і мастацтва. Дзяржаўныя прэміі Рэспублікі Беларусь і спецыяльныя прэміі Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва, прэміі “За духоўнае адраджэнне”, гранты фондаў Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва, творчай моладзі — важны фактар падтрымкі нацыянальнай культуры. За апошнія гады створана сістэма развіцця культуры і назапашаны вялікі вопыт практычнай дзейнасці, якія дазваляюць беларускай культуры стаць стратэгічным рэсурсам нашай дзяржавы.

**Класік нацыянальнай літаратуры Уладзімір Караткевіч, 80-годдзе з дня нараджэння якога мы будзем адзначаць сёлета, казаў: “У беларусаў ёсць свая, Богам дадзеная, зямля. Яна прыўкрасная, іншай у іх няма і не будзе. Таму яе трэба берагчы, песціць. А калі жывеш на гэтай зямлі, павінен быць яе гаспадаром. Ты не маеш права працаваць дрэнна”.**

Адным з вынікаў мэтанакіраванай рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры і шматгадовых намаганняў Міністэрства і органаў культуры на месцах з’яўляецца накоплены самы каштоўны капітал — спецыялісты сферы культуры.

Кожны паасобку і ўсе разам укладваюць у сваю работу не толькі прафесіяналізм, але і частку сэрца і душы. Вынікова працавала сістэма падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі, вялася работа па пераўтварэнні філіялаў кафедраў Беларускай акадэміі музыкі ў філіялы акадэміі на базе абласных сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Прайшла рэарганізацыя вучылішчаў у каледжы: новы статус атрымалі Гродзенскае, Магілёўскае, Мазырскае музычныя вучылішчы, Магілёўскае вучылішча мастацтваў, Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум. Паспяхова прайшла атэстацыя Беларускай акадэміі мастацтваў. Праведзена атэстацыя пяці сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Створана паўнавартасная сістэма навучальных устаноў культуры і мастацтва, якая забяспечвае падрыхтоўку спецыялістаў па пяці профілях і 29 спецыяльнасцях.

**2009 год быў багаты на падзеі і культурныя дасягненні. Сярод іх: увод у дзеянне пасля капітальнага рамонту Вялікага тэатра оперы і балета, працяг рэканструкцыі помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны — Палацава-паркавага комплексу ў Нясвіжы і Замкавага ў Міры, будаўніцтва і адкрыццё новых устаноў культуры, у тым ліку — 2-х музеяў, 10-ці бібліятэк, 37-мі новых тыпаў клубных устаноў у аграгарадках.**

Дэманстрацыяй культурных дасягненняў рэгіёнаў сталі маштабныя і цікавыя творчыя справаздачы абласцей і г. Мінска ў Палацы Рэспублікі, прысвечаныя 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Праведзены на высокім арганізацыйна-творчым узроўні міжнародныя фестывалі “Славянскі базар у Віцебску”, кінафестываль “Лістапад” і форум тэатральнага мастацтва “Панарама” ў Мінску, “Залаты шлягер у Магілёве” і іншыя.

Цікавым новым творчым праектам з’явіўся Рэспубліканскі конкурс маладых талентаў “Зорка ўзышла над Беларуссю”, першы этап якога паспяхова прайшоў у гарадах і раёнах краіны ў канцы мінулага года.

Святкаванне 65-годдзя вызвалення Беларусі адзначылася кульмінацыйнай падзеяй — гала-канцэртам “Мы перамаглі!” ля стэлы “Мінск — горад-герой”, у праграму якога былі ўключаны выступленні лепшых калектываў з абласцей і сталіцы.

Буйная выстаўка-кірмаш “Горад майстроў”, праведзеная 4 ліпеня ў Мінску, прадставіла лепшыя ўзоры мастацтва рэгіёнаў нашай краіны.

**Стан культуры ўплывае на імідж краіны.**

У мінулым годзе быў рэалізаваны шэраг важных міжнародных праектаў. Праведзены Год культуры Расіі, Дні культуры Кітая. У Маскве праведзены Дні культуры Беларусі. Творчыя калектывы рэспублікі забяспечвалі культурныя праграмы ў рамках Нацыянальных выставак Беларусі ў Расіі, Польшчы і Літве.

Падпісаны міжурадавае пагадненне аб культурным супрацоўніцтве з Францыяй, Дзяржавай Катар, міжведамасныя пагадненні аб супрацоўніцтве з міністэрствамі культуры Літвы і Туркменістана. Паміж міністэрствамі культуры Беларусі і Расіі падпісана Праграма арганізацыі і правядзення ў 2010 годзе Года культуры Беларусі ў Расіі. Падрыхтаваны да падпісання міжурадавыя пагадненні аб супрацоўніцтве ў галіне культуры з Італіяй і Грэцыяй, праграмы супрацоўніцтва ў сферы культуры з Літвой, Польшчай і Украінай.

Паспяхова прайшла міжнародная акцыя — Еўрапейскія Дні Спадчыны на тэму: “Беларусь самабытная. Традыцыя. Мова. Рамёствы”.

*(Працяг на стар. 4)*

**2009: дата, падзея, справаздача**

**2009: дата, падзея, справаздача**

**2009: дата, падзея, справаздача**

**Уладзімір Фёдаравіч Матвейчук з кіраўнікамі сферы культуры абласцей на творчай справаздачы Гродзеншчыны ў Палацы Рэспублікі.**

**З выступлення**

**Віктар КУРАШ, намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь**

# Пачэсная задача — захаваць спадчыну

— Падводзячы вынікі 2009 года, можна адзначыць, што ўпершыню з 1994-га асобнай кнігай быў апублікаваны Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Гэта важны крок у справе ўліку нацыянальнага культурнага і гістарычнага набытку і яго папулярызацыі.

Сфера аховы гісторыка-культурнай спадчыны мае наступную спецыфіку: дасягнутыя вынікі вызначаюць наступныя задачы. Асобныя з іх узнікаюць пад час функцыянавання грамадства, ставяцца самім жыццём.

У 2010 годзе Беларусь будзе святкаваць 65-годдзе Вялікай Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. З гэтым гераічным і, у той жа час, трагічным перыядам у жыцці нашага народа звязана 1025 помнікаў гісторыі. **Нашым святым абавязкам з'яўляецца прывядзенне кожнага з іх — асобных пахаванняў, брацкіх магіл, мемарыяльных комплексаў, іншых аб'ектаў, звязаных з ваеннымі падзеямі, — у належны тэхнічны і эстэтычны стан.**

Міністэрства культуры заўсёды аказвала дапамогу мясцовым выканаўчым і распарадчым камітэтам у фінансаванні рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на аб'ектах спадчыны камунальнай уласнасці. На падставе прапаноў мясцовых улад у праекты праграм па фінансаванні Міністэрствам прадугледжваюцца сродкі рэспубліканскага бюджэту для долевага ўдзелу ў работах на аб'ектах спадчыны. У 2009 годзе на аб'екты культуры было накіравана 137,7 млрд. руб., у тым ліку на аб'екты спадчыны камунальнай уласнасці — 4,4 млрд. руб., якія поўнасцю асвоены.

На 2010 год запланавана выдзяленне сродкаў у аб'ёме 71,6 млрд. руб., з якіх на гісторыка-культурныя каштоўнасці камунальнай уласнасці пойдзе 7,7 млрд. рублёў.

Міністэрствам культуры ў рамках выканання галіновай праграмы "Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006 — 2010 гг." **за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту** праведзена паслядоўная работа па інвентарызацыі археалагічных аб'ектаў усёй Мінскай вобласці, Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці і адзінаццаці раёнаў Віцебскай вобласці.

Разам з гэтым, рашэннем калегіі Міністэрства культуры ад 03.12.2008 № 153 была пастаўлена задача аб інвентарызацыі помнікаў археалогіі, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, з выкарыстаннем **сродкаў мясцовага бюджэту.** Міністэрствам атрыманы звесткі аб правядзенні інвентарызацыі помнікаў археалогіі ў адпаведнасці з гэтым рашэннем у Лідскім, Навагрудскім і Мастоўскім раёнах Гродзенскай вобласці, Жабінкаўскім раёне Брэсцкай вобласці і Магілёўскай вобласці. **Нагадваем, што неабходна даслаць матэрыялы фотафіксацыі, апісанняў і картаграфічныя матэрыялы з дакладнай прывязкай даследаваных археалагічных аб'ектаў для іх уключэння ў Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь і ў землеўладкавальную дакументацыю.**

**Разам з тым, мясцовым уладам неабходна прадугледзець выкананне мерапрыемстваў па ахове археалагічных аб'ектаў і, у першую чаргу, прадухіляць несанкцыянаваныя іх раскопкі, што праводзяцца так званымі "чорнымі археолагамі", у тым ліку з выкарыстаннем металадэтэктарных прыбораў.**

Важнай формай захавання аб'ектаў спадчыны з'яўляецца іх уключэнне ў турыстычную сферу. Міністэрствам культуры распрацаваны тыпавы пералік мерапрыемстваў, накіраваных на захаванне сядзібна-паркавых (палацава-паркавых) комплексаў і ансамбляў, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, якія не выкарыстоўваюцца на сучасным этапе. Названы пералік мерапрыемстваў дасланы ва ўпраўленні культуры абласных выканаўчых камітэтаў для прымянення пры выкананні першачарговых работ па забеспячэнні захаванасці гісторыка-культурных каштоўнасцей на перыяд да правядзення рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ, у тым ліку прыстасавання аб'екта пад сучасныя функцыі.

Для выкарыстання ў мэтах турызму праводзіцца мэтанакіраваная праца па падрыхтоўцы гісторыка-культурных каштоўнасцей да паказу, што закранае не толькі музейныя тэхналогіі, але і пытанні добраўпарадкавання, рэканструкцыі, рэстаўрацыі, захавання унікальных прыродных аб'ектаў, адаптацыі комплекснай гісторыка-культурнай каштоўнасці ў сучаснае горадабудаўнічае асяроддзе. У дадзеным накірунку зроблены крокі сумесна з Міністэрствам спорту і турызму: падрыхтаваны пералік сядзібных комплексаў, якія не выкарыстоўваюцца, з мэтай уключэння іх у сферу эка-агратурызму.

У пераліку сядзібных і палацавых комплексаў ёсць аб'екты, звязаныя з родамі Багдановічаў, Валовічаў, Яленскіх, Наркевічаў-Ёдкаў, Абуховічаў, Плятэраў, Пацеяў, Пузыняў, Сапегаў, Святаполк-Чацвярцінскіх, Слатвінскіх, Радзівілаў, Рэйтанаў, Раманавых.

**Неабходна наладжваць працу па супрацоўніцтве з прадстаўнікамі княжацкіх родаў беларускага паходжання. Прыкладам такой работы можа быць сустрэча з нашчадкамі Радзівілаў у Беларусі, пад час якой дасягнуты дамоўленасці аб актывізацыі іх супрацоўніцтва з музеем-запаведнікам "Нясвіж" па абмене інфармацыяй, звесткамі аб выстаўленых на продаж праз аўкцыёны прадметах антыкварыяту, звязаных з родам Радзівілаў, і стварэнні з удзелам спадчыннікаў магнацкага роду апякунскай рады па выкананні работ на аб'ектах спадчыны г. Нясвіжа.**

Значны крок зроблены ў наданні статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці нематэрыяльным праяўленням творчасці чалавека. У 2009 годзе такі статус быў нададзены пяці абрадавым і песенным традыцыям.

Абрад "Калядныя цары" з вёскі Семежава Капыльскага раёна ўключаны ў Спіс нематэрыяльнай спадчыны UNESCO, якой патрабуецца тэрміновая ахова.

Небяспечная сітуацыя склалася з драўлянымі праваслаўнымі храмамі, якія ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Пры іх рамонце выкарыстоўваюцца сучасныя матэрыялы, страчваюцца адметныя мастацкія, духоўныя і дакументальныя вартасці, якія абумовілі наданне статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці (цэрквы у вёсках Гошчава Івацэвіцкага раёна і Ляхавічы Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці). Ёсць намер знесці царкву ў вёсцы Гарадзішча Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці, якая з'яўляецца помнікам архітэктуры, і пабудаваць на яе месцы новую. Святары Гродзенскай епархіі пачалі здымаць ахоўныя дошкі з помнікаў архітэктуры. Для прадухілення падобных дзеянняў Міністэрствам культуры вядзецца растлумачальная работа, арганізаваны дыялог з кіраўніцтвам Беларускай Праваслаўнай Царквы.

**Аднак і мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы павінны больш актыўна працаваць**

**непасрэдна з уласнікамі гісторыка-культурных каштоўнасцей, даводзячы да іх ведама інфармацыю аб устаноўленым заканадаўствам парадку выкарыстання і ўтрымання помнікаў архітэктуры, правядзення на аб'ектах спадчыны розных відаў работ.**

Актыўнае выкарыстанне гісторыка-культурных каштоўнасцей у розных сферах сучаснага жыцця з'яўляецца асноўнай задачай у справе захавання спадчыны. Застаецца актуальным пытанне распрацоўкі праектаў зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія павінны быць падрыхтаваны ў складзе дэталёвых планаў населеных пунктаў. **Усяго на сённяшні дзень распрацавана 43 праекты зон аховы. У той жа час, 4700 помнікам археалогіі, архітэктуры, горадабудаўніцтва, запаведным мясцінам патрабуецца распрацоўка праектаў зон аховы.**

Не можа пакінуць абыякавым знешні выгляд помнікаў архітэктуры ў гарадскім асяроддзі. Мінскім гарвыканкамам зроблены пэўныя крокі па ўзмацненні кантролю за ўтрыманнем і выкарыстаннем гісторыка-культурных каштоўнасцей, для чаго прынята рашэнне ад 16.07.2009 № 1674 "Аб архітэктурным абліччы фасадаў будынкаў у г. Мінску, якія з'яўляюцца гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі", што прадугледжвае ўзмацненне нагляду за размяшчэннем рэкламных шыльдаў, металапластыкавай сталяркі, кандыцыянераў і спадарожнікавых антэн на гісторыка-культурных каштоўнасцях. У адпаведнасці з названым рашэннем да адказнасці прыцягнуты шэраг грамадзян і юрыдычных асоб, вынесены рашэнні суда аб вяртанні аб'ектам спадчыны першапачатковага выгляду. **У той жа час, не зроблена, на наш погляд, самага галоўнага: не вызначаны правы і абавязкі асноўнага ўласніка гарадскіх будынкаў — камунальных эксплуатацыйных службаў, якім належыць распрацаваць прапановы па характары сталярных вырабаў для канкрэтнага помніка архітэктуры і забяспечыць кантроль за правядзеннем рамонтаў грамадзянамі кватэр, карыстальнікамі ўбудаваных памяшканняў паводле выпрацаваных агульных правілаў.**

Адным з накірункаў дзейнасці ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны, вызначаным галіновай праграмай "Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006 — 2010 гг.", з'яўляецца падрыхтоўка матэрыялаў для ўключэння аб'ектаў спадчыны ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны UNESCO.

У выкананне пункта 1 калегіі Міністэрствы культуры ад 28.01.2009 № 8 упраўленнямі культуры Брэсцкага, Віцебскага, Гомельскага, Гродзенскага аблвыканкамаў падрыхтаваны і зацверджаны планы мерапрыемстваў па падрыхтоўцы дасье: "Фартыфікацыйныя збудаванні Брэсцкай крэпасці", "Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся", "Культавыя збудаванні абарончага тыпу" для прадстаўлення іх у Спіс сусветнай спадчыны UNESCO.

У той жа час, да канца 2010 года неабходна распрацаваць тры дасье з пяці, вызначаных галіновай праграмай. Акрамя таго, дакладна вядома, што, з улікам заўваг эксперта ІКАМОС, патрабуе дапрацоўкі дасье "Матэрыяльнае ўвасабленне духоўнай спадчыны святой Еўфрасінні Полацкай". **Таму ў самы кароткі тэрмін упраўленням культуры аблвыканкамаў пры садзейнічанні ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры неабходна арганізаваць рэальную работу са штомесячным падвядзеннем яе вынікаў.**

Міністэрства прыкладае намаганні па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы арганізацый культуры рэспубліканскага падпарадкавання. У адпаведнасці з выдзеленымі сродкамі ўстановамі культуры ў 2009 годзе былі закуплены музычныя інструменты, кінатэхналагічнае абсталяванне, гукаўзмацняльная і асвятляльная апаратура на агульную суму 7,8 млрд. рублёў.

Значная работа выканана ў 2009 годзе па ўладкаванні аб'ектаў культуры, размешчаных у аграгарадках. Усяго за мінулы год уведзена 256 аб'ектаў культуры. Выдзеленыя на гэтыя мэты сродкі ў памеры 40,5 млрд. рублёў асвоены ў поўным аб'ёме. Акрамя таго, у мінулым годзе завершаны рамонтна-будаўнічыя работы па 41 аб'екце культуры аграгарадкоў. Агульны аб'ём работ на гэтых аб'ектах склаў 22,8 млрд. рублёў. У 2010 годзе запланавана правесці рамонтна-будаўнічыя работы на 426 аб'ектах культуры, размешчаных у аграгарадках. Для выканання згаданых работ патрэбна 111 млрд. рублёў. У сувязі з гэтым мы просім аблвыканкамы аказаць дапамогу ўпраўленням культуры і выдаткаваць сродкі, неабходныя для выканання работ.

У цэлым, асноўная задача ў справе захавання спадчыны павінна быць накіравана на прыстасаванне гісторыка-культурных каштоўнасцей у сферу актыўнага жыцця, што з'яўляецца найболей дзейснай умовай іх захавання. Гэта дазволіць стварыць цэнтры культурнай дзейнасці, аднавіць страчаныя традыцыі, узнавіць рамёствы, гандаль, стварыць новыя ўмовы выкарыстання гісторыка-культурных каштоўнасцей у адпаведнасці з нацыянальнымі, рэгіянальнымі, эканамічнымі і сацыяльнымі ўмовамі і асаблівасцямі рэгіёнаў.

Гісторыка-культурная спадчына — вялікі рэсурс беларускага народа. Яна мае як эканамічнае значэнне, так і вялікі патэнцыял для патрыятычнага выхавання моладзі.

**2009: дата, падзея, справаздача** **2009: дата, падзея, справаздача** **2009: дата, падзея, справаздача**





# Культурны падмурак для паспяховай дзяржавы

## З даклада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Паўла Латушкі

*(Працяг. Пачатак на стар. 2)*

**Дасягненні і станоўчыя паказчыкі сферы культуры адбыліся дзякуючы плённаму супрацоўніцтву Міністэрства і рэгіёнаў.**

Усяго ў 2009 годзе з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў на рэалізацыю праграм і культурных мерапрыемстваў, ажыццяўленне дзейнасці арганізацый сістэмы Міністэрства культуры выдзелена 923,5 млрд. рублёў, а таксама 111,5 млрд. рублёў на выкананне Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы. Даходы ад пазабюджэтнай дзейнасці ўстаноў культуры склалі 164,6 млрд. рублёў, што на 20 працэнтаў больш, чым у 2008 годзе. У цэлым па рэспубліцы выкананне прагнознага паказчыка па платных паслугах культуры насельніцтву забяспечана на ўзроўні 119,5 працэнта, пры плане 117.

Паспяхова прайшлі гастролі нашых нацыянальных тэатраў: тэатра Я.Купалы — у Пінску, тэатра М.Горкага — у Віцебску, Вялікага тэатра оперы і балета — у Полацку, Бабруйску і Віцебску. Ва ўсіх абласцях праведзены канцэрты маладых таленавітых музыкантаў — лаўрэатаў і стыпендыятаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі. Міністэрствам культуры прафінансаваны выступленні вядучых канцэртных калектываў — ансамбля танца Беларусі, народнага хору імя Г.Цітовіча, народнага аркестра імя І.Жыновіча, калектываў Белдзяржфілармоніі, якія паказалі змястоўныя і цікавыя праграмы, а таксама многіх іншых.

Правядзенне такіх творчых акцый, як Рэспубліканскі конкурс выканаўцаў на народных інструментах імя І.Жыновіча ў гарадах Магілёве і Гродна, міжнародныя конкурсы камерных ансамбляў імя М.К. Агінскага ў Смаргоні і дзіцячы конкурс “Музыка надзеі” ў Гомелі, спрыяла пошуку новых таленавітых імёнаў у рэгіёнах.

Заслугоўвае ўвагі рэспубліканскае спаборніцтва на лепшую арганізацыю работы ўстаноў культуры і мастацтва па канцэртным і тэатральным абслугоўванні сельскага насельніцтва, якое праводзіцца ў адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта нашай краіны. Лідэрамі на працягу апошніх гадоў з’яўляюцца Магілёўская і Гомельская вобласці.

У рамках традыцыйнага Рэспубліканскага фестывалю “Майстры мастацтваў — працаўнікам сяла” цягам года адбыліся 36 канцэртаў у 12 раёнах рэспублікі, якім Міністэрства культуры перадала таксама музычнае і сцэнічнае абсталяванне, гукаўзмацняльную апаратуру на суму 156 млн. рублёў.

Пэўных культурных дасягненняў дамагліся абласныя і сталічнае ўпраўленні культуры.

Гомельская вобласць вызначаецца добрым станам камплектавання бібліятэчных фондаў на працягу апошніх гадоў. На гэтыя мэты летась выдаткавана амаль 22 працэнты ад бюджэтных сродкаў, якія накіроўваюцца на ўтрыманне бібліятэк.

Па пытаннях камп’ютэрызацыі публічных бібліятэк лідзіруючае месца займаюць Мінск, Магілёўская і Гродзенская вобласці.

Прыярытэтным накірункам па-ранейшаму застаюцца пытанні якасці арганізацыі вольнага часу дзяцей і моладзі. Добрым стымулам для актывізацыі клубных устаноў па выяўленні і папулярызацыі перадавога вопыту стала правядзенне Рэспубліканскага агляду-конкурсу на лепшую арганізацыю дыскатэчных мерапрыемстваў у клубных установах 2008 — 2009 гадоў. Пераможцамі сталі Шклоўскі раённы дом культуры, Цэнтр культуры “Віцебск”, Мазырскі Палац культуры “Будаўнік”, Чыркавіцкі цэнтр вольнага часу Светлагорскага раёна, Бацвінаўскі сельскі дом культуры Крычаўскага раёна, Путчынскі цэнтр культуры Дзяржынскага раёна, Падсвільскі гарпасялковы дом культуры Глыбоцкага раёна.

Разам з тым, праблемы матэрыяльна-тэхнічнага аснашчэння клубных дыскатэк застаюцца актуальнымі. Перспектывы дыскатэчнай палітыкі вызначаны ў рэгіянальных праграмах “Дыскатэка” на 2008 — 2010 гады. Ход рэалізацыі праграм сведчыць, што іх фінансаванне далёка не заўсёды адпавядае патрабаванням сённяшняга дня.

Асобна хочацца адзначыць дзейнасць Палаца культуры г. Маладзечна. Дзякуючы насычанай творчай працы за адносна невялікі час гэтая ўстанова стала візітоўкай і найбуйнейшым цэнтрам культурнага жыцця Міншчыны. У Гомельскай вобласці яркім прыкладам істотнага абнаўлення паслуг традыцыйнай індустрыі адпачынку і, у той жа час, сапраўднай школай па развіцці і ўкараненні новых відаў платных паслуг культуры насельніцтву з’яўляецца культурна-забаўляльны цэнтр “Бубнаўка” — сучасная новая клубная ўстанова ў Акцябрскім раёне.

**Уладзімір РЫЛАТКА, першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь**

# Каардынацыя павінна быць выдатнай

**З выступлення**

— Перш за ўсё мы павінны адказаць на пытанні: ці здолелі мы надаць працэсу культурнага развіцця неабходную грамадскую значнасць? Ці здолелі ўзмацніць міжнародны аўтарытэт краіны, захаваць перанятае і стварыць новае? Я хацеў бы спыніцца на дзвюх тэмах, якія адчувальна ўплываюць на перспектывы развіцця культурных працэсаў у нашай краіне. Першая — гэта рэалізацыя канцэпцыі развіцця Саюзнай дзяржавы ў галіне культуры да 2010 года. Сёлета яна скончыць сваё дзеянне, і распрацоўваецца новая канцэпцыя на 2011 — 2015 гг. На сёння створана ўстойлівая прававая база рэалізацыі двухбаковага культурнага супрацоўніцтва з Расіяй на розных узроўнях. У першую чаргу — у межах Саюзнай дзяржавы, на рэспубліканскім і федэральным узроўнях, тое, што было замацавана двума міністрамі культуры — Беларусі і Расіі — пагадненнем 2009 года, якое было падпісана ў Маскве. У межах СНД — Фонд гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц ЕўрАзЭС, Мытнага саюза. Вельмі добра наладжана супрацоўніцтва з Масквой: увесь час абменьваемся культурнымі праграмамі, сябруем з рознымі раёнамі расійскай сталіцы. Паціху пачынаюць актывізавацца сувязі Мінска з Санкт-Пецярбургам, наладзіла іх таксама Гродзенская вобласць. Традыцыйна развіваюцца прыгранічныя сувязі.

Наступны ўзровень — сувязь паміж установамі культуры. Сярод іх лідэрамі можна назваць Нацыянальны мастацкі музей і Нацыянальную бібліятэку Беларусі, вышэйшыя навучальныя ўстановы. Формы супрацоўніцтва — самыя розныя: гэта фестывалі, майстар-класы, сумесныя пастаноўкі, здымкі фільмаў, тэатральна-канцэртны, выставачны абмен і г. д.

Днямі патэлефанавалі з Масквы, дзе на сцэне тэатра “Майстэрня Пятра Фаменкі” з бляскам быў прадстаўлены праект “Вяселле” Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Была прадэманстравана творчая энергія калектыву, а, па словах вядомага маскоўскага тэатральнага крытыка, наш акцёр Генадзь Аўсяннікаў літаральна “парваў” тэатр. 5 красавіка Беларускі балет адкрывае ў Вялікім тэатры Расіі Дні культуры Беларусі ў Расійскай Федэрацыі, 2 мая Дзяржаўны сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам маэстра Аляксандра Анісімава. Так пачнецца Год Беларусі ў Расіі. Ёсць шмат новага, што мы можам паказаць: яркія маладыя мастакі, кампазітары, акцёры ўжо з’яўляюцца нашым гонарам. Мы можам спакойна казаць, што ў беларускай культуры ёсць будучыня. Толькі на закупкі твораў айчынных кампазітараў, драматургаў і г. д. затрацілі болей за 1,7 мільярда рублёў, і амаль палова з аўтараў — у самым актыўным узросце: да сарака гадоў.

Мы вельмі высока ацэньваем культурны, палітычны, маральны, чалавечы, духоўны і мастацкі фактары супрацоўніцтва з Расіяй, але ёсць некаторыя абставіны, якія для нас практычна прыносяць вялікія выгоды. У мінулым годзе інвестыцыі ў культурнае абслугоўванне насельніцтва ў рэспубліцы за кошт саюзнага, федэральнага, маскоўскага бюджэтаў склалі больш за паўтара мільёна долараў. Дадатнае сальда, тое, што ўкладаем мы, складае больш за паўмільёна долараў ЗША. Фінансавы паток, які ідзе на інвеставанне культуры Беларусі, на 75 — 80% зыходзіць ад Расіі. У сённяшняй эканамічнай сітуацыі павелічэнне аб’ёмаў культурнага супрацоўніцтва за кошт расійскіх сродкаў малаверагодна. У новай канцэпцыі, з улікам дамоўленасцей Кіраўніка нашай дзяржавы і Прэзідэнта Расіі наконт стварэння агульнай культурна-інфармацыйнай прасторы, мы захаваем дасягнутае.

Прыярытэтным становіцца наступны накірунак: стварэнне прававой базы вяртання, перамяшчэння культурных каштоўнасцей, што для нас надзвычай важна. Гэта паўнацэнны бібліятэчны абмен, зварот копій фільмаў з кінаархіваў, іншых архіўных дакументаў, каштоўнасцей, якія захоўваюцца ў бібліятэках і музеях Расіі. Гэта стварэнне роўных магчымасцей у кінапракаце і гастрольна-канцэртнай дзейнасці, развіццё на камерцыйнай аснове дзеля рэальнай перспектывы павышэння акупнасці беларускага кіно, развіцця экана-

**Кулуары: з дыктафоннай стужкі**

**Васіль ЗАРУБА, начальнік аддзела культуры Столінскага райвыканкама:**

— Плануем у 2010 годзе надалей працаваць над умацаваннем матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры раёна ў аграгарадках, у Давыд-Гарадку, у пасёлку Рэчыца. Цягам года будзе прадоўжана рэканструкцыя Нова-Беражноўскага паркавага ансамбля, а ў чэрвені ў вёсцы Гарадная мяркуем правесці Другі Міжнародны пленэр ганчароў на базе Цэнтра ганчарства.

## 2009: ТЭАТР, РЭКАНСТРУКЦЫЯ, ПРЭМ’ЕРА

мічнага стану беларускай эстрады. Без гэтага рынку нам абысціся вельмі складана.

Ёсць прарыў у кінастудыі "Беларусьфільм". За апошнія пяць гадоў узрасла ў дзесятак разоў рэалізацыя айчынных фільмаў на расійскі рынак. Але ўпершыню выйсці ў пракат на нармальнай аснове мы змаглі толькі сёлета — са стужкай "Снайпер" Аляксандра Яфрэмава. Што да эстрады, то ёсць толькі тры-чатыры беларускія выканаўцы, якія больш-менш устойліва выступаюць на расійскім рынку, гэта адбываецца вельмі складана. Шлях, якім патрэбна прайсці, даволі цярністы.

Што неабходна зрабіць на гэтым шляху? Стварыць гандлёва-праводзячыя шляхі. У нашай сферы гэта — сумесныя праекты, пагадненні на розных узроўнях. У першую чаргу — стварэнне сумесных камерцыйных арганізацый. Арганізаваўшы такую структуру, мы здолеем паскорыць наш рух на расійскі рынак, які для нас вельмі важны.

Колькі слоў пра платныя паслугі. Віцебскі аблвыканкам давёў да Віцебскага тэатра лялек перавыканаць у гэтым годзе план на 200%. Як ён яго будзе выконваць — невядома. Адбываецца скарачэнне інвестыцый у канцэртнае, дыскатэчнае і кінаабслугоўванне, а гэтыя тры сферы даюць 60% платных паслуг на сяле.

Іншы момант — нарастаючыя міжусобіцы. Наша галіна падобна да Кіеўскага княства. Рэспубліканская арганізацыя прабіцца ў вобласці ўжо не марыць. Абласныя філармоніі дзеляць рынак з раённымі аддзеламі культуры, супернічаюць у межах адной вобласці, цягнуць коўдру кожны на сябе. Гэта патрабуе абласнога аналізу і ўвагі мясцовых улад. Недзе ўзніклі пытанні з уласнікамі дыскатэк: яны пачалі сыходзіць з рынку, перапрафіляваць свае мерапрыемствы. Для нас надзвычай важна захаваць іх, таму што сёння прыватнікі даюць 20 — 25% усяго аб'ёму платных паслуг, а могуць — значна болей, калі мы не будзем іх "душыць".

Фінансаванне тэатральна-відовішчных мерапрыемстваў і кінапрадпрыемстваў плануецца ажыццяўляць на новай нарматыўнай базе. Калі ўсё атрымаецца, я думаю, што гэта будзе новы і доўгатэрміновы рух. Рыхтуюцца два Указы Прэзідэнта, якія тычацца фінансавання культуры і лібералізацыі гастрольнай дзейнасці. Манаполія павінна сыходзіць, але, каб гэта ажыццяўлялася, дзейнасць павінна быць зусім іншага характару. Усім павінна знайсціся месца пад сонцам, каардынацыя дзейнасці павінна быць выдатнай. Выцясняць з адной пляцоўкі адзін аднаго нельга. Калі мы не пераадолеем такія адносіны, што існуюць сёння, мы не здолеем выканаць тыя паказчыкі, якія запланаваны.

Без інвестыцый у тэхнічнае пераўзбраенне развіццё нашага мыслення немагчымае. Просты прыклад: у Мінску з'явіўся першы лічбавы кінатэатр, на невялікую колькасць месцаў. На абсталяванне было затрачана 900 мільёнаў рублёў. Два з паловай мільярды — гадавы абарот, і праз няпоўны год мы атрымліваем ад яго усё, што ўклалі. А калі б у кожнай вобласці па адным такім кінатэатры пабудаваць (тым больш, усе шляхі першым прайшоў Мінск)? Мы тады павялічылі б платныя паслугі ў кіно на 20% толькі дзякуючы адной установе ў кожным рэгіёне.

Яшчэ адзін важны момант: мы павінны перастаць працаваць без білетаў. Трэба наладжваць білетную гаспадарку. Пералічваем грошы ўстановам — аддаём білетныя кніжкі. Мы павінны "забраць" гледача, які сёння не ўлічаны. Па маіх падліках, гэта на працэнтаў дзесяць павялічыць аб'ём платных паслуг.

На мой погляд, павелічэнне глядацкай аўдыторыі не можа складаць 200%. 15 — 20%, не больш. Скарачаць яе недапушчальна, а вось павялічваць, хоць трохі, трэба. Развіццё культуры насельніцтва — наша задача. У 1980-я гады кінааўдыторыя была на 40% большая, чым сёння. Канцэртная — крыху менш за гэтую лічбу, але таксама значна перавышала сённяшнюю.

Упэўнены, мы рэалізуем адну і тую ж задачу: прыцягненне да культуры ўсё большай колькасці людзей. Мы будзем яе рэалізоўваць з уласцівымі беларускай культуры ўздымам і аптымізмам.

## Вячаслаў ВАСІЛЕНКА, намеснік міністра фінансаў Рэспублікі Беларусь

# Зыходзіць з лічбаў, закладзеных у бюджэце

### З выступлення

— Перш за ўсё хачу падзякаваць за запрашэнне на такі прадстаўнічы форум, як калегія Міністэрства культуры. Так склалася, што я двойчы сустракаўся з прадстаўнікамі Міністэрства, абмяркоўваючы вынікі комплекснай праверкі, якія былі, так бы мовіць, не вельмі прыемныя. І сёння, хоць тэма калегіі іншая, адразу мушу сказаць, што падстаў для радасці будзе не вельмі шмат.

Разам з усёй краінай сістэма культуры перажыла няпросты ў фінансавых адносінах 2009 год. Не па нашай віне нам давялося скарачаць выдаткі на будаўніцтва, рамонт, на набыццё абсталявання, але нават у гэтых няпростых умовах нам удалося зрабіць галоўнае: забяспечыць стабільнае фінансаванне заробкаў, стыпендый, пенсій, іншых сацыяльных выплат. Мы захавалі ў належным стане нашы будынкі і памяшканні. Не спыняліся работы па рэканструкцыі найважнейшых культурных помнікаў, не адбылося і масавых скарачэнняў у сацыяльнай сферы, якія вы маглі бачыць на прыкладзе нашых замежных суседзяў. 2010 год будзе таксама няпростым.

Гістарычна склалася так, што большасць помнікаў культуры з'явілася на свет дзякуючы падтрымцы не дзяржавы, але людзей, якіх даўней называлі мецэнатамі, а сёння — спонсарамі. Францыск Скарына не атрымліваў заробку, разлічанага па інструкцыі Міністэрства працы, і будаўніцтва Мірскага замка не было ўключана ў інвестыцыйную праграму Вялікага княства Літоўскага. На жаль, сёння ў нас такой практыкі няма, і ўвесь цяжар па падтрымцы і развіцці культуры ляжыць на плячах дзяржавы. Але пры гэтым дзяржава можа браць на сябе толькі тыя абавязкі, якія падмацаваны наяўнасцю патрэбных для гэтага рэсурсаў. Такі прынцып быў пакладзены ў аснову пры распрацоўцы бюджэту 2010 года.

Кажуць, што бюджэт — гэта справядлівае і раўнамернае размеркаванне расчараванняў, але нават у "размеркаванні расчараванняў" Міністэрства культуры аказалася абдзеленым, атрымаўшы крыху больш за 2 адсоткі ад нашага плана 2010 года. Але ж зрушыцца наша прамысловасць, гандаль, іншыя сферы эканомікі, і ўсе дадатковыя даходы пасля ўдакладнення бюджэту будуць размеркаваны, у тым ліку і на карысць сістэмы культуры. Гэта — заўтра. А на сёння пры фінансаванні, альбо пры жаданні спансіраваць тыя ці іншыя мерапрыемствы, мы перш за ўсё павінны зыходзіць з тых лічбаў, якія закладзены ў нас у бюджэце на 2010 год і прапісаны ў адпаведных дакументах мясцовых органаў, не забываючыся пры гэтым пра тыя шырокія правы, што прадастаўлены ўстановам культуры па прыцягненні і выкарыстанні пазабюджэтных крыніц. Іншага на сёння не дадзена.

### Кулуары: з дыктафоннай стужкі

**Наталля ЦАРКОВА, начальнік аддзела культуры Капыльскага райвыканкама:**

— Абрад "Цары" з вёскі Семежава нашага раёна ўжо ўключаны ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны UNESCO, а цяпер рыхтуем дакументы на тое, каб прадставіць у Спісе яшчэ адзін нематэрыяльны помнік з той жа вёскі, які апісвае тэхніку закладнога ткацтва.

2010 год — юбілейны для Кузьмы Чорнага, а ў нас у вёсцы Цімкавічы, дзе нарадзіўся пісьменнік, дзейнічае філіял Літаратурнага музея. Там плануецца правядзенне ў маі — чэрвені цэлага цыкла мерапрыемстваў, а таксама, магчыма, канферэнцыі, чытанняў.

## У ФОТААБ'ЕКТЫВЕ...

# Культурны падмурак для паспяховай дзяржавы

## З даклада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Паўла Латушкі

*(Працяг. Пачатак на стар. 2, 4)*

Хацелася б адзначыць працу ўпраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама па метадычным забеспячэнні дзейнасці музеяў. Лідзіруючыя пазіцыі ў рэспубліцы займае Гомельскі палацава-паркавы ансамбль. Выдатных паказчыкаў дасягнуў і Гомельскі абласны музей ваеннай славы.

Сярод раённых музеяў хочацца вылучыць Жлобінскі гісторыка-краязнаўчы музей, Рагачоўскі музей народнай славы, Тураўскі краязнаўчы музей, музей “Трагедыі Чарнобыля” ў в. Судкова Хойніцкага раёна, Музей гісторыі Светлагорска.

Самы высокі паказчык у краіне па ўвядзенні новых відаў музейных платных паслуг і праведзеных праграмах — у Віцебскай вобласці. У кожным рэгіёне распрацавана не менш чым адзін турыстычны маршрут. Полацкі запаведнік атрымаў Першую інтэрнет-прэмію конкурсу “TIBO-2009” за партал “Музеі Беларусі” ў намінацыі “Культура і мастацтва”.

Аднак існуюць тут і недапрацаваныя моманты… Германавіцкі музей культуры і побыту з унікальнай калекцыяй Язэпа Драздовіча не мае фондасховішча і памяшкання для працы супрацоўнікаў.

На Брэстчыне патрабуюць капітальнага рамонту будынкі абласнога краязнаўчага музея, яго філіяла “Выратаваныя каштоўнасці”, адміністрацыйны будынак філіяла “Камянецкая вежа”, Музей Беларускага Палесся, Івацэвіцкі краязнаўчы музей.

Неабходна будаўніцтва фондасховішчаў у Музеі гісторыі Брэста, Мотальскім музеі народнай творчасці, пашырэнне фондасховішча ў Ганцавіцкім краязнаўчым музеі.

Ёсць упэўненасць, што гэтыя праблемы будуць вырашаны, паколькі выдзяленне сродкаў прадугледжана абласным бюджэтам у 2010 — 2015 гадах.

Тэндэнцыя стабільнага павелічэння наведвальнікаў дзяржаўных музеяў Магілёўскай вобласці, што акрэслілася ў мінулыя гады, захоўвалася і ў 2009-м. Але гэты паказчык амаль у два разы меншы ў параўнанні з музеямі Гомельшчыны, Віцебшчыны і Міншчыны. Над гэтым трэба працаваць…

**На працягу 2009 года 124-ма адзінкамі папоўніўся Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей, які цяпер налічвае 4911 значных аб’ектаў. Праз Дзяржаўную інвестыцыйную праграму фінансуюцца 13 аб’ектаў культуры.**

Неабходна падкрэсліць, што пры рэстаўрацыйна-аднаўленчых работах на гістарычна-культурных каштоўнасцях асаблівая ўвага павінна надавацца безумоўнаму захаванню аўтэнтычных элементаў і канструкцый помнікаў архітэктуры. Нельга пад выглядам рэстаўрацыі займацца простым будаўніцтвам. На прыкладзе аднаўлення Мірскага замка неабходна на падобных аб’ектах забяспечваць высокую ступень узаемадзеяння заказчыка, падрадчыка і навуковага кіраўніка на ўсіх этапах праектавання і рэстаўрацыі.

Чакаю далейшага ўзмацнення ролі Рады па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры. Рада павінна праводзіць больш выязных пасяджэнняў. Прыярытэтнымі ў яе дзейнасці павінны быць справы рэстаўрацыі найважнейшых для гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі каштоўнасцей.

Міністэрства разлічвае на працяг партнёрскіх узаемаадносін са створанай у 2009 годзе грамадскай назіральнай камісіяй пры Міністэрстве культуры па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны.

Ад упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны бліжэйшым часам чакаю канкрэтных прапаноў па аднаўленні сістэмы вертыкалі па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны ад раёна да Міністэрства. Прашу прапрацаваць неабходнасць унясення адпаведных змен у нарматыўна-прававую базу. Спадзяюся на актывізацыю адпаведнай працы з боку ўпраўленняў культуры аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама, раённых аддзелаў культуры ў справах захавання гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Разам з бюджэтным фінансаваннем наспела неабходнасць пошуку і іншых крыніц фінансавання аб’ектаў рэстаўрацыі. Гэта могуць быць сродкі прыватных — як беларускіх, так і замежных — інвестараў, а таксама выхадцаў славутых родаў з беларускай зямлі. Мы павінны прапанаваць зацікаўленым набыццё маёнткаў, сядзіб пры ўмове іх рэстаўрацыі пад навуковым даглядам Міністэрства культуры.

Хацеў бы звярнуцца з даручэннем і адпаведнай просьбай да ўпраўленняў культуры і аддзелаў культуры мясцовага самакіравання, устаноў культуры і супрацоўнікаў сферы культуры аб падтрымцы грамадска-культурнай акцыі па зборы сродкаў на рэстаўрацыю і кансервацыю Навагрудскага замка — аднаго з найважнейшых помнікаў гісторыі Беларусі. Міністэрства культуры ў якасці заснавальніка латарэі “Скарбніца” з красавіка 2010 года распачынае збор сродкаў праз распаўсюджванне білетаў латарэі. Адпаведны рахунак будзе адкрыты і аддзелам культуры Навагрудскага райвыканкама.

*(Працяг на стар. 8)*

**З выступлення**

## Валерый МАЛАШКА, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама

# Зрабіць закупкі цэнтралізаванымі

— Сёння мы падводзім вынікі працы ў 2009 годзе, які па сваіх задачах і падзеях быў насычаным і няпростым. Тым не менш, ёсць усе падставы лічыць яго прадуктыўным. Вынікі дзейнасці галіны на Магілёўшчыне характарызуюцца станоўчай дынамікай асноўных паказчыкаў функцыянавання прафесійнага і аматарскага мастацтва, упарадкаваннем структуры і сеткі ўстаноў культуры, удасканаленнем падрыхтоўкі кадраў, развіццём навукова-даследчай дзейнасці.

У комплексе мерапрыемстваў па павышэнні эфектыўнасці галіны, якія ажыццяўляе аблвыканкам, планамерна вырашаюцца пытанні кадравага забеспячэння. На сёння кіраўнікоў і спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй — 91 працэнт, а ў шэрагу гарадоў і раёнаў гэты паказчык дасягае 97 працэнтаў. Рашэннем аблвыканкама за два апошнія гады творчым работнікам у Магілёве выдаткавана 12 службовых кватэр, у тым ліку і маладым спецыялістам. Звыш 90 іншагародніх спецыялістаў уладкаваны для пражывання ў інтэрнатах.

Прынятыя Дзяржаўная праграма адраджэння і развіцця сяла і галіновая Праграма захавання і развіцця культуры вызначылі прыярытэты дзяржаўнай культурнай палітыкі. Гэтыя праграмныя дакументы надалі асаблівы дынамізм развіццю культуры, і ў першую чаргу — сельскай. Культура атрымлівае сёння важкую матэрыяльна-тэхнічную і арганізацыйную падтрымку ў выглядзе новых камп’ютэрных тэхналогій, мабільных устаноў, камплектаў сучаснай гукатэхнічнай апаратуры, капітальнага рамонту ўстаноў культуры. За гады рэалізацыі мерапрыемстваў праграм у вобласці ўведзена ў эксплуатацыю больш за 200 устаноў культуры, за кошт сродкаў абласнога бюджэту набыта 52 адзінкі мабільных сродкаў, на набыццё гука- і святлотэхнічнага абсталявання, музычных інструментаў для дзіцячых школ мастацтваў з бюджэту выдаткавана больш за чатыры з паловай мільярды рублёў. Для бібліятэк аграгарадкоў закуплена і падключана да Інтэрнета 178 адзінак камп’ютэрнай тэхнікі, 29 з іх — у мінулым годзе.

На тэрыторыі вобласці ёсць 660 матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, уключаных у Спіс гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь. Нягледзячы на скарачэнне бюджэтных асігнаванняў, працягваюцца работы па рэканструкцыі Успенскага манастыра ў Мсціслаўскім раёне, па ўзнаўленні палацава-паркавага ансамбля ў Кіраўскім раёне, рэканструкцыі аб’ектаў Бабруйскай крэпасці, адкрыты Мастацкі музей імя Г.Г. Паплаўскага ў Бабруйску. Усяго летась рэстаўрацыйна-ўзнаўленчыя работы ажыццяўляліся на 14 аб’ектах Магілёўшчыны. На гэтыя мэты выкарыстана больш за 6 мільярдаў рублёў, а з улікам рэканструкцыі месцаў вайсковых пахаванняў — больш за 8 мільярдаў рублёў, 6,7 мільярда з якіх выдаткавана з абласнога бюджэту.

У вобласці дзейнічае 77 дзіцячых школ мастацтваў і 149 іх філіялаў у сельскай мясцовасці. Пачатковай, мастацкай і эстэтычнай адукацыяй ахоплена больш за 18 працэнтаў, а ў асобных раёнах — да 26 працэнтаў навучэнцаў 1 — 9 класаў агульнаадукацыйных школ. За апошнія гады гэты паказчык павялічыўся на 4 працэнты.

Прыняты меры па актывізацыі дзейнасці прафесійных калектываў у абслугоўванні насельніцтва вобласці. У арганізацыі тэатральна-канцэртнага абслугоўвання ўвага акцэнтуецца на клопат пра сельскага гледача. Гэтаму спрыяе стварэнне тэатральна-філарманічных пляцовак, якіх у вобласці дзейнічае больш як 60, а 11 з іх былі адкрыты ў 2009 годзе.

Вядзецца мэтанакіраваная праца па прыцягненні жыхароў вобласці ў разнастайныя клубныя фарміраванні, аматарскія аб’яднанні. 411 калектываў маюць званні “народны” і “ўзорны”, 10 прысвоена званне “Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь”, аднаму з іх — у мінулым годзе.

Летась на Магілёўшчыне праведзена звыш 100 конкурсных і фестывальных мерапрыемстваў па розных жанрах самадзейнага і прафесійнага мастацтва. Дзякуючы падтрымцы Міністэрства культуры, у вобласці ўзноўлены Фестываль нацыянальнай драматургіі, не скараціўся і пералік міжнародных фестываляў, што падтрымлівае статус Магілёва як аднаго з фестывальных цэнтраў рэспублікі. Фестывалі дзіцячай творчасці “Залатая пчолка”, самадзейнага мастацтва “Вянок дружбы”, духоўнай музыкі “Магутны Божа”, у якіх штогод прымаюць удзел творчыя калектывы і выканаўцы больш чым з 12 краін бліжняга і дальняга замежжа, маюць пазітыўны рэзананс не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. Зацікаўленасць раённага кіраўніцтва ў арганізацыі і правядзенні культурных акцый на яго тэрыторыі садзейнічае вырашэнню многіх арганізацыйных пытанняў, у тым ліку і фінансавых. З агульнай колькасці фестываляў у мінулым годзе — палова (4) прайшла ў раённых цэнтрах вобласці.

За 2009 год па Магілёўшчыне забяспечана выкананне зацверджаных параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця галіны па платных паслугах, энергазбераржэнні, росце заработнай платы. Вядзецца дэталёвы аналіз фінансава-гаспадарчай дзейнасці сферы культуры для аптымізацыі сеткі, расходаў на яе ўтрыманне, а таксама карэкціруецца план сёлетніх мерапрыемстваў для рацыянальнага выкарыстання сродкаў, што выдаткоўваюцца на іх правядзенне. Сфарміраваныя рабочыя групы кантралююць распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі на аб’екты, якія ўводзяцца сёлета ў аграгарадках, і сам ход работ.

2010 год з’яўляецца завяршальным у рэалізацыі шэрагу праграм. Як будуць выкананы даведзеныя заданні — залежыць ад кожнага прысутнага ў гэтай зале, ад сумеснай дзейнасці і ўзаемаразумення міністэрстваў і ведамстваў, выканаўчай улады на ўсіх узроўнях. А праблемных пытанняў хапае.

План платных паслуг, які даводзіцца вобласці, — вельмі напружаны, а сама методыка — недасканалая, бо паранейшаму пры разліку аб’ёмаў паслуг пад увагу бяруцца фактычнае выкананне за папярэдні год і індэкс росту цэн на паслугі культуры, якія выводзяцца статыстычнымі органамі. Просім хадайніцтва перад Саветам Міністраў аб давядзенні мэтавага паказчыка па платных паслугах не ад рэальна дасягнутых вынікаў, а зыходзячы з разліку на аднаго жыхара, выкарыстоўваючы тэмп росту да аб’ёму ў абсалютных цэнах.

Бяздзейнасць Барысаўскай фабрыкі музычных інструментаў з кожным годам усё больш адмоўна ўплывае на арганізацыю навучальнага працэсу ва ўстановах адукацыі сістэмы Міністэрства культуры. Набыццё піяніна, цымбалаў, скажам, кітайскай вытворчасці немагчымае як па якасці, так і па цэнах.

Маючы набытак у 660 матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, варта вырашыць пытанне аб стварэнні ў вобласці рэстаўрацыйна-мастацкіх майстэрняў. Гэта дапаможа планамерна даследаваць і рэстаўраваць помнікі гісторыі і культуры згодна з планаваннем капітальных укладанняў на гэтыя мэты. Магчымы і такі варыянт: стварыць патрэбную ўстанову на базе былога вытворчага мастацкага камбіната “Мастацтва”, які знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці.

Да сённяшняга дня не перададзены для запаўнення экспазіцыі музея Бялыніцкага-Бірулі ў Магілёве 32 этапныя работы мастака. З прычыны гэтага зацягваецца перадача філіяла Нацыянальнага мастацкага музея ў абласную ўласнасць.

Раней узнімалася пытанне аб фарміраванні сродкаў у рэспубліканскім бюджэце на цэнтралізаваныя закупкі фільмафонду, аўтатранспарту, гукатэхнічнай і святлотэхнічнай апаратуры. Я прашу вярнуцца да гэтай праблемы і, па магчымасці, яе вырашыць.

Будынак і матэрыяльная база педагагічнага факультэта Акадэміі музыкі ў Магілёве патрабуюць фінансавых укладанняў. Палову грошай выдаткуем з абласнога бюджэту, але прашу падтрымкі і з бюджэту рэспубліканскага…

Я спыніўся, безумоўна, далёка не на ўсіх пытаннях, якія нам удалося вырашыць, і трэба будзе разам вырашаць, якія з’яўляюцца прыярытэтнымі і важнымі. Але неаспрэчным застаецца адно: мацаванне культурнага багацця краіны — справа выключна адказная. Спадзяюся, што ў гэтым рэжыме адказнасці мы і будзем сумесна працаваць.

Хачу выказаць Міністэрству культуры ўдзячнасць за падтрымку ў ажыццяўленні творчых праектаў, садзейнічанне ў захаванні гісторыка-культурнай спадчыны. Упэўнены, што і надалей будуць улічвацца ўсе канструктыўныя прапановы па ўдасканаленні работы сістэмы ўстаноў Міністэрства культуры, з’явяцца новыя інструктыўна-прававыя акты па ўдасканаленні дзейнасці новых тыпаў устаноў, узаемаадносін працадаўцы і выканаўцы.

**Уладзімір ТАЧЫЛА,
старшыня Полацкага гарвыканкама**

# Культурная сталіца Беларусі, або Полацк — таму, што...

**З выступлення**

— 21 студзеня 2010 года Полацку нададзена высокае і ганаровае званне "Культурная сталіца-2010".

Для палачан відавочна: у Полацку ёсць усё, што робіць горад культурнай сталіцай. Гораду на Дзвіне ёсць чым здзівіць і чым прывабіць. Мяркуйце самі.

Які яшчэ горад у Беларусі і нават у Еўропе можа ганарыцца такімі духоўнымі святынямі? Спаса-Праабражэнская царква — адзіны будынак у Беларусі, дзе амаль цалкам захаваўся фрэскавы роспіс XII ст. Непаўторны Сафійскі сабор — самы старажытны помнік манументальнай архітэктуры ў нашай краіне, што ў XI стагоддзі ўзвёў полацкі князь Усяслаў Брачыславіч. Прападобная Еўфрасіння Полацкая — асветніца беларускага народа, дзякуючы якой узводзіліся храмы... І гэты спіс можна доўжыць...

Вялікім гонарам для жыхароў горада і пацвярджэннем статуса духоўнай сталіцы стаў візіт у Полацк Святейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла.

Полацк з'яўляецца не толькі духоўнай сталіцай, але і цэнтрам зараджэння беларускай дзяржаўнасці, бо менавіта з гэтага горада пачаўся адлік беларускага радаводу, культуры.

Полацк — прызнаны гістарычны цэнтр. З 5 тысяч аб'ектаў, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны, 40 знаходзяцца ў Полацку. І гэты спіс увесь час папаўняецца. У 2009 годзе ў яго ўключаны помнік архітэктуры сярэдзіны XX стагоддзя — будынак былога Дома афіцэраў.

Сучасны горад знаходзіцца ў пастаянным руху, развіваецца...

За апошняе дзесяцігоддзе ўсталяваны помнікі Еўфрасінні Полацкай, Сімяону Полацкаму, полацкім князям Усяславу Брачыславічу і Андрэю Альгердавічу, святыцелю Мікалаю Цудатворцу... У Полацк "вяртаюцца" тыя, хто ўславіў горад на стагоддзі, хто стаў яго аховай і апорай.

У бліжэйшы час будуць адноўлены помнік дойліду Іаану, які пабудаваў у XII стагоддзі Спаса-Праабражэнскую царкву, бюст аднаго з заснавальнікаў беларускага кіно, ураджэнца Полацка Юрыя Тарыча. У межах святкавання Дня горада-2010 будзе адкрыты ўзноўлены помнік героям Айчыннай вайны 1812 года. У планах — стварэнне помнікаў полацкай князёўне Рагнедзе, героям Айчыннай вайны 1812 года Пятру Хрысціянавічу Вітгенштэйну, Якаву Пятровічу Кульнёву...

У горадзе ўсталяваны таксама памятныя знакі "Геаграфічны цэнтр Еўропы" і літары "Ў", садова-паркавыя скульптуры "Полацкі купец" і "Шалі"...

Полацк — той горад, дзе да гісторыі можна дакрануцца рукой... Горад, дзе кожны жыхар з гонарам кажа: "Я — палачанін", і ў гэтым старасла вянскім слове — тысячагадовая сувязь з продкамі, са сваёй зямлёй, са сваёй краінай.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 647 ад 17 снежня 2007 года зацверджана "Комплексная праграма развіцця г. Полацка на 2008 — 2012 гады", у межах рэалізацыі якой мяркуецца: будаўніцтва, рэканструкцыя і рэарганізацыя ўстаноў культуры г. Полацка; пашырэнне пераліку паслуг, што аказваюцца імі; здзяйсненне рэстаўрацыі і музеефікацыі помнікаў гісторыі і архітэктуры, аховы і рацыянальнага выкарыстання патэнцыялу гісторыка-культурнай спадчыны.

Полацк — буйны культурны цэнтр.

Аўтарытэт Полацка як культурнай сталіцы доказаў не патрабуе. На сённяшні дзень галіна культуры горада прадстаўлена 28 установамі: гэта 11 музеяў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, 2 палацы культуры (гарадскі Палац культуры, Палац культуры ААТ "Полацк Шкловалакно"), Цэнтр рамёстваў і нацыянальных культур, дзіцячыя мастацкая школа і школа мастацтваў, 10 бібліятэк, камунальнае унітарнае прадпрыемства "Полацкі гарадскі парк культуры і адпачынку", камунальнае унітарнае кінавідовішчнае прадпрыемства кінавідэапракату "Полацкая кінавідэасетка".

У студзені 2006 года Указам Кіраўніка дзяржавы за значны ўнёсак у развіццё музейнай справы Нацыянальнаму Полацкаму гісторыка-культурнаму музею-запаведніку прысуджана спецыяльная прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У 2009 годзе калектыў музея-запаведніка стаў дыпламантам Першай прэміі інтэрнет-конкурсу "ТІВО-2009" за партал "Музеі Беларусі".

Менавіта ў Полацку знаходзіцца адзін з лепшых, калі не адзіны падобны, музей-запаведнік.

Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік — сапраўдны, жывы, яркі, з выстаўкамі сусветнага ўзроўню! Ён аб'ядноўвае музеі, што адлюстроўваюць спадчыну і багацце полацкай зямлі: беларускага кнігадрукавання, дзіцячы, краязнаўчы, традыцыйнага ткацтва Паазер'я, прыродна-экалагічны, баявой славы, "Домік Пятра І", З.М. Тусналобавай-Марчанка, музей-бібліятэку Сімяона Полацкага, Мастацкую галерэю, Сафійскі сабор.

Жыхары і госці нашага горада маюць магчымасць наведваць стаўшыя ўжо традыцыйнымі штогадовыя міжнародныя фестывалі, якія праходзяць у Сафійскім саборы: старадаўняй і сучаснай камернай музыкі, арганнай музыкі "Званы Сафіі", "Шэдэўры опернага мастацтва ля сцен старажытнай Сафіі"...

У горадзе развіты і запатрабаваны паслугі цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, калектыў якой адным з першых у рэспубліцы распачаў працу па камп'ютэрызацыі бібліятэк. Вядзецца вялікая краязнаўчая праца. Выдадзены шэраг бібліяграфічных матэрыялаў для школьнікаў і настаўнікаў у дапамогу вывучэнню прадмета "Полацказнаўства". Ствараецца поўнатэкставая электронная база "Полаччына". У 2009 годзе ў горадзе адкрылася спецыялізаваная бібліятэка для людзей са слабым зрокам.

У 2010 годзе калектыў цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы г. Полацка ўзнагароджаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за стварэнне рэгіянальнай сістэмы выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у бібліятэчным абслугоўванні насельніцтва, рэалізацыю шэрагу асветніцкіх і краязнаўчых праграм, актыўную дабрачынную працу з інвалідамі і дзецьмі, якія засталіся без апекі бацькоў.

Буйныя штогадовыя творчыя праекты ў сферы культуры Полацка — "Дзень горада", Фестываль сярэднявечнай культуры "Рубон".

У 2009 годзе ўпершыню ў Полацку праведзены: акцыя "Ноч музеяў", І Адкрыты конкурс "Ноч агню", Фестываль ласкутнага шыцця "Полацк-Квілт-2009", у якім узялі ўдзел майстры Беларусі і Расіі.

У 2009 годзе член народнага Літаратурнага аб'яднання "Надзвінне" Надзея Салодкая стала прызёрам рэспубліканскага літаратурнага конкурсу і ўзнагароджана дыпломам за цыкл песень, прысвечаных Году роднай зямлі.

Аб Полацку ведаюць далёка за межамі нашай краіны. У 2009 годзе 17 навучэнцаў дзіцячых мастацкай школы і школы мастацтваў горада атрымалі званні лаўрэатаў і дыпламантаў

міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў і фестываляў, 7 навучэнцаў з'яўляліся стыпендыятамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

У снежні 2006 года калектыву Тэатра танца "Прэм'ер-Спонайд" нададзена званне "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь"; у снежні 2009 года гэтага высокага звання ўдастоены маладзёжны народны тэатр "Пілігрым".

Дасягненні ў сферы культуры і мастацтва садзейнічаюць умацаванню аўтарытэту Полацка ў рэспубліцы і на міжнародным узроўні.

Горад тройчы ўдастоены права правядзення буйных рэспубліканскіх мерапрыемстваў: кірмашу-фестывалю працаўнікоў сяла "Дажынкі-2002", Дня беларускага пісьменства, III Рэспубліканскага экалагічнага форуму, якія прайшлі на высокім арганізацыйным узроўні.

У нашага горада, акрамя пералічаных, ёсць яшчэ асаблівасці: Полацк — гэта горад-фестываль, месца, дзе віруе культурнае жыццё; горад-рэзідэнцыя, куды творчыя людзі могуць прыехаць спачатку ў госці, затым — працаваць, а потым — жыць; тут створаны ўмовы для прафесійнага росту і творчага развіцця; Полацк — горад творчых людзей!

Палачане ўдзячныя Віцебскаму абласному выканаўчаму камітэту за падтрымку ініцыятывы Міністэрства культуры ў наданні высокага і ганаровага звання Культурнай сталіцы-2010. 21 студзеня 2010 года падпісаны План мерапрыемстваў па правядзенні Рэспубліканскай акцыі "Культурная сталіца-2010" у Полацку. Цягам года ў горадзе пройдзе шмат найцікавых падзей, сярод якіх:

— мерапрыемствы, прысвечаныя 100-годдзю перанясення мошчаў Прападобнай Еўфрасінні Полацкай;

— Міжнародны фестываль праваслаўнай творчасці; І Адкрыты фестываль дзіцячай творчасці "Полацкі Анёлак";

— мерапрыемствы, прысвечаныя 65-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, 600-годдзю Грунвальдскай бітвы;

— гастролі салістаў, лепшых творчых калектываў Рэспублікі Беларусь, творчыя сустрэчы, у тым ліку і са знанымі ўраджэнцамі Полацка;

— выстаўкі літаграфіі, жывапісу, графікі.

Сёння жыхары Полацка ганарацца тым, што да шматлікіх пачэсных званняў горада дадалося яшчэ адно: "Полацк — Культурная сталіца 2010 года".

Наш горад — першы, хто ўдастоены гэтага высокага звання. І, як усім першаадкрывальнікам, першай Культурнай сталіцы краіны давядзецца паспытаць усё на ўласным вопыце. Наступным "сталіцам" пашанцуе больш: так бы мовіць, "улічаць недахопы", "возьмуць на ўзбраенне" ўсё самае лепшае.

У Полацка таксама ёсць недахопы, але ўсе яны — працяг яго дасягненняў. Не памыляецца толькі той, хто нічога не робіць. Сёння Полацк — адзін з лепшых гарадоў Віцебшчыны. Ён не заложнік свайго вялікага мінулага, і яго жыхары цудоўна ўсведамляюць, што падтрымліваць статус можна і патрэбна кожны дзень, кожны год, прад'яўляючы патрабаванні самага высокага парадку. Мы робім стаўку на адзін з га-

**Кулуары: з дыктафоннай стужкі**

## Зінаіда КУЧАР, дырэктар Музея гісторыі музычнай і тэатральнай культуры Рэспублікі Беларусь:

— Нашай галоўнай задачай як музея маладога з'яўляецца павелічэнне колькасці наведвальнікаў. А без добрай рэкламы высокіх паказчыкаў наведвання не дамагчыся. Значыць, будзем працаваць і ў гэтым напрамку: ладзіць разнастайныя імпрэзы, канцэрты, выступленні. Усё для таго, каб быць больш цікавымі і прывабнымі. 2010 год можна назваць таксама Годам юбілеяў: Расціслаў Янкоўскі, Вольга Клебановіч, Андрэй Душачкін — і гэта толькі артысты Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Горкага! А яшчэ сёлета мы святкуем 245-годдзе з дня нараджэння Міхала Клеафаса Агінскага. Да гэтай даты рыхтуем выстаўку з нашых фондаў, якую павязём у Варшаву. Святочныя мерапрыемствы не абмінуць і наш філіял — сядзібу Агінскіх у Залессі.

**У ФОТААБ'ЕКТЫВЕ...**

# Культурны падмурак для паспяховай дзяржавы

## З даклада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Паўла Латушкі

*(Працяг. Пачатак на стар. 2, 4, 6)*

**Неабходна большую ўвагу засяродзіць на ўкараненні новых форм працы ў музеях, што дасць магчымасць як прыцягнуць больш наведвальнікаў, у тым ліку моладзі, у музейныя ўстановы, так і павысіць пазабюджэтныя даходы. У якасці прыкладу можна прывесці ўвядзенне пячатак Мірскага і Нясвіжскага замкаў, экскурсію з факеламі па Нясвіжскіх лазах, оперныя канцэрты і спектаклі ля сцен Нясвіжскага замка, выстаўку адной карціны па заказе аднаго наведвальніка і іншае. Такіх ідэй можа быць шмат. Нам трэба больш актыўна аналізаваць працу расійскіх і еўрапейскіх музеяў.**

У адпаведнасці з даручэннем Кіраўніка дзяржавы нам неабходна актывізаваць працу па стварэнні Музея беларускай дзяржаўнасці і экспазіцый Нацыянальнага гістарычнага музея, які ўзнік у 2009 годзе на базе Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, а таксама Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Сумесна з вучонымі Нацыянальнай акадэміі навук і іншымі зацікаўленымі, у тым ліку з Польшчы, Літвы, Расіі, ідзе праца па музеефікацыі замкавага комплексу “Мір”, палацавага ансамбля Радзівілаў у Нясвіжы. Неабходна ісці не шляхам фармальнага набыцця антыкварнай мэблі і прадметаў, а, усведамляючы гістарычную вартасць гэтых аб’ектаў, засяродзіць увагу на стварэнні экспазіцый, якія дакладна адлюстроўвалі б гісторыю Беларусі, уключалі б як аўтэнтычныя прадметы, так і іх копіі. Музеефікацыя пазначаных аб’ектаў — прыярытэт у дзейнасці Міністэрства на 2010 — 2012 гады.

У 2009 годзе адбыўся Рэспубліканскі конкурс на лепшы музей года па патрыятычным выхаванні моладзі, прысвечаны 65-й гадавіне вызвалення Беларусі. Конкурс вызначыў наступных пераможцаў: Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Бярозаўскі раённы краязнаўчы музей, Гомельскі абласны музей ваеннай славы.

Неабходна працягваць працу па далейшым развіцці супрацоўніцтва з музеямі замежжа. Мы спадзяёмся, што важная дамоўленасць аб супрацоўніцтве Нацыянальнага мастацкага музея з сусветна вядомым музеем “Луўр” рэалізуецца ў правядзенні цягам бягучага года шэрагу сумесных праектаў, сярод якіх — арганізацыя ў Парыжы выстаўкі да 200-годдзя з дня нараджэння беларускага мастака І.Хруцкага.

У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адкрыта пастаянная экспазіцыя, прысвечаная народнаму пісьменніку Беларусі Васілю Быкаву.

Шэраг выставак і мерапрыемстваў быў прымеркаваны да Года роднай зямлі.

Выкарыстанне супрацоўніцтва з замежнымі музейнымі ўстановамі будзе спрыяць арганізацыі цікавых выставак з фондаў замежных музеяў, якія прыцягнуць больш наведвальнікаў. Новым цікавым праектам можа стаць выстаўка скрыпак Страдзівары з мясцовасці Крэмона ў Італіі. Бліжэйшым часам мы вызначым музей Мінска, дзе яна адбудзецца.

У выніку плённага супрацоўніцтва з Міністэрствам замежных спраў адбылася перадача твораў мастакоў — ураджэнцаў Беларусі Б.А. Заборава і М.В. Дучыца ў фонды Нацыянальнага мастацкага музея, калекцыі графікі рускага авангарда з прыватнай калекцыі ўраджэнца Беларусі Леаніда Закса — Літаратурнаму музею Максіма Багдановіча.

*(Працяг на стар. 10)*

**З выступлення**

**Анатоль ЯРМОЛЕНКА, народны артыст Беларусі, мастацкі кіраўнік Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь “Ансамбль “Сябры” ўстановы “Беларуская дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія”**

# Як стаць сапраўднымі? І “сваімі”

— Спачатку невялікі каментарый. Я за апошні год шмат разоў быў у кіно і хачу сказаць: мне падабаюцца нашы залы, мне падабаецца, што ў нас з’явіўся першы 3D-кінатэатр, таму я хацеў бы выказаць падзяку ўсім людзям, якія мелі да гэтага дачыненне. Можа, хацелася б большага, але мы рухаемся наперад, і гэта добра. Я, напрыклад, стаў сапраўдным фанатам айчыннага кіно і за гэта шчыра вам дзякую.

А цяпер хацеў бы сказаць пра свае праблемы. Але не пра асабістыя, а пра праблемы ў нашым эстрадным жанры.

Канешне, за апошні час на беларускай эстрадзе з’явілася шмат артыстаў, і кожны год іх усё больш і больш. Але чаму, праслухаўшы аднудзве песні, я, напрыклад, губляю цікавасць да выканаўцы? Можа, я адзін такі, але давайце будзем шчырымі. Менавіта ад Міністэрства культуры залежыць выбар тых выканаўцаў, якія з’яўляюцца абліччам нашай песеннай культуры. Я не маю праграмы толькі тым, што працую. І іншага занятку ў мяне няма.

Таму давайце разбяромся ў тым, чым мы займаемся: шоу-бізнесам ці культурай. Калі культурай — дык дапамагайце нам, а калі шоу-бізнесам — дык мы будзем, як цяпер кажуць, “рубіць бабло” (а менавіта так працуюць цяпер маладыя прадзюсеры, якіх у нас з’явілася апошнім часам шмат).

Калі мы прыязджаем на гастролі, дык нам кажуць: навошта ісці на канцэрт і плаціць грошы за білеты, калі зараз на плошчы будзе бясплатнае мерапрыемства! А як філармоніі акупіць такі канцэрт? Дык давайце ўвядзём хаця б невялікую плату, нейкія квіткі, каб людзі хадзілі і бачылі, што тут трэба плаціць — плаціць за працу артыстаў, як гэта робіцца ва ўсім свеце, у нашых суседзяў.

Цяпер жа атрымліваецца так, што мы прыязджаем, і не можам падняць кошт квіткоў больш за 10 тысяч, бо людзей прывучылі да таго, што ніхто не ходзіць на “сваіх” на ўвазе “Сяброў”, хаця мне, зразумела, хацелася б, каб іншым разам адзначалі і поспехі нашага калектыву. Напрыклад, летась мы былі ў ЗША, дзе выдатна адпрацавалі. Але мне няёмка аб тым казаць, хоць, як падаецца, трэба звяртаць на гэта ўвагу, бо па нас, па нашай творчасці фарміруецца ўражанне аб нашай краіне, аб Беларусі.

Калі размаўляеш з дырэктарамі філармоній, разумееш, што ёсць некаторыя праблемы, якія так і не вырашаюцца.

Абавязкова патрэбна, каб была сістэма канцэртнай арганізацыі. Бо я, напрыклад, зарабляю на жыццё, на касцюмы для калектыву, на артыстаў. Гэта няправільная пазіцыя.

Я не скарджуся. Я магу паехаць у іншыя краіны, ды і ў нашай вывесіць афішы, і людзі прыйдуць, і купяць білеты менавіта па тым кошце, што мы ўстановім. Купяць тыя аматары, якія хочуць слухаць менавіта “Сяброў”. Але моладзь трэба прывучаць да таго, што за ўсё трэба плаціць.

І яшчэ. Трэба ўводзіць інстытут прадзюсерства, як гэта робіцца ва ўсіх цывілізаваных краінах.

Бо раней было як? Як артысты вучыліся, як яны сталелі, як станавіліся сапраўднымі майстрамі? Яны ішлі ў філармоніі і займаліся ў сваіх калектывах. Заўсёды ў кожнай філармоніі быў эстрадны і камерны аддзелы. І так было, так мы раслі, глядзелі на старэйшых сяброў, — так павышалі свой узровень, сваё майстэрства.

А цяпер такога няма. Цяпер прадзюсер бярэ “з вуліцы” здатную, таленавітую дзяўчыну ці таленавітага хлопца і “раскручвае” так, як яму хочацца. І ў гэтым накірунку ідзе ўся наша эстрада.

Таму не з’яўляюцца песні, таму і песні Саюза кампазітараў ніхто не спявае, спяваюць, у асноўным, свае песні. Гэта праблема, якую трэба разгледзець, разабрацца ў ёй.

Шмат у нас таленавітай моладзі, я яе бачу на тых конкурсах і мерапрыемствах, куды мяне запрашаюць у журы. Ёсць таленавітыя людзі, але гэта матэрыял, з якога толькі потым вырастуць тыя, хто прыйдзе на змену нам. А часу на ўсё не так ужо і шмат. Трэба разабрацца з гэтым і дапамагаць маладым творцам, каб было так, як павінна быць.

І апошняе. Мне вельмі прыемна, што 2010 год аб’яўлены Годам якасці. І таму, як мне падаецца, цалкам лагічны наступны крок. Мы цяпер маем вялікую колькасць эстрадных выканаўцаў — давайце будзем выбіраць з іх якасных спевакоў. Каб мы зноў сталі флагманам у эстрадным жанры на постсавецкай прасторы, узорам для ўсіх, як было раней. Я думаю, у нас гэта атрымаецца.

## У ФОТААБ’ЕКТЫВЕ...

**З выступлення**

## Леанід КОЗІК, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі

# Дзейнічаць у звязцы



— Адным з напрамкаў дзейнасці Федэрацыі прафсаюзаў з'яўляецца культурнае абслугоўванне, арганізацыя вольнага часу працоўных і членаў іх сем'яў, а таксама правядзенне культурна-масавых мерапрыемстваў і стварэнне належных, даступных умоў для эстэтычнага выхавання і заняткаў аматарскай мастацкай творчасцю…

Мэта ў мяне сёння простая: хацеў пачуць ад выступоўцаў, ці ёсць нейкія іншыя напрамкі нашай сумеснай узаемакарыснай працы. Я іх пачуў у прамове міністра культуры і ў час яе абмеркавання… Натуральна, нашы стасункі ў перспектыве павінны быць больш цеснымі.

Прафсаюзы на сёння маюць тры палацы культуры, 42 клубныя ўстановы, 168 прафкамаўскіх бібліятэк, 80 ведамасных бібліятэчных устаноў, 918 студый і калектываў самадзейнай творчасці, у якіх займаюцца 19 тысяч чалавек, а 166 тысяч з'яўляюцца чытачамі нашых бібліятэк. Гэта, пагадзіцеся, немалая культурная дзялянка, вялікі творчы патэнцыял. Таму і дзейнічаць нам, безумоўна, варта ў адной звязцы з установамі Міністэрства культуры, бо справу робім адну.

Мы з вамі разам, работнікі культуры, дзесяты раз будзем праводзіць сёлета Рэспубліканскі фестываль народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны". І гэта сапраўды дзяржаўная акцыя…

Але яшчэ раз хачу падкрэсліць: у нас ёсць усе магчымасці, і кадравыя, і фінансавыя, для больш плённага супрацоўніцтва ў справе развіцця культуры. У нас 23 тысячы прафсаюзных арганізацый. Давайце правядзём, скажам, адзіны палітдзень па пытаннях культуры, мовы… І Міністэрства культуры можа заўжды разлічваць на актыўны ўдзел прафсаюзаў у маштабных дзяржаўных акцыях.

**Кулуары: з дыктафоннай стужкі**

### Аляксандр ЯФРЭМАЎ, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, кінарэжысёр:

— Для мяне галоўнай падзеяй мінулага года было заканчэнне васьмісерыйнай карціны "Замах", здача яе Міністэрству культуры. Фільм набыў Першы расійскі канал — карціна, як мінімум, акупілася. Спадзяюся, яна прынясе рэальны даход. Адчуваю, што работа гэтая зацікавіць гледача…

Сітуацыя ж на "Беларусьфільме" змяняецца карэнным чынам: з'яўляюцца новыя рэжысёры, свае карціны знялі Аляксандр Колбышаў і Андрэй Кудзіненка. Як я лічу, гэта — паспяховыя фільмы, канкурэнтаздольныя. І такіх карцін у рэпертуары студыі становіцца ўсё больш… Планую, што ў бягучым годзе ў мяне будзе яшчэ адна васьмісерыйная стужка. Спадзяюся, яна паўторыць лёс "Снайпера" і "Замаху". Галоўнае — не стаяць на месцы, а здымаць кіно.

### Наталля АПАНАСЁНАК, начальнік аддзела культуры Бешанковіцкага райвыканкама:

— План па аказанні платных паслуг за 2009-ы з поспехам выканалі, у супастаўных цэнах — на 136 працэнтаў, а заданне было — 117. Справіліся з задачай за кошт якасці культмасавых мерапрыемстваў. Сёлета план у кожным раёне Віцебшчыны падвоіўся. Адказнасць — найвялікшая. Імкнёмся адпавядаць. Калі ў мінулым годзе мелі 47 відаў паслуг, дык сёлета іх ужо 73. Кожная ўстанова культуры прапанавала штосьці сваё, адметнае. Да прыкладу, стане больш абменных міжраённых канцэртаў. Сёлетні план — 289 мільёнаў рублёў — прымусіць крэатыўна думаць кожнага нашага работніка культуры.

**У ФОТААБ'ЕКТЫВЕ…**

## Мікалай ШАЎЦОЎ, старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў культуры

# Узровень сацыяльнага партнёрства

**У кантэксце калегіі**

Па-першае, дазвольце выказаць усім вам шчырыя словы ўдзячнасці за плённую сумесную працу ў 2009 годзе, значны ўклад у развіццё сацыяльнага партнёрства з Беларускім прафсаюзам работнікаў культуры.

Я перакананы, што мы і ў далейшым сумеснымі намаганнямі будзем добрасумленна выконваць і рэгуляваць адносіны ў сацыяльна-працоўнай сферы, павышэння жыццёвага ўзроўню работнікаў арганізацый галіны і прадухілення працоўных канфліктаў, кіруючыся падпісаным міністрам культуры і старшынёй ЦК, зарэгістраваным у Міністэрстве працы Тарыфным пагадненнем на 2010 — 2012 гады.

Сёння, карыстаючыся магчымасцю, не магу не выказаць шчырыя словы падзякі былому міністру культуры Матвейчуку Уладзіміру Фёдаравічу за яго паважлівыя адносіны да выбарчага прафсаюзнага актыву і падтрымку. Зразумела, толькі агульнымі намаганнямі, узаемапавагай мы зможам зрабіць як мага больш на карысць культуры і мастацтва роднай Беларусі.

У бягучым годзе, а дакладней — 28 мая, адбудзецца чарговы, VI з'езд Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, які падвядзе вынікі работы, вызначыць накірункі дзейнасці прафсаюза на чарговы перыяд, абярэ новы склад выбарчага органа.

Напярэдадні гэтай важнай падзеі праходзяць справаздачна-выбарчыя сходы і канферэнцыі ў прафсаюзных камітэтах. У прафсаюзных групах, цэхавых і пярвічных арганізацыях яны праведзены на высокім арганізацыйным узроўні, пры высокай яўцы і актыўнасці членаў прафсаюза. У студзені завершацца выбары ў раённых прафсаюзных арганізацыях. Я хачу яшчэ раз звярнуцца да кіраўнікоў раённых і абласных аддзелаў і ўпраўленняў культуры з просьбай прыняць непасрэдны ўдзел у іх правядзенні.

Трэба адзначыць, што пераважная большасць раённых і гарадскіх канферэнцый праходзіць з удзелам начальнікаў аддзелаў культуры, намеснікаў старшынь райвыканкамаў. Такая практыка адносіцца, перш за ўсё, да кіраўнікоў аддзелаў культуры Гомельскай, Гродзенскай, Брэсцкай, Магілёўскай і Мінскай абласцей. На жаль, асобныя кіраўнікі аддзелаў, а гэта, на шчасце, адзінкі, палічылі ўдзел у канферэнцыі прафсаюза работнікаў культуры не мэтазгодным. Мне шкада такіх кіраўнікоў, якія не ведаюць, што — першасна, а што — другарадна. Больш за тое: канферэнцыі праходзяць адзін раз на пяць гадоў.

У ходзе выбараў значна абнаўляецца склад старшынь прафсаюзных камітэтаў. Амаль 40% старшынь пярвічных арганізацый абраны ўпершыню. Сярэдні ўзрост выбраных складае 36 гадоў. Да нас прыходзяць маладыя, энергічныя работнікі культуры. На жаль, у асобных раёнах з-за вялікай колькасці культработнікаў ніяк не могуць падабраць прафсаюзнага лідэра. Раней здараліся выпадкі, калі галоўны бухгалтар аддзела культуры адначасова з'яўляўся і старшынёй раённага камітэта прафсаюза.

Пры ўсёй павазе да галоўных бухгалтараў: гэта фармальны падыход да выбараў. Якім памочнікам у такой сур'ёзнай справе можа быць чалавек, што суткамі не выходзіць са свайго службовага кабінета? Начальнік аднаго аддзела культуры Віцебскай вобласці рэкамендуе на пасаду старшыні райкама прафсаюза сакратара дырэктара ЦБС. Лічу, такі падыход не прынясе карысці нашай агульнай справе.

Вельмі прашу, з улікам вышэйсказанага, больш грунтоўна падысці да вырашэння гэтых пытанняў.

Наступнае, аб чым, безумоўна, трэба сказаць: наш галіновы прафсаюз за справаздачны перыяд павялічыўся амаль на 20 тысяч членаў. За гэты час 736 чалавек атрымалі ўзнагароды галіновага прафсаюза. Мы і надалей будзем адзначаць вашу добрасумленную працу.

На чарговым пасяджэнні Прэзідыума ЦК мы падвядзём вынікі конкурсу на лепшую "пярвічку", лепшага грамадскага інспектара працы па выніках за 2009 год, лепшы калектыў па пытаннях эканоміі і беражлівасці, згодна з прынятымі палажэннямі.

Мы апошнім часам сталі практыкаваць прыняцце з Міністэрствам культуры сумесных пастаноў па аналагічных пытаннях. Лічу, што такую практыку работы трэба працягваць, таксама, як і добрую практыку правядзення сумесных мерапрыемстваў, такіх, як рэспубліканскія спартакіяды, культпаездкі і інш.

Сёння мы па-іншаму і не павінны працаваць. Убаку, у ролі наглядальнікаў мы не можам застацца, калі справа датычыцца абароны правоў і законных інтарэсаў членаў прафсаюза.

І мы на справе даказалі, што можам вырашаць па-сур'ёзнаму гэтыя пытанні. Згадайце, як мы абаранілі правы выкладчыкаў музычных школ пры прадастаўленні водпускаў.

Мы сфарміравалі на ўзроўні ЦК, абласных камітэтаў прававыя інспекцыі, якія, у асноўным, не інспектуюць, а аказваюць кансультацыйную дапамогу. Дадзена больш за 2400 кансультацый, праведзена 257 праверак, выяўлена 993 парушэнні заканадаўства аб працы. Вярнулі незаконна ўтрыманых грашовых сродкаў на суму звыш 7 800 000 бел. руб.

Лічу мэтазгодным і неабходным унясенне прапаноў аб дапаўненні ў штатны расклад абласных упраўленняў культуры пасады юрыста альбо юрысконсульта. Без іх, пры існуючым змяненні заканадаўчых і нарматыўных дакументаў, працаваць вельмі цяжка, практычна немагчыма.

Напрыканцы выступлення дазвольце адзначыць станоўчую работу Міністэрства ў мінулым годзе. Прыемна адзначыць, што яго кіраўніцтва працуе над удасканаленнем форм і метадаў працы. На парадак дня калегіі выносяцца актуальныя праблемы, ён не перагружаны вялікай колькасцю пытанняў, якія павінны вырашацца ў рабочым парадку. Сталі практыкавацца сумесныя калегіі з іншымі міністэрствамі, напрыклад, з Міністэрствам спорту і турызму — па развіцці турызму ў нашай краіне.

Толькі разам, агульнымі намаганнямі мы вырашым усе пытанні. Дзяржаўная падтрымка развіцця беларускай культуры і мастацтва сярод усіх краін СНД — самая высокая. Гэта відавочна. Адкажыце, калі ласка, у якой яшчэ краіне свету так шмат будуецца і рэканструюецца аб'ектаў культуры і спорту, дзе ствараюцца жыллёвыя кааператывы работнікаў культуры? 264 работнікі культуры г. Мінска напярэдадні Новага года атрымалі кватэры.

За дзяржаўнай падтрымкай мы павінны актыўна працаваць па ўсіх накірунках нашай дзейнасці.

# Культурны падмурак для паспяховай дзяржавы

## З даклада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Паўла Латушкі

*(Працяг. Пачатак на стар. 2, 4, 6, 8)*

**Як вядома, кожны другі жыхар краіны з’яўляецца карыстальнікам публічных бібліятэк. Новым падыходам павінна стаць забеспячэнне ў кожнай бібліятэцы магчымасці доступу для наведвальнікаў у сетку Інтэрнет, што, перакананы, дазволіць, адначасова, больш шырока прыцягваць моладзь да карыстання кніжнымі фондамі. Гэта тым больш значна, калі яшчэ 14 працэнтаў бібліятэк наогул нетэлефанізаваны.**

Бібліятэчным алімпам краіны з’яўляецца Нацыянальная бібліятэка. Штогод праводзіцца Рэспубліканскі конкурс “Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры”. Пераможцамі XVII конкурсу сталі 14 дзяржаўных публічных бібліятэк.

Актуальным застаецца пытанне якаснага напаўнення бібліятэчных фондаў. За 2009 год у фонды паступіла 1,5 млн. экземпляраў дакументаў, з іх 97 805 — сацыяльна значныя выданні. Сукупны фонд дзяржаўных публічных бібліятэк рэспублікі налічвае зараз звыш 67 млн. экземпляраў. За справаздачны перыяд ён павялічыўся амаль на паўмільёна.

Гэта стала магчымым дзякуючы выкананню даручэння Кіраўніка дзяржавы, у адпаведнасці з якім на камплектаванне накіроўваецца не менш за 15 працэнтаў сродкаў, што выдаткоўваюцца на ўтрыманне бібліятэк.

Сёння ў краіне камп’ютэрызавана 31,8 працэнта дзяржаўных публічных бібліятэк. Гэта — абласныя і цэнтральныя раённыя і гарадскія бібліятэкі, бібліятэкі аграгарадкоў. Найбольшых поспехаў у гэтым дасягнуў г. Мінск (100%). Па-іншаму карціна выглядае ў абласцях. Ад агульнай колькасці цэнтральных бібліятэк больш за 70 працэнтаў маюць свае інтэрнет-старонкі.

**Нам патрэбна сур’ёзна думаць аб стварэнні сістэмы стажыровак найбольш таленавітых кадраў за мяжой, правядзення майстар-класаў вядомых дзеячаў замежнага тэатральнага мастацтва. Істотнай праблемай для айчынных тэатраў з’яўляецца адсутнасць пастановак сучасных аўтараў. Доля беларускай драматургіі ў рэпертуарах тэатраў ледзь дасягае 25 працэнтаў...**

У **тэатральным мастацтве** рэспублікі адбыўся шэраг падзей. Гэта міжнародныя фестывалі тэатральнага мастацтва “Панарама” ў Мінску, “Белая вежа” ў Брэсце, “Март-кантакт” у Магілёве, шматлікія гастролі тэатраў за межамі рэспублікі, яскравыя прэм’еры спектакляў у нацыянальных, рэспубліканскіх і абласных тэатрах краіны. Упершыню ў гісторыі нацыянальнай культуры Вялікім тэатрам ажыццёўлена рэканструкцыя і пастаноўка беларускай оперы XVIII стагоддзя Яна Давіда Голанда “Чужое багацце нікому не служыць”, творчы калектыў якой нядаўна атрымаў спецыяльную прэмію Прэзідэнта Беларусі.



Аднак усё яшчэ востра стаіць праблема з рэжысёрамі. На жаль, маладыя рэжысёры не заяўляюць аб сабе яркімі праектамі, да таго ж, і не праяўляюць актыўнасці ва ўдзеле ў конкурсе рэжысёрскіх эксплікацый Міністэрства культуры. У мінулым годзе было пададзена толькі 8 заявак. Таму мы выдзелілі гранты маладым выпускнікам Акадэміі мастацтваў на пастаноўкі спектакляў. Гэты вопыт — першы, і ён будзе працягнуты.

25% беларускай драматургіі у рэпертуары тэатраў супярэчаць прыярытэтам развіцця нацыянальнай культуры — стварэнню ўмоў для творчасці і падтрымкі айчынных аўтараў. Міністэрствам будуць прыкладзены намаганні, каб пераадолець гэтае становішча. Кожнаму тэатру патрэбна надаць належную ўвагу гэтаму пытанню і ўнесці прапановы па канкрэтных дзеяннях. Больш актыўна ў гэтым накірунку павінен працаваць і Цэнтр беларускай драматургіі, падтрымліваючы сувязь з усімі тэатрамі і аказваючы неабходную метадычную дапамогу.

З мэтай далейшага развіцця нацыянальнага тэатральнага мастацтва Міністэрства культуры плануе ініцыяваць правядзенне Нацыянальнага тэатральнага конкурсу.

*(Працяг на стар. 12)*

**З выступлення**

## Дзмітрый ЧУМАКОЎ, начальнік упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама

# Год якасці для сельскай культуры

— Праца па адраджэнні і развіцці сельскай культуры ў 2009 годзе будавалася па накірунках, закладзеных у галіновай Праграме захавання і развіцця культуры Гомельскай вобласці: удасканаленне структуры і сеткі сельскіх культурна-дасугавых устаноў; захаванне і развіццё народнай, традыцыйнай беларускай культуры, гісторыка-культурнай спадчыны; павышэнне ўзроўню і якасці паслуг, што прадастаўляюцца насельніцтву; умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры і мастацтва; забеспячэнне ўстаноў галіны кваліфікаванымі кадрамі.

Аб усім у кароткім выступленні, зразумела, падрабязна не распавядзеш. Хачу спыніцца на некаторых момантах.

Удзельная вага сельскіх устаноў культуры ад агульнай колькасці арганізацый складае 82%. У сельскай мясцовасці функцыянуе 1268 устаноў, у тым ліку 628 клубных, 605 бібліятэк, 30 дзіцячых школ мастацтваў, 5 музеяў. У 2009 годзе ў дзеючай сетцы сельскай мясцовасці 40 устаноў пераўтвораны ва ўстановы новай тыпалогіі (для параўнання: у 2008 годзе — 37). Усяго ў вобласці налічваецца 169 такіх арганізацый.

У 2009 годзе на сяле ў галіне працавала 3225 супрацоўнікаў, з іх 2150 чалавек — кіраўнікі і спецыялісты.

У мінулым годзе праводзіліся рамонтныя работы на 27 аб’ектах культуры ў 22 аграгарадках 2009 года, завершаны работы на 14 пераходных аб’ектах (гэта аграгарадкі 2005 — 2008 гг.), у тым ліку рэканструкцыя сельскага Дома культуры ў вёсцы Малажын Брагінскага раёна, уведзены ў эксплуатацыю новы будынак Дома народнай творчасці ў Валасавічах Акцябрскага раёна і інш.

На заяўленыя мэты накіравана ў мінулым годзе 23 мільярды рублёў.

У цэлым на ўтрыманне устаноў культуры на сяле на 2009 год было запланавана 32 мільярды рублёў. З улікам дадатковага фінансавання па выніках года накіравана 61 мільярд рублёў.

У 2009 годзе выкананы ў поўным аб’ёме запланаваныя на год мерапрыемствы Праграмы адраджэння і развіцця сяла ў Гомельскай вобласці ў сферы культуры.

З абласнога бюджэту былі выдаткаваны сродкі на закупку камп’ютэраў для 28 бібліятэк аграгарадкоў, чатырох адзінак аўтатранспарту пад мабільныя ўстановы культуры, набыццё камплектаў “адзення” сцэны і гукаўзмацняльнай апаратуры ў мэтах стварэння пляцовак філарманічнага і тэатральнага абслугоўвання, абсталявання класаў філіялаў дзіцячых школ мастацтваў на агульную суму ў 1 млрд. 100 млн. рублёў.

Прадоўжана праца па захаванні аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны: вядзецца рэканструкцыя будынкаў былога калегіума езуітаў у Юравічах Калінкавіцкага раёна і сядзібнага дома ў Чырвоным Беразе Жлобінскага раёна. Сродкі, выдаткаваныя на рэстаўрацыю гэтых аб’ектаў у 2009 годзе з рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў, асвоены ў поўным аб’ёме. Нават утварылася крэдыторская запазычанасць у памеры звыш мільярда рублёў.

Акрамя гэтага, у Юравічах распачаты работы па стварэнні музея пад адкрытым небам — стаянкі першабытнага чалавека, у стадыі завяршэння знаходзіцца распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі на рэстаўрацыю помніка архітэктуры XVIII — XIX стст. — сядзібы ў вёсцы Хальч Веткаўскага раёна для стварэння музейна-турыстычнага цэнтра.

Найважнейшая задача галіны — павышэнне ўзроўню і якасці паслуг культуры, павелічэнне іх аб’ёмаў, якія аказваюцца жыхарам сяла.

Установамі культуры і мастацтва для сельскага насельніцтва за 2009 год было праведзена больш за 24 тысячы канцэртаў, спектакляў, тэатралізаваных святаў і іншых мерапрыемстваў (у 2008 годзе — 23 тысячы).

У мінулым годзе з абласнога бюджэту накіравана 170 млн. рублёў на абслугоўванне сельскага гледача прафесійнымі калектывамі і выканаўцамі. Тэатрамі і абласной філармоніяй арганізаваны 1113 канцэртаў і спектакляў, якія наведалі каля 200 тысяч чалавек. Павялічылася на 6% колькасць канцэртаў і спектакляў для жыхароў аграгарадкоў (2009 г. — 480, 2008 г. — 450).

Асаблівая ўвага ў 2009 годзе была нададзена развіццю платных паслуг культуры, у тым ліку і ў сельскай мясцовасці.

Умацаванне матэрыяльнай базы сельскіх устаноў, увядзенне новых форм працы дазволіла павялічыць аб’ём платных паслуг у супастаўных цэнах у сельскай мясцовасці да 111% (2008 г. — 108,7%). За 2009 год у сельскіх установах культуры было ўведзена больш за 30 новых паслуг, з іх 9 — музейных, 15 — клубных.

Значна павялічыліся даходы ад рэалізацыі тэатралізаваных прадстаўленняў, бібліятэчных і музейных паслуг, арганізацыі працы ў сельскай мясцовасці платных гурткоў.

У якасці прыкладу хачу назваць лідэра па асартыменце платных паслуг на сяле: Зашырскі культурна-спартыўны цэнтр Ельскага раёна. У сваёй дзейнасці тут гарманічна спалучаюць больш за 20 відаў платных паслуг з сацыяльна-культурнымі праектамі.

Адраджэнне, развіццё традыцыйнай народнай культуры, захаванне гісторыі — адна з першасных задач галіны, якая рэалізуецца на сяле.

Акрамя пераліку фестываляў і святаў аматарскай, фальклорнай творчасці, які ўжо склаўся і праводзіцца непасрэдна на сяле, у мінулым годзе ў вобласці былі арганізаваны такія вартыя ўвагі мерапрыемствы, як агляд-конкурс на лепшы сцэнарый і правядзенне свята “Вёсачка мая — я часцінка твая” (Светлагорскі раён), свята народнай кухні ў Акцябрскім раёне, кірмаш святаў і абрадаў “З рога — усяго многа” (Лельчыцкі раён), гісторыка-краязнаўчы конкурс “Наша старажытнае і сучаснае сяло” ў Добрушскім раёне і інш.

У 2009 годзе, пасля завяршэння рамонту будынка, адбылося афіцыйнае адкрыццё Мемарыяльнага музея імя П.Лепяшынскага ў вёсцы Літвінавічы Кармянскага раёна. Мемарыяльны Дом-музей народнага пісьменніка І.П. Мележа ў вёсцы Глінішча Хойніцкага раёна пераўтвораны ў філіял Хойніцкага раённага краязнаўчага музея.

Па стане на 1 студзеня 2010 года ў сельскіх бібліятэках дзейнічалі 114 гісторыка-краязнаўчых і этнаграфічных куткоў, 11 міні-музеяў.

Павелічэнне камп’ютэрнай тэхнікі ў бібліятэках дазволіла пашырыць магчымасць архівізацыі сабраных краязнаўчых дакументаў у электронным фармаце і прадастаўленне іх у карыстанне ўсім зацікаўленым. У якасці прыкладу можна прывесці Светлагорскую цэнтралізаваную бібліятэчную сістэму, дзе створаны электронныя папкі “Культура сельскай сядзібы”, “Чым мы цікавыя свету”, “Асташкавічы: гісторыя і сучаснасць у датах і падзеях”, “Мой гонар — мае землякі”.

Установамі культуры на сяле праводзіцца праца па развіцці творчых здольнасцей сельскага насельніцтва і арганізацыі культурнага адпачынку.

У сельскай мясцовасці працуе 4503 клубныя фарміраванні з колькасцю ўдзельнікаў 39 904 чалавекі, у тым ліку для дзяцей — 2274 і 20 300 адпаведна. удзельнікамі 3261 калектыву мастацкай самадзейнасці з’яўляюцца 25 582 жыхары сельскіх населеных пунктаў Гомельшчыны.

У 2010 годзе праца па развіцці культуры на сяле будзе таксама будавацца па накірунках, вызначаных галіновай Праграмай адраджэння і развіцця культуры, Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця і адраджэння сяла. Але ёсць і адна асаблівасць: год, які наступіў, — год завяршэння згаданых праграмных дакументаў.

Часу няшмат, а пытанні, якія патрабуюць вырашэння, пошуку дадатковых рэзерваў, існуюць:

**1. Камплектаванне кваліфікаванымі спецыялістамі ўстаноў культуры на сяле, павышэнне кваліфікацыі кадраў галіны.**

**2. Працяг працы па рэарганізацыі сеткі ўстаноў культуры, пры гэтым як асноўная задача — захаванне якасці абслугоўвання сельскага насельніцтва.**

**3. Паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнага становішча ўстаноў культуры, асабліва ў раёнах, што пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.**

У гэтай сувязі я хацеў бы звярнуцца з просьбай да Міністэрства культуры.

У рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС (Пастанова Савета Міністраў ад 11.01.2006 г. № 29) штогод плануюцца мерапрыемствы, накіраваныя на паляпшэнне сітуацыі, якая склалася ў чарнобыльскіх раёнах, у тым ліку ў сацыяльнай сферы. Накіроўваюцца сродкі на адукацыю, ахову здароўя. Чамусьці праграма не прадугледжвае фінансавання аб’ектаў культуры. А сацыяльна-культурная рэабілітацыя насельніцтва гэтых раёнаў, на мой погляд, не менш важная.

Цягам шэрагу гадоў не прымаюцца да разгляду адпаведнымі службамі прапанаваныя ўпраўленнем культуры заяўкі. Адказ адзін: неабходна ўнесці карэктывы ў пастанову Саўміна.

Для вырашэння праблем, звязаных са стварэннем спрыяльных умоў пражывання насельніцтва ў пацярпелых ад катастрофы на ЧАЭС рэгіёнах, прашу Міністэрства культуры хадайнічаць перад Саветам Міністраў аб унясенні карэктывы ў адпаведную Пастанову.

**Аляксандр ЛОЙКА, начальнік упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта**

# Вопыт “Краіны замкаў”

## У кантэксце калегіі

— Гісторыка-культурная спадчына Гродзенскай вобласці мае сваю непаўторнасць, свае спецыфічныя рысы і з’яўляецца нашым гонарам і штодзённым клопатам. На тэрыторыі вобласці знаходзіцца 687 гісторыка-культурных каштоўнасцей, унесеных у Дзяржаўны спіс Рэспублікі Беларусь, у складзе якіх — 1314 аб’ектаў нерухомых матэрыяльных, 8 рухомых матэрыяльных і 2 нематэрыяльныя каштоўнасці.

Сярод іх — 5 аб’ектаў, што маюць сусветную вартасць і ўнесены UNESCO ў Спіс сусветнай культурнай спадчыны. Мірскі замак, усім вядомы Аўгустоўскі канал, на які сумесна з упраўленнем па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры падрыхтавана дасье, якое зараз знаходзіцца на разглядзе ў камісіі UNESCO. У верасні 2009 года з мэтай падрыхтоўкі заключэння аб адпаведнасці даных дасье “Аўгустоўскі канал — твор чалавека і прыроды” аб’ект наведаў эксперт ІКАМОС. Сярод астатніх: Свята-Барысаглебская (Каложская) царква XII ст. у г. Гродна, царква абарончага тыпу ў в. Сынкавічы Зэльвенскага раёна і Свята-Ражджаства Багародзіцкая царква-крэпасць абарончага тыпу ў в. Мураванка Шчучынскага раёна.

Да найбольш значных падзей у сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў 2009 годзе можна аднесці правядзенне ў Гродне беларуска-польскай кансультацыйнай камісіі па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны. На пасяджэнні яе, сярод іншага, разглядалася пытанне рэстаўрацыі галоўнага алтара Фарнага касцёла ў Гродне.

У верасні ў вобласці прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя Еўрапейскім дням спадчыны, у рамках якіх адбылася выстаўка “Захаваная спадчына” ў Свята-Барысаглебскай (Каложскай) царкве.

Найважнейшымі ў правядзенні ахоўных мерапрыемстваў з’яўляюцца: улік, вывучэнне, папулярызацыя аб’ектаў спадчыны і праца з уласнікамі гісторыка-культурных каштоўнасцей. Работу па гэтых накірунках ажыццяўляюць спецыялісты па ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Даволі працяглы час гэтыя абавязкі (як дадатковыя) у раёнах Гродзенскай вобласці былі ўскладзены на спецыялістаў бібліятэк і музеяў, што не дазваляла якасна выконваць працу па ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей. На сучасны момант толькі нарматыўна-правая база ў гэтай сферы налічвае звыш 30 заканадаўчых дакументаў, якія неабходна ведаць спецыялісту і данесці іх змест да ўласнікаў гісторыка-культурных каштоўнасцей.

На калегіях Міністэрства культуры неаднаразова ставілася задача ўвядзення спецыялістаў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Для яе вырашэння мы звярнуліся ў раённыя выканаўчыя камітэты з абгрунтаванай просьбай вырашыць праблему, і вынікам гэтай працы стала ўвядзенне рашэннямі раённых выканаўчых камітэтаў у 8 раёнах вобласці метадыстаў па ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей у раённыя метадычныя цэнтры народнай творчасці, у 2 раёнах — адпаведных спецыялістаў у штат музея, у 5 раёнах вобласці гэтыя абавязкі з’яўляюцца асноўнымі службовымі абавязкамі спецыялістаў аддзелаў культуры. Упраўленне культуры плануе завяршыць гэтую працу ў 2010 годзе. Засталося 3 раёны, дзе абавязкі спецыяліста па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ўскладзены як дадатковыя на супрацоўніка бібліятэкі, музея, аддзела культуры.

Для павышэння кваліфікацыі спецыялістаў у вобласці штогадова праводзяцца семінары-нарады спецыялістаў па ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей. У 2009 годзе на такі семінар былі запрошаны і начальнікі аддзелаў культуры, спецыяліст Міністэрства культуры, старшы памочнік пракурора Гродзенскай вобласці.

Уладзімір Караткевіч не выпадкова назваў Прынёманскі край Краінай замкаў: з 13 замкаў Беларусі 8 знаходзяцца на нашай тэрыторыі. Гэта Стары і Новы замкі ў Гродне, Лідзе, Мірскі замак, Гальшанскі, Навагрудскі, Любчанскі, Крэўскі, Геранёнскі. Яны дайшлі да нас у рознай ступені захаванасці. Падыходзіць да завяршэння рэстаўрацыя Мірскага замка, хутка распачнецца рэстаўрацыя Лідскага, распрацоўваецца праектная дакументацыя на рэстаўрацыю Старога замка ў Гродне, праводзяцца работы на Любчанскім замку, добраўпарадкаванне тэрыторыі Гальшанскага замка.

Мы вельмі ўдзячныя Міністэрству культуры за падтрымку ініцыятывы вызначыць Навагрудскі замак для правядзення грамадскай акцыі “Рэстаўрацыя аднаго з найбуйнейшых помнікаў архітэктуры Беларусі”.

З мэтай папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны выкарыстоўваюцца пляцоўкі каля найбольш цікавых помнікаў для правядзення комплексных маштабных культурных мерапрыемстваў, такіх, як, да прыкладу, вечарыны тэлеканала АНТ ля Мірскага замка. На Аўгустоўскім канале ўжо традыцыйным стала свята “Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў”. Каля сцен Навагрудскага і Лідскага замкаў праводзяцца рыцарскія турніры, фестывалі сярэднявечнай культуры, канцэрты самадзейных і прафесійных калектываў. У 2009 годзе каля Гальшанскага замка адбыўся юбілейны канцэрт гурта “Стары Ольса”, у Старым замку — свята джазавай музыкі.

У 2010 годзе гэтыя, ужо стаўшыя традыцыйнымі, мерапрыемствы, будуць працягвацца. У чэрвені адбудзецца фестываль сярэднявечнай культуры “Навагрудскі замак-2010”, у Гальшанах — фестываль мастацтваў “Стагоддзі тут плача Белая Панна”, у Лідзе — “Дажынкі”, у Гродне — VIII Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур і інш.

Падводзячы вынікі мінулага года, мы адначасова плануем працу на гэты год. Аднак існуюць праблемы, для вырашэння якіх неабходна дапамога Міністэрства культуры. Паводле вынікаў візіту экспертаў UNESCO ў Рэспубліку Беларусь у 2003 годзе быў складзены Папярэдні спіс кандыдатур для падрыхтоўкі матэрыялаў па ўключэнні ў Спіс UNESCO. Цяпер перад упраўленнямі культуры абласцей стаіць задача падрыхтоўкі дасье па вызначаным Міністэрствам культуры графіку. Аднак пад час гэтай работы мы сутыкаемся з цэлым шэрагам цяжкасцей. Для якаснага выкання гэтай працы лічым мэтазгодным стварыць спецыяльную структуру, магчыма, пры Інстытуце павышэння кваліфікацыі, (альбо, як прагучала ў выступленні Паўла Паўлавіча, у ствараемым Інстытуце Беларускай культуры). Спецыялісты гэтай структуры змогуць прафесійна арганізаваць працу па падрыхтоўцы дасье і іншую дзейнасць, звязаную з аб’ектамі сусветнай спадчыны. Пры неабходнасці ўпраўленні культуры будуць прадастаўляць ёй усю неабходную інфармацыю. З улікам таго, што ў Папярэднім спісе ёсць пазіцыі, якія аб’ядноўваюць помнікі некалькіх абласцей, такія, як, напрыклад, “Культавыя збудаванні абарончага тыпу”, размешчаныя на тэрыторыі Гродзенскай, Віцебскай, Брэсцкай абласцей і Рэспублікі Польшча, гэтая праца павінна каардынавацца на ўзроўні рэспубліканскіх структур.

Неабходна вывучыць і досвед нашых суседзяў. У Польшчы існуе Нацыянальны цэнтр даследаванняў і дакументацыі, супрацоўнікі якога прафесійна займаюцца падрыхтоўкай адпаведных дакументаў з улікам міжнародных патрабаванняў і вопыту.

Таксама наспела неабходнасць больш эфектыўна выкарыстоўваць магчымасці атрымання фінансавай дапамогі праз афармленне грантаў, сумесных праектаў з нашымі суседзямі, са сродкаў, што выдзяляюцца еўрапейскімі фондамі. Для падрыхтоўкі такіх праектаў у нашай вобласці вызначаны спецыялісты ў абласным музеі, бібліятэцы, метадычным цэнтры. Аднак было б вельмі добра, каб гэты накірунак каардынаваўся і высокаадукаваным спецыялістам на рэспубліканскім узроўні, які па службовых абавязках займаўся б выключна грантамі.

Яшчэ адно пытанне прапануем сёння для абмеркавання. У другой палове 80-х гадоў XX стагоддзя супрацоўнікі Дзяржаўнага мастацкага музея БССР праводзілі інвентарызацыю рухомых культурных каштоўнасцей, якія знаходзіліся ў карыстанні рэлігійных аб’яднанняў і захоўваліся ў культавых будынках. Былі складзены вопісы гэтых прадметаў і, магчыма, фотафіксацыя. Матэрыялы павінны знаходзіцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. Для захавання гэтых рухомых матэрыяльных каштоўнасцей прапануем арганізаваць працу па іх паўторнай інвентарызацыі з разглядам матэрыялаў па ўключэнні ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Дадзеная праца павінна быць арганізавана на рэспубліканскім узроўні, узгоднена з Міністэрствам культуры, кіраўніцтвам Беларускай Праваслаўнай Царквы і Рымска-каталіцкай Царквы ў Рэспубліцы Беларусь.

## У ФОТААБ’ЕКТЫВЕ...

# Культурны падмурак для паспяховай дзяржавы

## З даклада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Паўла Латушкі

*(Працяг. Пачатак на стар. 2, 4, 6, 8, 10)*

**У дапамогу канцэртным арганізацым, вядучым нацыянальным і рэспубліканскім калектывам Міністэрства культуры набыло больш за 170 арыгінальных твораў, аранжыровак і аркестровак на суму каля 150 млн. рублёў.**

Пазітыўныя зрухі назіраюцца ў музычным мастацтве рэспублікі. Захоўваецца высокі ўзровень выканальніцкай школы, аб чым сведчаць перамогі на розных міжнародных конкурсах і фестывалях, прэстыжныя ўзнагароды. Дзякуючы актыўнай дзейнасці Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі Міхаіла Фінберга праведзены шэраг традыцыйных фестываляў старадаўняй і сучаснай беларускай музыкі, якія прайшлі ў сямі гісторыка-культурных цэнтрах Беларусі. Станоўчы грамадскі рэзананс атрымалі X Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне, Беларуская музычная восень, Фестываль Юрыя Башмета.

Разам з тым, у сферы музычнага мастацтва, канцэртнай дзейнасці акрэсліліся праблемы. Па некаторых з іх мы рыхтуем змены на заканадаўчым узроўні. Плануецца прыняцце дакумента, які сабраў бы ў адно цэлае ўсе пытанні рэгулявання канцэртнай дзейнасці ў краіне, у тым ліку — вырашыў існуючыя арганізацыйна-творчыя праблемы. Да гэтага часу ў сферы гастрольна-канцэртнай дзейнасці існуе непаразуменне паміж абласнымі філармоніямі і раённымі аддзеламі і дамамі культуры, што апошнім часам усклалі на сябе функцыі канцэртных арганізацый. Патрабуе ўвядзення сістэма рэалізацыі так званых электронных білетаў, па якой ужо даўно працуюць усе нашы суседзі. Неабходна далейшае ўдасканаленне матэрыяльнай базы Брэсцкай і Гомельскай абласных філармоній, што ўвогуле не маюць сваіх канцэртных залаў.

Ключавымі фактарамі для забеспячэння істотнага развіцця беларускай **эстрады**, на наш погляд, з'яўляецца стварэнне свабоднага канкурэнтнага асяроддзя для ўсіх выканаўцаў пры адначасовым спрашчэнні нарматыўна-прававой базы гастрольна-канцэртнай дзейнасці ў краіне, фарміраванне сістэмы прыцягнення прыватнага капіталу ў сферу шоу-бізнесу, больш актыўная праца электронных сродкаў масавай інфармацыі, без ролі якіх немагчыма ўявіць развіццё эстрады, павелічэнне выкарыстання бюджэтных сродкаў на аплату ўдзелу беларускіх артыстаў у дзяржаўных мерапрыемствах. Запрашэнне замежных артыстаў, безумоўна, неабходнае, але з пераважным выкарыстаннем пазабюджэтных крыніц.

Міністэрства культуры плануе бліжэйшым часам ініцыяваць правядзенне конкурсу “Нацыянальная музычная прэмія краіны”, што будзе мець новыя формы і новыя падыходы з мэтай вызначэння сапраўдных лідэраў эстраднага рынку і стварэння магчымасцей для выхаду на эстраду цікавых выканаўцаў, якія не маюць іншых магчымасцей узысці на эстрадны Алімп.

**Міністэрства плануе перагледзець сістэму закупак карцін і іншых работ выяўленчага мастацтва. Мы працуем над падыходам, які прадугледжваў бы стварэнне музейных калекцый выяўленчага мастацтва краіны, а не выпадковае набыццё асобных твораў.**

Здзяйсненне сумесных праектаў Міністэрства культуры і Саюза мастакоў у правядзенні міжнародных, рэспубліканскіх тэматычных і абласных выставак з'яўляецца асноўным накірункам дзейнасці. Міністэрства ў 2009 годзе разлічылася з усімі мастакамі, творы якіх, пачынаючы з 2004 года, былі рэкамендаваны для набыцця. У мінулым годзе набыта твораў на суму каля 700 млн. рублёў — гэта рэкордная сума за апошнія 10 гадоў.

Нам патрэбна стварыць калекцыі твораў Селешчука, Шчамялёва і іншых выбітных беларускіх мастакоў.

З мэтай шырокага прадстаўлення сучаснага выяўленчага мастацтва Беларусі, прыцягнення да яго ўвагі шырокага кола грамадскасці Міністэрства плануе восенню бягучага года Рэспубліканскую выстаўку сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску і ва ўсіх абласных цэнтрах краіны.

Міністэрства культуры дапрацоўвае Канцэпцыю манументальна-гістарычнай прапаганды Рэспублікі Беларусь на бліжэйшую перспектыву. На 2011 год мы таксама плануем правядзенне сумесна з Беларускім саюзам мастакоў Рэспубліканскай выстаўкі манументальнага мастацтва з мэтай прааналізаваць сучасны стан гэтага накірунку мастацтва ў краіне.

*(Працяг на стар. 14)*

## Кулуары: з дыктафоннай стужкі

### Аляксандр ЛАЎРЫНЕНКА, дырэктар КУП “Гомелькінавідэапракат”:

— Бягучы год для нас пройдзе пад знакам інтрыгуючага “спаборніцтва” за тое, хто ж другім у краіне паставіць 3D-кінатэатр. Электроннае кіно — гэта наша бліжэйшая перспектыва. Зірніце на расійскую статыстыку і адпаведную дынаміку: па стане на 1 студзеня мінулага года там былі 92 лічбавыя залы, а на 1 студзеня 2010 — ужо амаль 350! І гэта не толькі ў сталіцы, але і ў гарадах, якія цалкам супастаўныя з нашымі абласнымі цэнтрамі. У той жа Пярмі 5 такіх кіназалаў. І нам без гэтага сёння ўжо таксама нельга.

Хацелася б, каб было прапрацавана і вырашана станоўчым чынам пытанне адносна закупак стужак расійскай вытворчасці: каб яны не былі для нас, як цяпер, — імпартнымі, з-за чаго на іх накладаецца 18-працэнтны падатак і іншыя выплаты з нашага боку.

### Мікалай МАСЬКО, генеральны дырэктар КУП “Брэстаблкінавідэапракат”:

— Наш клопат — вяртанне гледачоў у кіназалы. У Мінску і абласных цэнтрах гэта атрымалася, буйныя гарады ідуць следам, і цяпер наша асноўная ўвага скіравана на вёску. Бо ў раённых кінатэатрах драўляныя лаўкі для гледачоў — яшчэ не рэдкасць. А я лічу, што ў кожным райцэнтры павінны быць кінатэатры, абсталяваныя DOLBY-сістэмамі: за імі — будучае. Зразумела, што гэтая справа — затратная, і акупяцца яны не так хутка, як у буйных гарадах, але ж гэта не павінна спыняць, бо мы мусім думаць на перспектыву.

### Святлана РАМАНЮК, начальнік аддзела культуры Слонімскага райвыканкама:

— У сферы культуры — 27 гадоў; пачынала з пасады спецыяліста, цягам ужо 10 гадоў працую начальнікам. Некалі былі грошы, ды не было чаго купіць — тыя ж тэхнічныя сродкі, гукаўзмацняльную апаратуру, а сёння надышоў час, калі ёсць усё, а грошай не хапае. Сёлета ў нас на культуру выдзелена 3,9 мільёна рублёў — гэта зусім мала. І мы зноў павінны ламаць галаву, як працаваць нашаму Слонімскаму дзяржаўнаму драматычнаму тэатру, які не мае ўласнага будынка. 5 гадоў працуем над вырашэннем гэтай праблемы, падрыхтавана дакументацыя, але сродкаў няма. Тэатр на сённяшні дзень знаходзіцца ў памяшканні раённага Дома культуры, калектыў працуе на выездах, таму сёлета зноў хацелася б звярнуць увагу на гэтае наша набалелае пытанне.

У нас у Слоніме ладзіцца Рэспубліканскі фестываль сямейнай творчасці (ён адбудзецца ў наступным годзе), мы вельмі ганарымся гэтым форумам. Але сёлета ў нас пройдзе яшчэ адно адметнае мерапрыемства, на якое ўскладаем вялікія спадзяванні, — Музычны фестываль паланеза, які мы ладзім разам з Польскім таварыствам. На гэтым форуме выконваюцца толькі паланезы — такая яго канцэпцыя. І ў гэтым годзе хочам выйсці з ім на рэспубліканскі ўзровень, зрабіць яго яшчэ адной нашай “разыначкай”.

### Эдуард ГЕРАСІМОВІЧ, дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага:

— Асноўная мая дырэктарская задача на бягучы год — як мага паўней атрымаць запланаванае фінансаванне. А ўжо зыходзячы з яго, я вам гарантую шмат цікавых акцый і спектакляў. У нас у праекце — запрашэнне на пастаноўкі такіх рэжысёраў, як Кшыштаф Занусі, Кама Гінкас, маецца і цудоўны нацыянальны беларускі матэрыял. Думаю, наступны год папоўніць рэпертуар тэатра шэрагам яркіх і цікавых спектакляў.

### Фёдар ЯСТРАБ, загадчык выставачнага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, старшыня Міжнароднай гільдыі жывапісцаў:

— Лічу, мінулы год для беларускіх мастакоў быў у нечым вызначальны. Бо ён засведчыў: складаныя эканамічныя варункі ды іх псіхалагічныя наступствы не могуць быць перашкодай для творчасці. Мастацтва мае свае шляхі, яно залежыць не столькі ад эканомікі, колькі ад ментальнасці ды імпэту творцаў. І такая выснова павінна надаваць мастакам аптымізму і сёлета.

Таму планы — амбітныя. Спадзяюся, гэты год будзе яшчэ больш насычаны на сур'ёзныя праекты, чым папярэдні. А ён быў для мяне як галерыста вельмі плённы.

## У ФОТААБ'ЕКТЫВЕ...

**З выступлення**

## Сяргей АЗАРОНАК, дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, старшыня Савета дырэктараў рэспубліканскіх музеяў

# У 2010-м — “Парад Перамогі”

— Мінулы 2009 год для музейнай супольнасці краіны быў надта дынамічным і напружаным. Галоўнымі падзеямі ў жыцці рэспублікі былі 65-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і аб’яўлены ў краіне Год роднай зямлі. Яны леглі ў аснову ўсёй культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў праз выстаўкі, стварэнне новых стацыянарных экспазіцый, экскурсійную і лекцыйную работу, іншыя праекты. Зроблена каласальная праца.

Да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прайшлі тысячы мерапрыемстваў. Адным з ключавых у музейнай справе краіны стаў Рэспубліканскі агляд-конкурс на лепшы музей года па патрыятычным выхаванні моладзі. Літаральна ўсе музеі прынялі ў ім актыўны ўдзел. Пераможцамі сталі: у намінацыі “Музейныя экспазіцыі і выставачныя праекты” — Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, у намінацыі “Музей і новыя адукацыйныя праграмы па патрыятычным выхаванні моладзі” — Бярозаўскі раённы краязнаўчы музей, у намінацыі “Навукова-даследчая дзейнасць музеяў” — Гомельскі абласны музей ваеннай славы.

У Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь адбылося адкрыццё сумеснай беларуска-расійскай выстаўкі “Палітра памяці”, прысвечанай 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У экспазіцыю ўвайшлі творы жывапісу, графікі, скульптуры беларускіх мастакоў з фондаў музея, а таксама экспанаты з Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Святочныя мерапрыемствы прайшлі ў мемарыяле “Брэсцкая крэпасць-герой”, якую наведалі дэлегацыі з дзесяткаў краін свету.

З мэтай прапаганды гісторыі Брэсцкай крэпасці выстаўка “Летапіс Брэсцкай крэпасці ў фотаздымках” экспанавалася ў Мемарыяльным комплексе “Зеелаўскія вышыні” (ФРГ), у гарадах Велікабрытаніі. Прайшла выстаўка “Лета сорак чацвёртага. Вызваленне” — да 65-годдзя вызвалення Беларусі і г. Брэста.

Да ўрачыстасцей Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прэзентаваў цыкл выставак з уласных фондаў пад агульнай назвай “Беларусь. Трыумф пераможцаў” — “Трафеі вайны”, “Бітва за Беларусь”, “Беларусь партызанская”, а таксама выстаўкі: “KRIEG” — да 70-годдзя пачатку Другой сусветнай вайны, выстаўку твораў жывапісу “Успаміны пра вайну”, “Музей і час” — да 65-годдзя адкрыцця музея. У фае ўстановы працавала інтэрактыўная карта Беларусі, на якой цягам 309 дзён адлюстроўваліся падзеі на франтах, звязаныя з вызваленнем Беларусі ў верасні 1943 — ліпені 1944 г. Музеем быў выдадзены ілюстраваны “Партызанскі альманах” на аснове калекцыі рукапісных партызанскіх часопісаў.

Найбольш значным стаў праект з Першым нацыянальным тэлеканалам “Беларусь: гісторыя Перамогі”, які выходзіў штодзённа тройчы на дзень цягам 308 дзён. Цяпер сумесна з радыё “Сталіца” рэалізуецца праект “Невядомыя старонкі вайны”, разлічаны на перыяд з верасня 2009 г. па верасень 2010 г.

Акрамя згаданых праектаў, музей у 2009 годзе актыўна працаваў над стварэннем музейных пляцовак “Партызанскі лагер” і “Старая мяжа” на тэрыторыі Цэнтра экалагічнага турызму “Станькава” сумесна з ААТ “Агракамбінат “Дзяржынскі”.

Да юбілею вызвалення была праведзена Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці і музейных экспазіцыях” з удзелам вядучых музеяў Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі і Славакіі. Галоўным пытаннем было абмеркаванне канцэпцыі экспазіцыі ў новым будынку музея на праспекце Пераможцаў. Нам было важна абмяняцца досведам працы ў гэтым накірунку. Быў дасягнуты вялікі дадатны эфект.

Да 65-годдзя Вялікай Перамогі ў плане работы музея — адкрыццё ў Мінску ў верасні 2010 года выстаўкі “Парад Перамогі” сумесна з расійскімі Дзяржаўным Гістарычным музеем і Цэнтральным музеем Узброеных Сіл, украінскім Нацыянальным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, беларускімі музеямі.

Да 65-годдзя вызвалення Беларусі ў рэспубліканскіх музеях былі створаны выстаўкі “Пятрусь Броўка ў гады Вялікай Айчыннай вайны”, “Гісторыя “Перамогі”: аўтамабільная адысея Якуба Коласа”, “Кіно вайны і Перамогі”, выстаўка ў Літаратурным музеі Янкі Купалы “На змаганне, на Перамогу, наш родны беларускі народ!..” ды іншыя.

Адным з найважнейшых накірункаў дзейнасці музеяў краіны сталі мерапрыемствы, накіраваныя на процідзеянне фальсіфікацыі гісторыі і перагляд вынікаў Другой сусветнай вайны. У ліку найбольш значных варта адзначыць удзел дырэктараў Брэсцкай крэпасці і Беларускага дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны ў чэрвені 2009 года ў “круглым стале” “Унёсак Беларусі ў агульную Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне”, які праводзіла Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі (Масква) да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў; удзел у Францыі ў “круглым стале” з дырэктарамі Музея Армій Дома інвалідаў (Парыж) і Мемарыяла ў Каннах; правядзенне цыкла мерапрыемстваў у Мемарыяльным комплексе “Зеелаўскія вышыні” (ФРГ) на тэму “Аперацыя “Баграціён” і іншых.

Напярэдадні калегіі Міністэрства культуры адбылося пасяджэнне Савета дырэктараў рэспубліканскіх музеяў, на якім быў праведзены глыбокі і ўсебаковы аналіз зробленай працы, выяўлены праблемныя пытанні, што існуюць сёння ў музейнай справе краіны, і прапанаваны шляхі іх вырашэння. З задавальненнем адзначаем рашэнне міністра культуры ўключыць рэалізацыю гэтых пытанняў у Праграму развіцця культуры на 2011 — 2015 гг.

У сваім выступленні я агучыў далёка не ўсе мерапрыемствы, якія былі рэалізаваны ў 2009 годзе. Асабісты ўдзел кіраўніцтва Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці ў падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў забяспечылі іх высокі ўзровень і цікавасць грамадскасці. У надышоўшым годзе патрэбна зрабіць не менш. Упэўнены ў тым, што, дзякуючы назапашанаму досведу, працалюбству і самаадданасці калектываў музеяў, пастаўленыя ў Год 65-годдзя Вялікай Перамогі задачы і творчыя планы будуць выкананы на якасна новым узроўні, што асабліва актуальна ў аб’яўлены ў краіне Год якасці.

**Кулуары: з дыктафоннай стужкі**

## Уладзімір ПРАКАПЦОЎ, дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

— 2010 год будзе для музея вельмі насычаным на значныя падзеі. Патрэбна змяніць не толькі свае адносіны да працы, але і расставіць акцэнты ў новых метадах работы. Хочацца менш часу марнаваць на размовы, абмеркаванні, больш дзейнічаць. Ад усіх буду чакаць прафесіяналізму, практычнасці: пачынаючы ад навуковага супрацоўніка да кіраўніцтва — кожны павінен адпрацоўваць свае грошы.

Актуальнымі застаюцца пытанні фінансавання. Што найперш для нас неабходна — каб для музея не было асноўнай мэтай выкананне платных паслуг, бо з-за гэтага складана выконваць такія функцыі нашай установы, як навукова-даследчая і асветніцкая. Надзённае патрабаванне — выдаваць паліграфічную прадукцыю: каталогі, альбомы, паштоўкі. Трэба праводзіць канферэнцыі, ладзіць высокамастацкія выстаўкі. Слаба пакуль што выкарыстоўваюцца электронныя сродкі: неабходна выдаваць больш дыскаў, якія раскажуць пра музей і экспазіцыі жыхарам аддаленых куткоў. Праводзячы традыцыйныя экскурсіі, трэба арыентавацца і на замежных гасцей: стварыць аўдыёгід, рабіць экскурсіі на замежных мовах.

# Культурны падмурак для паспяховай дзяржавы

## З даклада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Паўла Латушкі

*(Працяг. Пачатак на стар. 2, 4, 6, 8, 10, 12)*

**Наспеў час здымаць кіно, якое дэманструе станоўчы ўнутраны і знешні вобраз Беларусі, а таксама прысвечана нашай гісторыі і культуры. На жаль, дагэтуль не створаны ні адзін мастацкі фільм са статусам “нацыянальны”.**

У мінулым годзе мы адзначылі 85-годдзе беларускага кіно. Мы ганарымся тым, што зроблена за мінулыя гады. Але час не стаіць на месцы. Сусветная кінавытворчасць ідзе наперад, а значыць, і мы, калі хочам быць канкурэнтаздольнымі, павінны рухацца далей, весці разумную жанравую і актыўную маркетынгавую палітыку, прыцягваць замежных партнёраў, выпускаць сумесныя фільмы.

У якасці канстатацыі факта. Да гэтага часу не створана кінапраекта, які атрымаў бы прызнанне на айчынным ці на замежным рынках. Эканамічны эфект ад вытворчасці мастацкіх стужак таксама несуцяшальны. Як прыклад — “Дняпроўскі рубеж”. З затрачаных на вытворчасць 6 млрд. рублёў дзяржаўных сродкаў выручаная сума ад кінапракату і нацыянальнага тэлепаказу склала 100 млн. рублёў.

Недастатковая ўвага надавалася і падбору сцэнарнага матэрыялу для стварэння фільмаў.

Станоўчым прыкладам у працы кінастудыі “Беларусьфільм” з’яўляецца рэалізацыя за апошнія два гады шэрагу праектаў сумеснай кінавытворчасці. І, як паказалі вынікі гэтай працы, яны прыносяць эканамічны эфект для кінастудыі.

Прыярытэтам павінна заставацца неабходнасць мадэрнізацыі і пераазнашчэнне кінапракату краіны. На жаль, кінапракату рэспублікі яшчэ вельмі далёка да сучасных стандартаў у дэманстрацыі фільмаў. Мы спадзяёмся, што аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам будзе прадоўжана сістэмная праца па пераазнашчэнні кінатэатраў.

Але некаторыя зрухі ўсё ж даюць надзею на лепшае. На сённяшні дзень 38 праектаў па нацыянальнай тэматыцы паступіла на адкрыты маладзёжны кінаконкурс. Супрацоўніцтва з маладымі таленавітымі драматургамі і рэжысёрамі дало магчымасць уключэння ў тэматычны план кінастудыі вытворчасці двух кі-

напраектаў — “Жыццё Купалы” і “Каласы пад сярпом тваім” паводле У.Караткевіча. Практыка экранізацыі твораў нацыянальных класікаў, насычэнне беларускага рынку айчыннымі фільмамі павінна стаць адной з прыярытэтных задач.

Кінастудыі і “Белвідэацэнтру” неабходна актывізаваць работу па пошуку надзейных дзелавых партнёраў па распаўсюджванні ўласнай фільмапрадукцыі за межамі Беларусі. Неабходна распрацаваць сістэму захадаў па зніжэнні фінансавых выдаткаў і прыцягненні ў фільмавытворчасць пазабюджэтных сродкаў, у тым ліку, праз далейшае запрашэнне да сумеснай вытворчасці стужак замежных прадзюсераў.

Міністэрства культуры плануе развіваць праектную дзейнасць у кінавытворчасці. У перспектыве мы плануем абвясціць аб рэалізацыі праекта па стварэнні мастацкага фільма акрэсленай тэматыкі, частковае фінансаванне якога будзе ажыццяўляцца з дзяржаўнага бюджэту, а дадатковае — з пазабюджэтных крыніц. Мы павінны стварыць умовы для развіцця айчынных прадзюсерскіх кампаній, якія былі б зацікаўлены ў канчатковым выніку ад сваёй дзейнасці.

Зразумела, прыярытэтнай задачай застаецца завяршэнне рэканструкцыі кінастудыі, яе тэхнічнага пераазнашчэння. Гэта найважнейшая ўмова для далейшага развіцця кінастудыі.

Дарэчы, усе гэтыя падыходы, аб якіх сказана вышэй, вельмі дакладна прапісаны ў Канцэпцыі развіцця кіно нашай краіны, зацверджанай у 2009 годзе Прэзідэнтам Беларусі. Трэба дакладна і сістэмна выконваць тое, што закладзена ў Канцэпцыі.

Мы часта гаворым аб неабходнасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных прафесійных кадраў для кіно. І гэтую задачу мы павінны вырашыць, у тым ліку, праз стварэнне факультэта экранных мастацтваў у Акадэміі мастацтваў. Але павінны звярнуць увагу і на тое, што ляжыць на паверхні: каля 60 грамадзян Беларусі з’яўляюцца студэнтамі Маскоўскага і Санкт-Пецярбургскага інстытутаў кіно. Трэба стварыць сістэму, пры якой яны былі б зацікаўлены вяртацца на працу ў Беларусь: праз стажыроўкі на кінастудыі і відэацэнтры, права здымаць курсавыя і дыпломныя працы, стварэнне прадзюсерскіх кампаній і права для лепшых зняць уласны фільм.

Наспеў час прынцыпова адзначыць неабходнасць забеспячэння адпаведнага фінансавання для выезду на стажыроўкі і вучобу студэнтаў па спецыяльнасці “кіно” ў еўрапейскія краіны.

*(Працяг на стар. 16)*

**З выступлення**

## Уладзімір ШЭЛЯГОВІЧ, начальнік аддзела культуры Іванаўскага райвыканкама

# Што працуе на імідж раёна?

— Культуралагічныя працэсы, якія апошнім часам адбываюцца ў нашым грамадстве, у большасці сваёй аднолькавыя для кожнага рэгіёна Беларусі. І тое зразумела, бо асноўнымі арыенцірамі ў гэтай справе з’яўляюцца галіновыя заданні дзяржаўных праграм, зацверджаных Прэзідэнтам краіны і Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Аднак, каб быць запатрабаванымі патэнцыйнымі спажыўцамі культурнага прадукту, безумоўна, кожнаму рэгіёну неабходна мець свой багаты культурна-іміджавы патэнцыял. А гэта прадугледжана абласнымі і раённымі праграмамі развіцця галіны.

Іванаўшчына — адзін з раёнаў Брэсцкай вобласці, дзе добра захоўваюць традыцыі краю, жыве багаты фальклор, ёсць свая гісторыка-культурная спадчына і пэўныя дасягненні культурнага развіцця рэгіёна.

Шырокую вядомасць не толькі ў раёне набылі унікальны музей народнай творчасці ў в. Моталь, асноўны фонд якога складае звыш 28 тысяч экспанатаў, адзіная ў рэспубліцы школа бондарства, Музей Ф.Дастаеўскага, раённы Музейны комплекс Н.Орды ў в. Варацэвічы, што ствараецца ў гонар знакамітага земляка, музыканта, мастака еўрапейскага маштабу, Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь “Ансамбль народнай музыкі і песні “Палешукі”, 22 калектывы мастацкай самадзейнасці з найменнем “народны”, якія з’яўляюцца пастаяннымі ўдзельнікамі абласных, рэспубліканскіх святаў і міжнародных фестываляў.

У рамках Праграмы адраджэння сяла адрамантаваны і набылі сучасны выгляд установы культуры аграгарадкоў, камп’ютэрызаваны бібліятэкі.

За апошнія тры гады капітальна адрамантавана, начынена тэхнічным абсталяваннем раённая цэнтральная бібліятэка ў г. Іванава — сучасны інфармацыйна-асветніцкі цэнтр, пабудаваны і адкрыты летні амфітэатр у г. Іванава, паслядоўна вядуцца работы па адраджэнні спадчыны Н.Орды і стварэнні на яго радзіме музейнага комплексу.

Брэндавымі для раёна сталі рэгіянальныя фестывалі “Фальклор без межаў”, “Мотальскія прысмакі”, які збірае шмат гасцей не толькі з Рэспублікі Беларусь, але і з-за мяжы, новы подых культурнаму жыццю края даў творчы праект “Музычная гасцёўня Н.Орды” з удзелам Нацыянальнага аркестра пад кіраўніцтвам прафесара М.Фінберга, абласныя, рэспубліканскія канферэнцыі, міжнародныя пленэры разьбяроў, мастакоў таксама атрымалі прапіску ў нашым краі.

Спалучэнне традыцый краю з наватарствамі калектыву работнікаў-творцаў дапамагае на высокім арганізацыйным і прафесійным узроўнях ладзіць знакавыя культурныя падзеі рэгіёна, паспяхова рэалізоўваць галіновыя праграмы і праекты.

Выніковасць крэатыўных спраў аддзела культуры дасягаецца дзякуючы правільнаму разуменню кожным работнікам культуры пастаўленых задач, штодзённаму іх мінімуму творчай і арганізацыйна-гаспадарчай дзейнасці, а таксама вялікай падтрымцы ідэй Брэсцкім абласным выканаўчым камітэтам.

Без усялякага перабольшвання адзначу, што, акрамя творчых спраў, у галіне культуры Іванаўскага раёна забяспечана стабільнасць выканання асноўных эканамічных паказчыкаў.

Для 46 тысяч насельніцтва раёна аказваюцца 69 відаў платных паслуг. Выконваецца план платных паслуг. За мінулы год ён склаў 432 млн. рублёў, тэмп росту аб’ёмаў паслуг — 117 працэнтаў.

Даведзенае заданне па росце заработнай платы па галіне культуры выканана на 101,4 працэнта. Сярэднямесячны заробак работнікаў культуры раёна склаў 611 тысяч рублёў.

На камплектаванне бібліятэчных фондаў з мясцовага бюджэту выдаткавана 130,2 млн. рублёў, што складае 15,4 працэнта сродкаў ад фінансавання бібліятэк.

Капітальным і бягучым рамонтам з розных крыніц фінансавання адрамантавана 19 устаноў культуры, 48 помнікаў гісторыі і культуры, на што выкарыстана 1 млрд. 280 млн. рублёў.

За пазабюджэтныя сродкі часткова праведзены касметычныя рамонты ва ўстановах культуры, набыта тэхнічнае абсталяванне, абноўлены сцэнічныя касцюмы, матэрыяльна прастымуляваны работнікі ўстаноў культуры на агульную суму 5,1 млн. рублёў.

Планавы паказчык па энергазберажэнні склаў 12 працэнтаў.

Называючы станоўчыя аспекты, здаецца, нават вартыя пераймання, адзначу, што не менш яшчэ і планаў. Каб і надалей высока і годна трымаць “планку” культурнага іміджа раёна, неабходна:

— прадоўжыць работу па адраджэнні гісторыка-культурнай спадчыны мясцін, прапагандзе імён выбітных землякоў.

Вядзецца вырашэнне пытання адраджэння сядзібы роду Дастаеўскіх, што паходзіць з в. Дастоева Іванаўскага раёна. Праз бюджэт Саюзнай дзяржавы плануецца весці работы па рэалізацыі гэтага праекта. Дарэчы, ужо ёсць першыя крокі ў гэтай вялікай справе.

Існуе добры намер у перспектыве адрэстаўраваць сядзібна-паркавы комплекс Скірмунтаў у в. Моладава, Дом-сядзібу першага Прэзідэнта Ізраіля Хайма Вэйцмана ў в. Моталь, рэарганізаваць сельскі Дом культуры в. Стрэльна пад Дом-музей народнай медыцыны і кухні (ужо звыш дзесяці гадоў на базе гэтай установы дзейнічае грамадскі пакой-музей “Бабуліны вышкі”, і, вывучаючы цікавасць турыстаў да гэтага аб’екта, разумеем, што ёсць патрэба яго развіваць), неабходна таксама пашырыць плошчы Музея народнай творчасці ў в. Моталь.

Для забеспячэння не толькі іміджавага, але і камерцыйнага патэнцыялу школы бондарства ёсць вялікая неабходнасць на базе гэтай навучальнай установы адкрыць вытворчы цэх па вырабе драўлянага посуду.

У ліку першачарговых задач — працяг грандыёзнай работы па стварэнні раённага Музейнага комплексу Н.Орды і аднаўленні родавай сядзібы музыканта. На сённяшні дзень дзейнічае карцінная галерэя Н.Орды, пабудавана цэнтральная кацельня, выконваюцца рамонтныя работы на аб’екце “Музей Н.Орды”, створана праектна-каштарысная дакументацыя і распачаты работы па адраджэнні Дома-сядзібы Н.Орды. Вядома, што рэалізаваць увесь праект, агульная каштоўнасць якога — звыш 7 млрд. рублёў, за сродкі раённага і абласнога бюджэтаў проста немагчыма. Таму ёсць вялікая просьба ад усіх жыхароў Іванаўшчыны да Міністэрства культуры дапамагчы нам у гэтай справе. Калі аб’ект уключыць у Спіс першачарговых аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі і крыху падтрымліваць рэспубліканскім фінансаваннем, дык у хуткім часе наведвальнікі — не толькі мясцовыя, але і замежныя — адкрылі б для сябе яшчэ адзін аб’ект міжнароднага значэння. А гэта, у сваю чаргу, дывідэнды не толькі нашага рэгіёна.

І яшчэ. У культурным кантэксце раёна маецца сапраўды вялікі культурна-турыстычны патэнцыял, каб развіваць экскурсійна-турыстычную дзейнасць, што спрыяла б яшчэ большаму ажыўленню работы па аказанні платных паслуг, аднак пакуль што існуе нявырашаная праблема з набыццём транспарту.

З улікам фінансавай дапамогі кіраўніцтва абласнога выканаўчага камітэта, райвыканкама, работнікі ўстаноў культуры зробяць усё магчымае, каб падтрымаць развіццё культуры рэгіёна на неабходным узроўні, адпавядаючы патрабаванням часу.

**Кулуары: з дыктафоннай стужкі**

### Юрый КІТУРКА, дырэктар Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея:

— Надышоўшы год для нас — юбілейны: музею спаўняецца 90 гадоў. Зразумела, што да гэтай даты будзе прымеркаваны шэраг падзей. У прыватнасці, плануем правесці сваю канферэнцыю.

Не абміне нас увагай і яшчэ адзін юбілей — 600-годдзе Грунвальдскай бітвы. Ужо сёння сардэчна запрашаю ўсіх аматараў даўніны на нашу выстаўку, прысвечаную іканаграфіі гэтай знамянальнай падзеі — яе адлюстраванню ў выявах розных часоў.

Але самая важная падзея, якая чакае нас у найбліжэйшай будучыні, — рэканструкцыя Старога замка, і музей да яе актыўна рыхтуецца. Хочацца верыць, што гэты грандыёзны, але і вельмі складаны праект распачнецца ўжо неўзабаве.

### Аляксандр КАРАЧАН, старшыня аддзела культуры Навагрудскага райвыканкама:

— Літаральна днямі на пасяджэнні Навукова-метадычнай рады па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь быў зацверджаны праект рэканструкцыі Навагрудскага дома культуры. І таму я вельмі спадзяюся, што сёлета лёс гэтага праблемнага аб’екта пачне змяняцца да лепшага.

Цэнтральнай падзеяй культурнага жыцця Навагрудка сёлета стане святкаванне ўгодкаў Грунвальдскай бітвы. Яно адбудзецца толькі напрыканцы чэрвеня, але над арганізацыяй рыцарскага фэсту мы працуем ужо сёння ў напружаным тэмпе. Адразу па сканчэнні калегіі буду мець сустрэчу з нашымі партнёрамі, датычную праграмы фестывалю.

**Калектыў Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі выказвае шчырае спачуванне рэжысёру-пастаноўшчыку Венедыкту Расстрыжэнкаву ў сувязі з горам, якое яго напаткала, — смерцю маці.**

Раман МАТУЛЬСКІ, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

# Электронны варыянт для бібліятэк

З выступлення

— Сёння ў Рэспубліцы Беларусь сфарміравана і дзейнічае бібліятэчная сетка, якая ўключае каля 9300 публічных і спецыяльных бібліятэк. Асноўную колькасць сярод іх складаюць публічныя і школьныя бібліятэкі — 3887 і 3851 адпаведна. Погляд на бібліятэкі Беларусі як на адзіную сістэму зараз вельмі важны, таму што, у адрозненне ад папярэдніх перыядаў, праца на базе сучасных інфармацыйных камп'ютэрных тэхналогій без узаемадзеяння практычна немагчымая.

У мінулым годзе бібліятэчная справа краіны развівалася стабільна, і ў нас ёсць шэраг дасягненняў, якімі можна ганарыцца. Галоўнымі з іх з'яўляюцца захаванне бібліятэчнай сеткі і фондаў бібліятэк, недапушчэнне іх абвальнага скарачэння, што дазваляе грамадзянам нашай краіны рэалізаваць сваё канстытуцыйнае права. Узмоцнена матэрыяльная база бібліятэк: апошнім часам, хаця і не часта, але ўсё ж адкрываюцца новыя бібліятэкі. Значнымі таксама з'яўляюцца зрухі ў галіне аўтаматызацыі ўстаноў: амаль трэцяя частка з іх — гэта значыць каля 1300 публічных бібліятэк — абсталявана камп'ютэрнай тэхнікай.

Але такія пасяджэнні, як калегіі міністэрстваў, праводзяцца не столькі дзеля таго, каб падвесці вынікі, колькі дзеля таго, каб высветліць праблемы і шляхі іх вырашэння.

Новы 2010 г. аб'яўлены ў нашай краіне Годам якасці. Амаль усе галіны вытворчасці пераходзяць на выпуск прадукцыі і паслуг згодна з міжнароднымі і нават еўрапейскімі стандартамі.

Як выглядае бібліятэчная справа краіны з гэтага пункта гледжання? З пазіцый нарматываў UNESCO, гэта значыць міжнародных нарматываў, якія з'яўляюцца больш нізкімі, чым еўрапейскія, таму што разлічаны як на ЗША, так і Гвінею-Бісаў.

Калі па адным з асноўных паказчыкаў — колькасці жыхароў на адну публічную бібліятэку — мы амаль адпавядаем нормам UNESCO (на 2,4 тыс. жыхароў прыпадае адна публічная бібліятэка), то па іншых паказчыках нашы справы выглядаюць далёка не так паспяхова.

Мы заўсёды ганарыліся і ганарымся вялікім аб'ёмам фондаў нашых бібліятэк. Гэты паказчык з'явіўся на досвітку савецкай улады і адлюстроўваў спачатку паспяховую барацьбу з непісьменнасцю, а потым стаўся доказам таго, што савецкі народ — самы чытаючы народ у свеце.

Аб'ём фонду — гэта колькасны паказчык. Якасць фондаў бібліятэк адлюстроўвае другі паказчык — абарачальнасць фондаў. Па ім мы амаль у 5 разоў (на 76%) адстаём ад міжнародных норм. І гэтаму ёсць тлумачэнне.

Нягледзячы на Указ Прэзідэнта, які выратаваў фонды бібліятэк, даў глыток свежага паветра, неабходна канстатаваць, што фонды, асабліва кніжныя, амаль поўнасцю састарэлі. Большасць публічных бібліятэк на 15-працэнтны бюджэтны ліміт могуць набыць толькі 2 — 3 газеты, для кніг сродкаў не хапае. Згодна з рэкамендацыямі UNESCO, фонд публічнай бібліятэкі павінен абнаўляцца кожныя 10 гадоў і ў ім павінна прысутнічаць 10% кніг, выдадзеных за апошнія два гады, а таксама 30 — 40% кніг, выдадзеных за апошнія пяць гадоў. Адпаведна, абнаўленне фонду павінна складаць 10% на год. У нашых жа публічных бібліятэках яно складае каля 2%.

Згодна з тымі ж стандартамі, публічныя бібліятэкі на 1 тыс. жыхароў павінны набываць 250 экземпляраў кніг і 55 найменняў перыядычных выданняў штогод. У бібліятэках рэспублікі колькасць новых паступленняў на 1 тыс. жыхароў у сярэднім складае 70 экземпляраў кніг і каля 20 найменняў перыядычных выданняў. Пры сённяшніх тэмпах — аб'ёме новых паступленняў — 1,5 млн. на год і аб'ёме фондаў публічных бібліятэк каля 60 млн. экземпляраў — мы абновім нашы фонды толькі праз 40 гадоў. Наўрад ці гэта адпавядае сучасным патрабаванням сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства.

Каб забяспечыць абнаўляльнасць фондаў і іх запатрабаванасць чытачамі, неабходна павялічыць колькасць новых паступленняў і, адпаведна, фінансаванне камплектавання фондаў, як мінімум, у 4 — 5 разоў, пры гэтым не баючыся пазбаўляцца ад макулатуры, захоўванне якой, дарэчы, патрабуе штогод значных сродкаў.

Гэта асноўныя праблемы, звязаныя з традыцыйнай часткай бібліятэчных фондаў. Але калі мы хочам захаваць бібліятэку як рэальны інстытут культурна-інфармацыйнай прасторы нашага грамадства, то павінны звярнуць увагу і на другую — электронную — частку бібліятэк. Асноўная маса карыстальнікаў бібліятэк — да 80% — гэта школьнікі і студэнцкая моладзь, тая частка грамадства, якая цяпер больш ахвотна працуе з электроннай, чым з традыцыйнай кнігай. Электронныя ж носьбіты патрабуюць не толькі будынка бібліятэкі і нескладанай мэблі, але і сучаснага абсталявання, ліній сувязі.

За апошнія гады мы абсталявалі камп'ютэрамі амаль трэць публічных бібліятэк, але, каб адпавядаць міжнародным стандартам, згодна з якімі на 1 тыс. наведвальнікаў бібліятэкі павінна быць не менш чым адно аўтаматызаванае працоўнае месца, колькасць камп'ютэраў у публічных бібліятэках рэспублікі трэба павялічыць да 9672 — гэта значыць, як мінімум, у тры разы. Пры гэтым трэба ўлічваць, што перыяд старэння камп'ютэрнай тэхнікі складае 3 — 5 гадоў. Таму неабходна прадугледжваць не толькі набыццё новага абсталявання, але і мадэрнізацыю існуючага камп'ютэрнага парку. Не менш складанымі з'яўляюцца пытанні праграмнага забеспячэння і ліній сувязі.

Але камп'ютэрная тэхніка — гэта толькі сродак для таго, каб палепшыць бібліятэчнае абслугоўванне насельніцтва. Якія ж вынікі выкарыстання ўжо ўстаноўленага ў бібліятэках абсталявання? Шмат станоўчых. Асноўным сярод іх з'яўляецца стварэнне электронных каталогаў і сайтаў бібліятэк. Але гэта толькі першы крок, паколькі чытач хоча атрымаць у бібліятэцы не столькі даведачную, колькі паўнатэкставую інфармацыю.

Для вырашэння дадзенай праблемы Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў пазамінулым годзе адпрацавала ў тэставым рэжыме, а ў мінулым укараніла тэхналогію абслугоўвання карыстальнікаў у аддаленым рэжыме праз сістэму віртуальных чытальных залаў. Такія залы былі адкрыты ў 36 бібліятэках па ўсёй краіне, у тым ліку, на жаль, толькі ў шасці абласных бібліятэках з амаль 4 тысяч публічных. І тое толькі таму, што мы знайшлі магчымасць адкрыць іх на бясплатнай аснове (для бібліятэк іншых ведамстваў доступ — платны). Эфектыўнасць іх выкарыстання пакуль што даволі нізкая. Але калі ў гэтым выпадку ў якасці асноўнай прычыны маруднасці можна назваць фінансавыя цяжкасці, то ў іншым выпадку, як кажуць, грошы ні пры чым.

Электронная інфармацыйная прастора — гэта, у асноўным, замежныя мовы. Каб выправіць такую сітуацыю, НББ, у сілу сваіх магчымасцей, пачала ствараць нацыянальныя паўнатэкставыя інфармацыйныя рэсурсы. Напрыклад, "Літаратурная спадчына Беларусі XI — сярэдзіны XX стст.", "Электронная бібліятэка — школьнікам: хрэстаматыя" (змяшчае поўныя тэксты твораў школьнай праграмы па беларускай і рускай літаратуры для 9 — 12 класаў), "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай…" (прысвечана 170-годдзю з дня нараджэння Францішка Багушэвіча), *"Запаветны напеў, запаветная даль…* Белавежская Пушча" (мультымедыйнае выданне, прысвечанае 600-годдзю ўсталявання запаведнага рэжыму ў Белавежскай пушчы), "Жыве паміж намі Дудар наш…" (DVD-ROM, прысвечаны 200-годдзю з дня нараджэння паэта, драматурга, класіка беларускай літаратуры Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, юбілей якога ў 2008 г. адзначаўся пад эгідай UNESCO), "Падпольны і партызанскі друк Беларусі" (выданне прысвечана 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў). Гэта фактычна электронныя бібліятэкі, што ўтрымліваюць тысячы поўных тэкстаў твораў, біяграфічныя і крытычныя крыніцы, гука- і відэазапісы, матэрыялы, якія часам ёсць у нас толькі ў адным экземпляры, а некаторыя копіі спецыяльна набываліся за мяжой. З імі, а таксама другімі выданнямі НББ вы мелі магчымасць пазнаёміцца ў холе нашай канферэнц-залы. Яны накіраваны на папулярызацыю беларускай культурнай спадчыны, фарміраванне патрыятычных пачуццяў і ўсведамленне нацыянальных каштоўнасцей у нашых чытачоў, але могуць выконваць і прагматычную функцыю: дапамагчы школьніку з далёкай вёскі ці мястэчка выдатна падрыхтавацца да ўступных экзаменаў у ВНУ.

Як гэтая магчымасць выкарыстоўваецца публічнымі бібліятэкамі краіны? Амаль ніяк. Дыск "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай…" набылі 54 бібліятэкі, — гэта значыць, што адзін дыск прыходзіцца на 72 бібліятэкі, ці адзін дыск на 2 раёны.

Пры такіх падыходах аўтаматызацыя публічных бібліятэк, на маю думку, увогуле пазбаўлена сэнсу.

Для станоўчых зрухаў у гэтым напрамку неабходна змяніць падыходы да перападрыхтоўкі кадраў, іх самаадукацыі, метадычнай дзейнасці, статыстыкі і крытэрыяў ацэнкі эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк, а галоўнае — змяніць псіхалогію і матывацыю дзейнасці галоўнага чалавека ў бібліятэцы — бібліятэкара.

Але не ўсё так сумна. Сёння можна канстатаваць, што бібліятэкі з'яўляюцца адным з базавых элементаў інфарматызацыі грамадства. Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі былі абагульнены дасягнутыя вынікі і праблемы бібліятэчнай справы краіны і перададзены ў выглядзе прапаноў для ўключэння ў раздзел "Бібліятэчная справа" Канцэпцыі Дзяржаўнай праграмы "Культура" на 2011 — 2015 гг. На нашу думку, асноўныя намаганні неабходна накіраваць на стварэнне:

— зводнага электроннага рэсурсу нацыянальнай бібліяграфіі, які прадставіць беларусам, а таксама сусветнай грамадскасці дасягненні кніжнай культуры нашага народа — ад першага рукапісу да сучасных выданняў;

— зводнага электроннага каталога бібліятэк краіны, што дазволіць нашым чытачам атрымаць не толькі інфармацыю аб наяўнасці выданняў у бібліятэках краіны, але і аб месцы іх знаходжання;

— сістэмы размеркаванага доступу карыстальнікаў да нацыянальных і замежных электронных інфармацыйных рэсурсаў, якая дазволіць ператварыць бібліятэкі ў пункты доступу жыхароў нашых населеных пунктаў, у тым ліку аддаленых, да нацыянальнай і сусветнай інфармацыйнай прасторы.

НББ таксама распрацавала Канцэпцыю падпраграмы "Стварэнне Нацыянальнай электроннай бібліятэкі Беларусі", якая ўключана ў праект Канцэпцыі Дзяржаўнай праграмы развіцця інфармацыйнага грамадства на 2011—2015 гг. Яе мэта — стварэнне на карпаратыўных пачатках паўнацэннай паўнатэкставай электроннай бібліятэкі Беларусі.

Усе праекты прадугледжваюць цесную сумесную працу ўсіх бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў краіны незалежна ад ведамаснай прыналежнасці.

## Кулуары: з дыктафоннай стужкі

### Уладзімір МЕЛЬНІКАЎ, начальнік аддзела культуры Веткаўскага райвыканкама:

— Самай знамянальнай леташняй падзеяй сталася давядзенне да ладу сельскіх дамоў культуры ў аграгарадках "Данілавічы" і "Радуга". Паверце, ажыццявіць гэтыя капітальныя рамонты з грунтоўнай рэканструкцыяй было вельмі няпроста. У выніку ў раёне ўжо налічваецца дзесяць аграгарадкоў. Праблемным з'яўляецца СДК у вёсцы Вялікія Нямкі: ён — у аварыйным стане. І для таго, каб вёска гэтая стала ў бягучым годзе аграгарадком, патрэбна дапамога абласнога ўпраўлення культуры.

## У ФОТААБ'ЕКТЫВЕ...

# Культурны падмурак для паспяховай дзяржавы

## З даклада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Паўла Латушкі

*(Працяг. Пачатак на стар. 2, 4, 6, 8, 10, 12, 14)*

**Відавочны якасныя змены ў інфраструктуры ўстаноў культуры... Тым не менш, востра стаіць пытанне актывізацыі работы па папулярызацыі фальклору, традыцыйнай культуры і народнай творчасці.**

Мінулы год быў насычаны працай па захаванні ў рэгіёнах **традыцыйнай мастацкай культуры**, па выяўленні і пераймаўні фальклорнай спадчыны. Неабходна больш выкарыстоўваць існуючы патэнцыял і забяспечыць выпуск на аснове рэгіянальных даследаванняў спецыялізаваных выданняў, альбомаў, рэкламных буклетаў лепшых фальклорных і аматарскіх калектываў мастацкай творчасці.

Адраджэнне, развіццё і папулярызацыя народных мастацкіх промыслаў і рамёстваў — адметнасць Беларусі ў культурнай сусветнай прасторы. І тут мы адчуваем сябе ўпэўнена: звыш 24-х тысяч выставак народнага мастацтва было праведзена ў мінулым годзе.

Неабходна ствараць умовы для арганізацыі выставачных салонаў з магчымасцю рэалізацыі твораў народных майстроў, як, напрыклад, гэта робіцца ў Магілёўскай вобласці. Звыш 500 чалавек аб'ядноўвае Беларускі саюз майстроў народнай творчасці. Напрыклад, ад Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай абласцей у Саюз уваходзяць амаль па 100 чалавек, а вось ад Гомельскай — чамусьці ўсяго 15. Патрабуе ўвагі і такая важная справа, як прысваенне лепшым майстрам ганаровага статуса “народны”. Сёння ўсяго толькі 40 творцаў маюць гэты статус, але такога пачэснага звання заслугоўваюць значна больш таленавітых людзей.

Надалей Міністэрства культуры штогод будзе праводзіць Рэспубліканскі конкурс фестывальных праектаў, пераможцы якога будуць мець дадатковую фінансавую падтрымку.

Спадзяюся на актывізацыю дзейнасці Цэнтра па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны, які дзейнічае пры Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў і функцыянаванне якога вынікае з адпаведнай Канвенцыі UNESCO.

**Доўгатэрміновым праграмным дакументам у кіраванні працэсамі сацыякультурнай сферы з'яўляецца Дзяржаўная праграма адраджэння і развіцця сяла на 2005 — 2010 гады. У інфраструктуры сельскіх установ культуры адбываюцца якасныя змены.**

Значная работа праведзена па захаванні і далейшым развіцці культурнага патэнцыялу, удасканаленні сеткі сельскіх устаноў культуры, актывізацыі культурна-дасугавай дзейнасці, развіцці традыцыйнай культуры рэгіёнаў, забеспячэнні даступнасці ўстаноў культуры для розных груп сельскага насельніцтва.

Па-ранейшаму адной з актуальных праблем застаецца паступовае ўмацаванне і **развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы** ўстаноў культуры.

Працягваецца тэндэнцыя зніжэння колькасці традыцыйных сельскіх клубаў і дамоў культуры і павелічэння ўдзельнай вагі ўстаноў новага тыпу — цэнтраў культуры і вольнага часу, культурна-спартыўных комплексаў, маладзёжных цэнтраў.

*(Працяг на стар. 18)*

## З выступлення

**Раіса ВАЙЦЯХОЎСКАЯ, дырэктар дзяржаўнай установы “Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці”**

# Стратэгіі аўтэнтыкі

— Традыцыйная народная культура з'яўляецца арганічнай часткай сучаснага культурнага жыцця. Апошнія два дзесяцігоддзі былі гадамі станаўлення традыцыйнай культуры як самастойнай галіны і асобнага напрамку дзейнасці ўстаноў культуры і метадычных службаў рэспублікі. У гэтыя гады сфарміравалася сетка профільных устаноў новага тыпу (дамы (цэнтры) рамёстваў, фальклору, народнай творчасці), структурных падраздзяленняў устаноў культуры ўсіх тыпаў фальклорнай скіраванасці (гурткі, клубы майстроў, майстэрні рамёстваў, фальклорныя калектывы і да т. п.). Стратэгічнымі кірункамі дзейнасці ў галіне традыцыйнай культуры сталі вывучэнне, ахова, захаванне, пераемнасць, папулярызацыя (трансляцыя).

Мінскі абласны цэнтр з 2003 года праводзіць самастойныя і сумесныя з навуковымі і вучэбнымі ўстановамі краіны фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі па вывучэнні лакальных культур Цэнтральнага рэгіёна Беларусі, якія, знаходзячыся на скрыжаванні ўзаемаўплываў усіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, адрозніваюцца надзвычайнай разнастайнасцю. Даследаванні вырашаюць надзённыя ***практычныя задачы*** сацыякультурнай работы ўстаноў культуры вобласці: выяўленне яркіх аўтэнтычных гуртоў, асобных самабытных выканаўцаў; аўдыё-, відэа- і фотафіксацыю іх творчасці; актывізацыю работы ўстаноў культуры рэспублікі па ажыццяўленні Канвенцыі UNESCO аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, распрацоўкі рэкамендацый па стварэнні профільнай інфраструктуры. У 2005 — 2009 гг. супрацоўнікамі аддзела традыцыйнага мастацтва МАЦНТ быў праведзены шэраг даследчых экспедыцый у 11 раёнаў вобласці. Сумесна з тагачасным Беларускім дзяржаўным інстытутам праблем культуры і адпаведнымі інстытутамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў 2006 — 2009 гг. праводзілася даследаванне па тэме “Сучасны стан традыцыйнай мастацкай культуры Міншчыны”, вынікам якога будзе запланаванае на 2010 — 2011 гг. выданне “Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Цэнтральная Беларусь” (5-ы том шасцітомнай серыі ў 2-х кнігах).

МАЦНТ мэтанакіравана праводзіць аналітычную работу па абагульненні тэндэнцый развіцця традыцыйнай культуры вобласці па розных відах, жанрах, напрамках, падрыхтаваны шэраг аналітычных матэрыялаў, у тым ліку “Аналіз стану традыцыйнай культуры Мінскай вобласці”.

Істотным вынікам дзейнасці ўстаноў культуры вобласці з'яўляецца шырокае ўкараненне ў побыт насельніцтва сістэмы традыцыйных святаў, абрадаў і рытуалаў на базе фальклорнай спадчыны. Некаторыя унікальныя старажытныя абрады з'яўляюцца візітоўкай пэўных арэалаў Міншчыны і падлягаюць ахове і захаванню.

У Мінскай вобласці існуе 5 аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці: гэта абрад “Калядныя цары” вёскі Семежава Капыльскага раёна (у 2009 г. гэты аб'ект быў унесены ў Спіс сусветнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны UNESCO рашэннем 4-й сесіі Міжурадавага камітэта UNESCO па захаванні культурнай спадчыны, што прайшла з 28 верасня па 2 кастрычніка 2009 г.); абрад “Шчодрык” вёскі Рог Салігорскага раёна; спеўная манера выканання фальклорных калектываў вёскі Закальное, Обчын, Ямінск Любанскага раёна.

На сённяшні дзень сумесна з беларускімі навукоўцамі на падставе даследчай экспедыцыйнай работы распрацаваны перспектыўны план да 2013 г. падрыхтоўкі дакументаў для надання статуса 10 аб'ектам Мінскай вобласці.

Катэгорыя пераемнасці з'яўляецца асноўнай у дачыненні да традыцыйнай культуры. У мэтах забеспячэння пераемнасці духоўных і мастацкіх традыцый упраўленнем культуры і ўпраўленнем адукацыі Мінскага аблвыканкама была распрацавана абласная праграма “Традыцыйная культура і дзеці” на 2006 — 2010 гады. За час дзеяння праграмы ўстановамі культуры Міншчыны быў назапашаны значны вопыт у далучэнні дзяцей і падлеткаў да засваення традыцыйнай мастацкай творчасці беларусаў. Супрацоўнікамі клубных устаноў былі выкарыстаны такія формы працы, як правядзенне фальклорных абрадавых святаў, тэатралізаваных прадстаўленняў, выставак народных промыслаў і рамёстваў, сустрэч з майстрамі, конкурсаў, вечарын, гульнева-забаўляльных праграм, народных гулянняў, кірмашоў. У працэсе рэалізацыі праграмы вялася работа па стварэнні дзіцячых фальклорных калектываў. Сёння ў вобласці дзейнічаюць 210 фальклорных калектываў (практычна ў кожнай трэцяй клубнай установе), 90 з якіх — дзіцячыя. Каля 1500 дзяцей засвойваюць народныя танцы, гульні, звычаі, знаёмяцца са святамі і абрадамі родных мясцін. Асаблівую значнасць атрымлівае стварэнне дзіцячых калектываў — спадарожнікаў фальклорных гуртоў. Жанравая палітра гуртковай работы налічвае болей за 30 відаў прыкладнога мастацтва: саломкапляценне, аплікацыя саломкай, вышыўка, ткацтва, разьба па дрэве і інш.

У мэтах паспяховага выканання задач захавання і пераемнасці традыцыйнай культуры арганізавана сістэмная метадычная работа са спецыялістамі клубных устаноў. Ужо больш за 10 гадоў пры МАЦНТ дзейнічае абласная “Школа майстэрства”, у праграме якой — правядзенне семінараў-практыкумаў, майстар-класаў, “круглых сталоў”, канферэнцый, пасяджэнняў абласнога клуба дырэктараў раённых і сельскіх дамоў (цэнтраў) рамёстваў.

Папулярызацыі традыцыйнай культуры спрыяе правядзенне абласных і рэгіянальных святаў-конкурсаў па розных відах рамёстваў з перыядычнасцю адзін раз у 2 — 3 гады. За апошнія 15 гадоў адбылося каля 40 такіх мерапрыемстваў: “Лазовыя карункі”, “Саламяныя дзівосы”, “Гліняны звон”, “Сонечная цеплыня дрэва”, “Разьбы зачараванне”, “Матчыны кросны”, “Папяровыя карункі”, “Беларуская лялька” і інш. Галоўнымі ўдзельнікамі гэтых святаў з'яўляюцца народныя творцы, якіх сёння ў вобласці звыш 4000. 91 майстар — член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці.

Для захавання, аднаўлення і пераемнасці народнай культуры важнае значэнне мае выставачная дзейнасць, якая на сённяшні дзень плённа развіваецца: з'яўляюцца новыя формы арганізацыі экспазіцый, узбагачаюцца жанры і змест выставачнай дзейнасці. У 2009 годзе ўстановамі культуры вобласці было праведзена каля 7000 выставак. Заслугоўвае ўвагі дзейнасць мастацкай галерэі Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці, дзе рэгулярна ладзяцца выстаўкі майстроў па розных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, персанальныя выстаўкі мастакоў. Асаблівую цікавасць у наведвальнікаў выклікаюць штогадовыя выстаўкі “Калядныя ўзоры” Беларускага саюза майстроў народнай творчасці і Рэспубліканская выстаўка лялек “Балаганчык”.

Значная роля ў захаванні і падтрымцы традыцыйнай народнай творчасці належыць дамам і цэнтрам фальклору і рамёстваў, якія вызначаюць мясцовыя і рэгіянальныя традыцыі, сістэматызуюць сабраныя матэрыял па відах мастацтва. Спектр работы гэтых устаноў культуры даволі шырокі: ад збіральніцкай работы ў галіне этналогіі і фальклору да апрабавання атрыманых матэрыялаў у метадычнай і практычнай дзейнасці фальклорных калектываў, гурткоў, студый выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

У мэтах рэалізацыі задуманага лічым неабходным стварыць рэспубліканскую навукова-метадычную службу, якая акумулiравала б пытанні навуковага падыходу да развіцця і зберажэння традыцыйнай культуры, а таксама — каардынацыі работы ў гэтым накірунку.

## Кулуары: з дыктафоннай стужкі



### Уладзімір ЗАМЯТАЛІН, генеральны дырэктар РУП “Нацыянальная кінастудыя “Беларусьфільм”:

— Ад надышоўшага года чакаем шэраг прэм'ер, і прэм'ер знакавых, якія прадэманструюць новы ўзровень нашай студыі. “Ваўкі”, “Масакра”, “Дасціш фантасціш”, “Замах” — я задаволены працай здымачных груп гэтых стужак і ўпэўнены ў поспеху апошніх у гледача. А галоўнымі падзеямі на здымачных пляцоўках Нацыянальнай кінастудыі, лічу, будуць сумесныя праекты. У іх ліку — васьмісерыйная тэлевізійная стужка “Немец”. Карціна будзе ствараца разам з сусветна вядомай кампаніяй “Баварыя-фільм” з ФРГ, прычым усе здымкі пройдуць у нас. Такім чынам, галоўнай падзеяй для беларускага кіно ў 2010 годзе будзе доўгачаканы выхад на еўрапейскі кінарынак.

**Андрэй БЫЧКОЎ, выконваючы абавязкі дырэктара Дэпартамента па кінематаграфіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**

# Мадэрнізацыя якасці

## У кантэксце калегіі

У 2009 годзе Дэпартамент па кінематаграфіі распачаў працу па выкананні канцэпцыі развіцця кінематаграфіі Рэспублікі Беларусь, якая ўзгоднена з Кіраўніком дзяржавы.

За 2009 г. на рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве "Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" было створана 12 адзінак поўнаметражных мастацкіх фільмаў, у тым ліку "Дняпроўскі рубеж", "Інсайт", "Кадэт", "Снайпер. Зброя помсты" (тэлевізійны, 4 серыі) і аднайменная кінаверсія, "Ваўкі", "Замах" (тэлевізійны, 8 серый), "Дасціш фантасціш". Таксама на кінастудыі выпушчаны 28 хранікальна-дакументальных фільмаў, 7 сацыяльных ролікаў і 5 мультыплікацыйных стужак.

На тэхналагічнай базе кінастудыі ажыццяўлялася вытворчасць фільмаў расійскімі партнёрамі. Прадпрыемства выканала абавязацельствы па вытворчасці беларуска-расійскай поўнаметражнай мастацкай карціны "Брэсцкая крэпасць" за кошт сродкаў Саюзнай дзяржавы. Рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам "Беларускі відэацэнтр" створана 20 хранікальна-дакументальных відэастужак, 7 навукова-папулярных, 12 відэаролікаў, 20 летапісных матэрыялаў.

Адметная ўвага надавалася падтрымцы творчай моладзі. На стварэнне фільмаў маладымі кінематаграфістамі па сацыяльна-творчым заказе на кінастудыю накіравана 33 працэнты, на "Белвідэацэнтр" — больш за 40 працэнтаў мэтавых сродкаў рэспубліканскага бюджэту. З удзелам маладых рэжысёраў на кінастудыі зняты 3 поўнаметражныя мастацкія стужкі.

Большасць карцін здымалася па сцэнарыях беларускіх аўтараў. Міністэрствам культуры працягваецца работа па прыцягненні вядомых літаратараў, драматургаў, журналістаў да напісання кінасцэнарыяў.

З мэтай пошуку актуальнага сцэнарнага матэрыялу фільмаў, здольных прыцягнуць увагу масавага гледача, праўдзіва адлюстраваць сучасныя дасягненні беларускай дзяржавы, і стварэння нацыянальнага праекта праводзіўся адбор творчых заявак. Для павышэння ролі нацыянальнай кінематаграфіі ў сацыяльна-культурным жыцці грамадства праведзены адкрыты маладзёжны конкурс на літаратурны сцэнарый мастацкай стужкі, прысвечанай нацыянальнай тэматыцы.

Праведзены перамовы з вядучымі расійскімі, украінскімі, польскімі і нямецкімі кінематаграфістамі і кінапрадзюсерамі. Актывізаваны дзелавыя кантакты з літоўскім бокам па пытаннях фільмавытворчасці. Вядзецца адпаведная работа з творчымі саюзамі, НАН Беларусі, тэлевізійнымі каналамі.

За 2009 г. камерцыйная рэалізацыя кінавідэапрадукцыі на кінастудыі і відэацэнтры склала 1 363,8 млрд. руб.

Вядзецца планамерная работа па папулярызацыі айчыннага кіно. На правядзенне кінематаграфічных мерапрыемстваў, якія спрыяюць прапагандзе беларускага кінамастацтва, у 2009 г. выдаткавана 280,5 млн. руб.

Усяго ў 2009 г. беларускія кінематаграфісты былі адзначаны 43 узнагародамі на 42 міжнародных кінафестывалях.

Праведзены XII Міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў "Анімаёўка" ў г. Магілёве, на якім былі прадстаўлены 42 творчыя работы з 11 краін свету. Гран-пры "Крыштальны аловак" у намінацыі "Лепшы мультыплікацыйны фільм" атрымала стужка "Аповесць мінулых гадоў-3" рэжысёраў студыі мультыплікацыйных фільмаў кінастудыі І.Волчака, А.Ленкіна і Н.Хаткевіч.

XVI Мінскі міжнародны кінафестываль "Лістапад" прайшоў пад патранатам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на высокім мастацкім узроўні і выклікаў вялікую зацікаўленасць у гледачоў. У афішах "Лістапада" і "Лістападзіка" — фільмы з 50 краін свету. Больш за 350 фільмаў, 130 мерапрыемстваў кінафестывалю наведалі каля 170 тыс. гледачоў, у тым ліку больш за 50 тыс. — у рэгіёнах рэспублікі.

У кінатэатрах рэспублікі праводзіліся Дні кіно замежных краін. У рамках праекта "Каннаманія" ў мінскіх кінатэатрах былі паказаны лепшыя мастацкія карціны Канскага кінафестывалю, у праграме "Адкрыты кінафармат" — мастацкія фільмы ЗША, Велікабрытаніі, Румыніі, праведзены Дні японскай анімацыі, польскага кіно аб Другой сусветнай вайне, кінамарафон, прысвечаны Дню еўрапейскіх моў, і інш.

Міністэрствам культуры распрацаваны і зацверджаны планы комплексных мерапрыемстваў кінастудыі і відэацэнтра па вырабе і распаўсюджванні рэкламнай прадукцыі новых беларускіх фільмаў, а таксама мерапрыемстваў па прапагандзе беларускага кіно.

Існуе неабходнасць больш эфектыўнага выкарыстання кінастудыяй набытага лічбавага абсталявання для вырабу і распаўсюджвання ўласнай прадукцыі, перш за ўсё — анімацыі, на DVD-дысках.

Важнымі пытаннямі з'яўляюцца падбор і падрыхтоўка кадраў творчых і тэхнічных работнікаў. Ажыццяўляюцца мерапрыемствы па павышэнні кваліфікацыі работнікаў кінастудыі, у прыватнасці, ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі за кошт прадпрыемстваў праходзяць перападрыхтоўку 12 чалавек. Аднак кінастудыі патрэбна прыкладаць большыя намаганні па прыцягненні на працу грамадзян Рэспублікі Беларусь — выпускнікоў расійскіх творчых ВНУ.

Прадоўжана практыка развіцця і мадэрнізацыі матэрыяльна-тэхнічнай базы кінавідэапракатных арганізацый аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама. У 2009 г. рамонтныя работы былі праведзены ў 45 кінатэатрах рэспублікі. Патрабуе інтэнсіфікацыі працэс пераасна шчэння кінатэатраў новым кінапраекцыйным абсталяваннем. У 2009 г. усталяваны 4 камплекты аб'ёмнага гучання "Dolby Stereo" ў кінатэатрах Гродзенскай, Мінскай абласцей і г. Мінска.

Удасканаленне патрабуе і кінавідэаабслугоўванне сельскага насельніцтва, у тым ліку ў аграгарадках. У 2009 г. у адпаведнасці з абласнымі праграмамі развіцця кінавідэапракатных арганізацый было набыта 39 відэапраекцыйных комплексаў і 5 аўтамабіляў для забеспячэння відэапаказу ў аграгарадках і аддаленых сельскіх населеных пунктах, што менш, чым планавалася ў адпаведнасці з абласнымі праграмамі развіцця кінавідэапракатных арганізацый. Гэта адбылося ў выніку неаднаразовых карэкціровак артыкулаў выдаткаў мясцовых бюджэтаў на згаданыя мэты ў бок памяншэння, што адмоўна адбіваецца на выкананні абласных праграм развіцця кінавідэапракатных арганізацый.

Рэспубліканскай экспертнай камісіяй па прадухіленні прапаганды парнаграфіі, насілля і жорсткасці пры Міністэрстве культуры за 2009 г. 14 фільмаў не рэкамендаваны да распаўсюджвання на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, на 61 кінавідэастужку выдадзены заключэнні з узроставым абмежаваннем публічнага паказу да 18 гадоў.

У 2009 г. працягвалася абнаўленне нарматыўнай прававой базы кінагаліны, ішла праца над новай рэдакцыяй Закону аб кінематаграфіі.

Прыярытэтнай задачай у сферы кінагаліны на бліжэйшую перспектыву з'яўляецца павышэнне канкурэнтаздольнасці фільмаў кінастудыі і відэацэнтра. Патрэбна павысіць іх эканамічную эфектыўнасць, для чаго неабходна:

*— значна палепшыць мастацкую і тэхнічную вартасць фільмапрадукцыі, павысіць яе актуальнасць і запатрабаванасць патэнцыйнымі пакупнікамі, што дазволіць павялічыць аб'ём продажу фільмакопій і правоў паказу;*

*— распрацаваць сістэму мер па зніжэнні неапраўданых фінансавых выдаткаў і прыцягненні ў фільмавытворчасць пазабюджэтных сродкаў;*

*— павялічыць аб'ём аказання тэхналагічных паслуг заказчыкам, асабліва — нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;*

*— паменшыць валютаёмістасць вытворчасці фільмаў і, адпаведна, долю паслуг замежных арганізацый, а таксама колькасць запрашаемых замежных творчых спецыялістаў;*

*— актывізаваць сумесную вытворчасць карцін з замежнымі кінавытворчымі прадпрыемствамі (не менш за 25% ад агульнага аб'ёму прадукцыі), а таксама з беларускімі і замежнымі тэлеканаламі;*

*— актывізаваць продаж фільмаў тэлевізійным каналам, у тым ліку беларускім, рознічнай гандлёвай сетцы. Для гэтага неабходна накіраваць намаганні на ўкараненне сучасных метадаў інфармацыйна-рэкламнай работы, выпрацаваць выразную маркетынгавую стратэгію па распаўсюджванні кожнай стужкі;*

*— правесці ў вызначаныя тэрміны рэканструкцыю і мадэрнізацыю будынкаў і кінатэхналагічнага абсталявання кінастудыі і відэацэнтра.*

Дэпартаменту па кінематаграфіі трэба стварыць умовы для развіцця прадзюсерскіх арганізацый, што дазволіць сфарміраваць канкурэнтнае асяроддзе ў кінавытворчасці.

*Дэпартаменту па кінематаграфіі сумесна з аблвыканкамамі:*

*— трэба стварыць адзіную сістэму кінапракату ў рэспубліцы, узяўшы за аснову станоўчы вопыт Мінскай, Гомельскай абласцей і г. Мінска;*

*— неабходна звярнуць увагу на мадэрнізацыю кінатэатраў, забеспячэнне іх сучасным абсталяваннем, развіццё кінатэатраў як забаўляльных комплексаў.*

*— з мэтай прыцягнення інвестараў вызначыць спіс нерацыянальна выкарыстоўваемых кінатэатраў.*

## Кулуары: з дыктафоннай стужкі

**Пётр КРЫВАСТАНЕНКА, дырэктар РУП "Беларускі відэацэнтр":**

— У нашых планах на 2010 год — 55 адзінак відэапрадукцыі (на 16 больш, чым у мінулым). Але гэта толькі колькасныя паказчыкі. Што да творчасці, то мы спадзяёмся на новыя, маладыя кадры і сучасныя тэмы, якія будуць цікавымі сучаснаму гледачу. А гэта і гісторыя нашай Бацькаўшчыны, і навукова-папулярныя стужкі, карціны, прысвечаныя цэламу шэрагу пытанняў: ад эканомікі да патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення. Трэба ўсведамляць: тое, што мы здымем сёння, будуць глядзець нашы нашчадкі праз шмат гадоў!

## У ФОТААБ'ЕКТЫВЕ...

# Культурны падмурак для паспяховай дзяржавы

## З даклада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Паўла Латушкі

*(Працяг. Пачатак на стар. 2, 4, 6, 8, 10, 12, 14, 16)*

Нягледзячы на актуальнасць пытанняў удасканалення арганізацыі дзейнасці перасоўных устаноў культуры для культурнага абслугоўвання маланаселеных і аддаленых пунктаў, заданне па фарміраванні мабільных устаноў на 2009 год выканалі толькі Гомельская і Магілёўская вобласці. З прычыны недастатковага фінансавання з запланаваных 66 перасоўных устаноў па рэспубліцы арганізавана работа толькі 39, што складае 59 працэнтаў.

На 12 аб’ектах гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны з мэтай фарміравання на іх базе культурна-дасугавых цэнтраў, сядзібна-этнаграфічных комплексаў і турыстычных маршрутаў вяліся аднаўленчыя работы. Найбольш эфектыўна з гэтым справіліся Брэсцкая, Мінская і Гомельская вобласці. Аднак работы завершаны толькі на 10 аб’ектах з 25 запланаваных па рэспубліцы. А ўпраўленнем культуры Гродзенскага аблвыканкама за 5 гадоў рэалізацыі Праграмы наогул не распачаты работы ні на адным з трох запланаваных аб’ектаў. Тэрмін выканання па дадзеным паказчыку — 2010 год. Усе работы, без выключэння, на працягу бягучага года павінны быць завершаны.

У нас створана развітая **сістэма падрыхтоўкі кадраў** для ўстаноў культуры. Разнастайнасць відаў навучальных устаноў, шырокі пералік спецыяльнасцей і спецыялізацый дазваляе забяспечыць нашу сферу па ўсіх накірунках і жанрах мастацтва. Каля 2 тысяч выпускнікоў бюджэтнай формы навучання ў мінулым годзе атрымалі вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю. Практычна кожны трэці выпускнік сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў галіны накіраваны ва ўстановы культуры сяла і аграгарадкоў. Павялічаны план прыёму на бюджэтныя месцы ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Агульны конкурс на ўсе спецыяльнасці гэтых устаноў склаў амаль тры чалавекі на месца, а ў сярэдніх спецыяльных установах — больш за два, што вышэй, чым у папярэднія гады.

На базе акадэмій музыкі і мастацтваў у мэтах стварэння ўмоў для адбору таленавітай моладзі прайшоў, у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, эксперымент, згодна з якім залічэнне абітурыентаў ажыццяўлялася па новых правілах, што дазволіла набраць студэнтаў з больш высокім творчым патэнцыялам. Эксперымент адобраны і яго правядзенне прадоўжана на 2010 год.

Удасканаленне вучэбна-выхаваўчага працэсу дазваляе не толькі павышаць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў, іх творчыя здольнасці. Банк даных таленавітай моладзі папоўніўся ў мінулым годзе звесткамі аб 326-ці прадстаўніках моладзі і 38-мі калектывах, якія за перамогі ў рэспубліканскіх і міжнародных мастацка-творчых спаборніцтвах заахвочаны спецыяльным фондам Прэзідэнта краіны па падтрымцы таленавітай моладзі.

Каля 2 тысяч спецыялістаў павысілі сваю кваліфікацыю. На добрым узроўні гэтая работа арганізавана ўпраўленнямі культуры Мінскага, Гомельскага, Гродзенскага аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама. Звыш 480 чалавек пашырылі свае прафесійныя магчымасці, атрымалі новую спецыяльнасць.

**У аб’яўленым Кіраўніком дзяржавы Годзе якасці мы павінны прыкладаць далейшыя намаганні па павышэнні творчага ўзроўню нашай дзейнасці, прафесіяналізму спецыялістаў, паляпшаць культурнае абслугоўванне насельніцтва.**

Міністэрства ініцыявала распрацоўку **Дзяржаўнай праграмы “Культура Беларусі на 2011 — 2015 гг.”**, якая павінна стаць стратэгіяй развіцця сферы культуры краіны на сярэднетэрміновую перспектыву. Прыярытэтам застаецца даступнасць культурных каштоўнасцей і паслуг. Мэта — захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, стварэнне спрыяльных умоў для дынамічнага развіцця нацыянальнай культуры, для ўсебаковага развіцця асобы.

Прадугледжваецца стварэнне ўмоў для павелічэння пазабюджэтных даходаў сферы культуры, увядзенне праектнай дзейнасці, больш эфектыўнае выкарыстанне бюджэтных сродкаў, узмацненне матэрыяльнай базы нашай сферы.

Выкананне прагнозных паказчыкаў на 2010 год — было і застаецца неад’емнай часткай штодзённай працы. Урадам даведзены паказчыкі:

платныя паслугі насельніцтву — 118 — 119 працэнтаў;

паказчык па энергазберажэнні — мінус 6 працэнтаў.

Распрацавана Праграма дзейнасці, якая ўзгоднена з намеснікам Прэм’ер-міністра Беларусі Уладзімірам Патупчыкам і накіравана ва ўсе абласныя ўпраўленні.

*(Працяг на стар. 20)*

## З выступлення

# Барыс СВЯТЛОЎ, рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў:

# Капітал і

— Сёння ў Беларусі дынамічна развіваецца справа падрыхтоўкі кадраў для сферы культуры і мастацтва. У адпаведнасці з галіновай праграмай з кожным годам яна набывае рысы добраўпарадкаванай сістэмы, дзе шматлікія элементы месцяцца на ўзроўнях першапачатковай адукацыі (524 дзіцячыя школы мастацтваў — каля 103 тыс. вучняў), сярэдняй спецыяльнай адукацыі (21 навучальная ўстанова — прыблізна 7 тыс. навучэнцаў), вышэйшай адукацыі (3 ВНУ — больш за 8000 студэнтаў).

За бюджэтны кошт у творчых ВНУ сістэмы Міністэрства культуры навучаецца 4630 студэнтаў, за кошт уласных сродкаў — 4589.

За бюджэтны кошт у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў навучаецца 2977 студэнтаў, у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў — 664, у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі — 999; за кошт уласных сродкаў у БДУ культуры і мастацтваў — 2761 студэнт, БДА мастацтваў — 746, у БДА музыкі — 83 студэнты.

Пераважная колькасць студэнтаў БДУ культуры і мастацтваў у параўнанні з дзвюма акадэміямі абумоўлена тым, што апошнія рыхтуюць эксклюзіўныя кадры з вузкай спецыялізацыяй для прафесійнай дзейнасці ў сферы мастацтва, а выпускнікі універсітэта ў большай ступені прызначаны для работы ва ўстановах сацыякультурнай сферы і павінны быць “майстрамі на ўсе рукі”. Але ж у гэтым правіле існуюць шматлікія выключэнні, таму што выпускнікі універсітэта складаюць вышэйшы ўзровень менеджэраў у галіне культуры (нагадаю толькі некаторыя прозвішчы: Л.Гуляка, Т.Стружэцкі, У.Карачэўскі, А.Гарбар, Р.Матульскі), з’яўляюцца народнымі і заслужанымі дзеячамі культуры і мастацтваў (Л.Бржазоўская, Ю.Траян, І.Дарафеева, В.Саркісьян, В.Іваноў, Г.Чорны, Л.Волчак і інш.), працуюць у высокапрафесійных калектывах (Беларускі дзяржаўны заслужаны харэаграфічны ансамбль “Харошкі”, Дзяржаўны ансамбль танца Беларусі, ансамбль “Бяседа” і інш.).

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі і Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў фарміруюць Вучэбна-метадычнае аб’яднанне вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў. Гэтыя ВНУ з’яўляюцца буйнымі адукацыйнымі, культурна-асветніцкімі і навукова-даследчымі цэнтрамі краіны, якія ажыццяўляюць таксама канцэртную, выставачную і тэатральную дзейнасць.

За імі замацавана 33 спецыяльнасці першай і другой ступеняў вышэйшай адукацыі (загад Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 387 ад 14.06.2007 г. “Аб вучэбна-метадычных аб’яднаннях вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па профілях, напрамках і спецыяльнасцях адукацыі”).

Нягледзячы на супадзенне навучальных спецыяльнасцей у розных ВНУ, дубліраванне падрыхтоўкі кадраў не існуе, таму што падрыхтоўка ажыццяўляецца па розных напрамках спецыяльнасцей або спецыялізацыях. Напрыклад, Універсітэт культуры і мастацтваў рыхтуе спецыялістаў па адным напрамку спецыяльнасці “Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва” — рэстаўрацыя вырабаў, а Акадэмія мастацтваў — па астатніх 6 напрамках спецыяльнасці, якія прадугледжаны Агульнадзяржаўным класіфікатарам Рэспублікі Беларусь “Спецыяльнасці і кваліфікацыі”; два напрамкі спецыяльнасці “Спевы” размеркаваны паміж БДУКіМ (спевы народныя) і Акадэміяй музыкі (спевы акадэмічныя), і г. д.

Высакаякасная падрыхтоўка спецыялістаў для сферы культуры і мастацтваў абумоўлена тым, што ў навучальным працэсе задзейнічаны высокакваліфікаваны прафесарска-выкладчыцкі склад. У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў працуе 16 дактароў навук, 23 прафесары, 93 кандыдаты навук, 110 дацэнтаў, у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў — 2 дактары навук, 10 прафесараў, 22 кандыдаты навук, 49 дацэнтаў, у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі — 6 дактароў навук, 28 прафесараў, 32 кандыдаты навук і 72 дацэнты.

Добрым вынікам падрыхтоўкі студэнтаў спрыяе матэрыяльна-тэхнічная база навучальных устаноў культуры і мастацтваў. За апошнія пяць гадоў уведзены ў эксплуатацыю новы будынак студэнцкага інтэрната Акадэміі мастацтваў. Распачата будаўніцтва спартыўна-культурнага цэнтра БДУ культуры і мастацтваў. Дзякуючы ўвазе Кіраўніка дзяржавы універсітэту для арганізацыі вучэбнага працэсу перададзены адміністратыўны будынак па вул. Маскоўская, 18. Штогод вылучаюцца сродкі на капітальны і бягучы рамонт, дзякуючы якім прыведзены ў належны стан будынкі студэнцкіх інтэрнатаў універсітэта і Акадэміі музыкі.

Разам з тым, хацеў бы засяродзіць вашу ўвагу на шэрагу праблем, якія сёння існуюць у справе падрыхтоўкі кадраў для галіны.

Па-першае, гэта ўступныя іспыты на творчыя спецыяльнасці. Галоўнай мэтай уступных экзаменаў у любую вышэйшую навучальную ўстанову з’яўляецца якасны адбор абітурыентаў. Найвышэйшы сярэдні бал атэстата і паспяховыя адзнакі цэнтралізаванага тэсціравання забяспечваюць магчымасць залічэння ў студэнцкія шэрагі. Але творчыя ВНУ маюць сваю асаблівасць і падкрэсліваюць дэфіцыт менавіта адоранага ў мастацкім плане абітурыента. Згубіць сапраўды творчую асобу на першым этапе для нас недапушчальна, гэта — вялікая страта.

На працягу апошніх гадоў, пасля ўвядзення тэсціравання, узнікла праблема набору таленавітых студэнтаў на творчыя спецыяльнасці. Вынікі тэсціравання па беларускай (рускай) мове і па гісторыі Беларусі сярод выпускнікоў ССНУ невысокія, але, у той жа час, уступныя экзамены па спецыяльных прадметах яны здаюць на выдатныя адзнакі. Выпускнікі агульнаадукацыйных школ з пачатковай музычнай адукацыяй слаба падрыхтаваныя да далейшай вучобы на музычным факультэце, але маюць высокі бал па тэстах і менавіта таму маюць перавагу сярод абітурыентаў.

Акадэмія музыкі і Акадэмія мастацтваў у час правядзення апошняй прыёмнай кампаніі ўдзельнічалі ў эксперыменце, згодна з якім экзамен па прадмеце “Творчасць” праводзіўся ў 3 этапы (п. 19 “Правілаў прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы”, зацверджаных Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 07.02.2006 г. № 80, і “Змяненняў і дапаўненняў…” ад 12.05.2009 г. № 243), што дазволіла прыняць самых таленавітых абітурыентаў. Агульны прахадны бал вызначаўся па выніках спецыяльных творчых экзаменаў (п. 24.17).

Універсітэт вельмі зацікаўлены ва ўкараненні ў сябе вынікаў эксперыменту, і спадзяёмся, што прыёмная кампанія 2010 года дапаможа нам вырашыць праблему больш якаснага набору студэнтаў.

Сёння вельмі востра перад ВНУ стаіць праблема нізкіх тэмпаў папаўнення педагагічнымі кадрамі з вышэйшай кваліфікацыяй. Згодна са статыстычнымі звесткамі, сярэднія паказчыкі па рэспубліцы наступныя: абараняюцца і атрымліваюць дыпломы кандыдатаў і дактароў навук сёння толькі больш за 18% аспірантаў і каля 40% дактарантаў. Трэба заўважыць, што паказчыкі па абароне дысертацый у БДУКіМ больш аптымістычныя: у 2009 годзе зацверджаны ВАК 7 з 8 абароненых кандыдацкіх і 1 доктарская дысертацыя. Адначасова, не лепшым чынам на кадравую сітуацыю ўплываюць заканадаўча нявырашаныя пытанні аплаты працы творчых дзеячаў, якія ўдзельнічаюць у навучальным працэсе ВНУ. Калі дактарам, кандыдатам, прафесарам і дацэнтам штогод устанаўліваецца надбаўка за ступень і званне, то заслужаным і народным дзеячам культуры і мастацтва ніякіх дадатковых даплат за педагагічную дзейнасць заканадаўствам аб вышэйшай школе не прадугледжваецца.

Падрыхтоўка спецыялістаў для сацыякультурнай сферы немагчымая без якаснага праходжання педагагічнай і вытворчай практык. Патрабуе рашэння праблема арганізацыі і правядзення педагагічнай практыкі сту-

# “творчасць”

дэнтаў у сувязі з тым, што змяніўся характар арганізацыі работы ў сярэдніх школах з ухілам (музычным, эстэтычным, тэатральным і г.д.), у вучэбных планах якіх адсутнічаюць дысцыпліны музычнай і мастацкай творчасці, пераведзеныя ў ранг факультатываў.

На сённяшні дзень універсітэт заключыў звыш 100 дамоў з арганізацыямі па правядзенні практыкі. Але пераважную колькасць баз практыкі складаюць установы сацыякультурнай сферы г. Мінска, што не дае магчымасці выкарыстоўваць іх у якасці першага працоўнага месца выпускніка, паколькі большасць з іх накіроўваецца на работу ў рэгіёны Беларусі па заяўках абласных упраўленняў культуры.

І тут мы пераходзім да яшчэ адной важнай праблемы падрыхтоўкі кадраў для галіны — размеркаванне і працаўладкаванне выпускнікоў.

Ва ўстановы сістэмы Міністэрства культуры штогод размяркоўваецца звыш 80% выпускнікоў. У першую чаргу маладымі спецыялістамі забяспечваюцца клубныя ўстановы, бібліятэкі, музеі. У межах магчымага (да 50%) задавальняюцца заяўкі абласных упраўленняў культуры. Кожная вобласць, за выключэннем Мінскай, штогод атрымлівае ад 25 да 38 маладых спецыялістаў. На жаль, не ўсе яны застаюцца там працаваць, і ў першую чаргу — з-за адсутнасці жылля, адпаведных умоў для працы, нізкага заробку. Там, дзе ўважліва адносяцца да маладых спецыялістаў, яны і добрасумленна працуюць. Напрыклад, нашы выпускнікі 2008 г. — сям’я Смірновых — былі размеркаваны на працу ва ўстановы г. Мінска. На пачатку 2009 г. яны атрымалі запрашэнне аддзела культуры Касцюковіцкага райвыканкама на працу і жыхарства ў г. Касцюковічы, дзе ім стварылі прывабныя ўмовы для работы і жылля. Маладая сям’я плануе застацца там і надалей. Здзіўляе пазіцыя некаторых аддзелаў культуры, калі яны спачатку запрашаюць маладога спецыяліста, а потым даюць згоду на яго пераразмеркаванне.

У вырашэнні праблемы насычэння кадрамі сельскай мясцовасці значную ролю адыгрывае мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў. Трэба больш актыўна выкарыстоўваць яе магчымасці, тым больш, што ў мінулым годзе ўнесены значныя змяненні ў нарматыўныя акты, якія дазваляюць сёння набіраць на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі юнакоў і дзяўчат з населеных пунктаў з колькасцю жыхароў да 20 000 чалавек, дазваляецца прымаць мэтавікаў пры конкурсе адзін чалавек на месца, а колькасць гэтай катэгорыі абітурыентаў павялічана да 30% ад агульных лічбаў прыёму. Мэтавікам пры працаўладкаванні заканадаўча ўстаноўлены дадатковыя сацыяльныя гарантыі і выплаты, якія тычацца аплаты працы і льготнага крэдытавання пры будаўніцтве ўласнага жылля. У той жа час, павялічаны да 5 гадоў тэрмін абавязковай работы па размеркаванні. Таму мэтавая падрыхтоўка з’яўляецца вельмі дзейснай мерай па скарачэнні дэфіцыту кадраў з вышэйшай адукацыяй у сельскай мясцовасці. А поспех у справе мэтавай падрыхтоўкі ў першую чаргу залежыць ад актыўнасці кіраўнікоў рэгіянальных упраўленняў культуры ў справе выяўлення будучых абітурыентаў і ўзаемадзеянні з ВНУ культуры і мастацтваў.

Патрабуе ўдасканалення сістэма павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў галіны. Важнай асаблівасцю працэсу павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў культуры з’яўляецца наяўнасць кваліфікаваных выкладчыкаў і неабходнай матэрыяльна-тэхнічнай базы. Невыкананне гэтых двух паказчыкаў паслужыла ў свой час галоўнай прычынай далучэння да універсітэта ўстановы адукацыі Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры. Нагадаю, што толькі 6 з 46 ставак навукова-педагагічных супрацоўнікаў займалі асобы, маючыя адпаведную кваліфікацыю. На працягу 2008 — 2009 гг. спатрэбілася больш за 600 млн. рублёў пазабюджэтных сродкаў універсітэта на вырашэнне самых неадкладных пытанняў па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы інстытута. Пры арганізацыі навучальнага працэсу па павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў павінна стаць укараненне новай змястоўна-арганізацыйнай мадэлі, накіраванай на падрыхтоўку высокакваліфікаваных і канкурэнтаздольных работнікаў, якія змогуць аператыўна рэагаваць на зменлівыя сацыяльна-эканамічныя ўмовы.

Асобная праблема, якая патрабуе пастаяннага вырашэння, — узмацненне матэрыяльна-тэхнічнай базы ВНУ культуры і мастацтваў. Забяспечанасць вучэбнымі плошчамі па дзвюх акадэміях складае ў сярэднім 62%, ва універсітэце — 80%. Месцамі ў інтэрнатах забяспечаны ў Акадэміі мастацтваў 40% ад агульнай колькасці іншагародніх, ва універсітэце — 85%. Састарэлы фонд музычных інструментаў і тэхнічных сродкаў навучання. Гэтыя праблемы перашкаджаюць далейшаму развіццю нашых навучальных устаноў, павелічэнню набору студэнтаў і не могуць быць вырашаны самастойна без удзелу і фінансавай падтрымкі дзяржавы.

І апошняе, але ж, бадай, галоўнае. Ажыццяўляючы навучальны працэс, мы павінны не забываць, што поспех у справе падрыхтоўкі маладога спецыяліста залежыць ад эфектыўнасці выхаваўчай і ідэалагічнай работы ва ўстановах адукацыі, ад фарміравання патрыятызму, прававой, псіхалагічнай і інфармацыйнай культуры асобы, ад укаранення маральных і сямейных каштоўнасцей, экалагічнай культуры, культуры бяспечнай жыццядзейнасці і здаровага ладу жыцця. Без гэтага мы будзем рыхтаваць высокакваліфікаваныя кадры для іншых дзяржаў, а не для сваёй краіны. А нашы кадры, наша культура павінны быць тым капіталам, які спрыяе эканамічнаму развіццю краіны, набліжае нас да ідэалу квітнеючай Беларусі.

## У ФОТААБ’ЕКТЫВЕ...

# “Разыначка” для “Зоркі”

**Першы этап Рэспубліканскага конкурсу маладых талентаў “Зорка ўзышла над Беларуссю” завяршыўся. Абмеркаванню яго вынікаў і планаванню другога этапа была прысвечана нарада ў Міністэрстве культуры з удзелам кіраўніцтва галіны і прадстаўнікоў аргкамітэта. Прысутныя праслухалі даклады ўпаўнаважаных асоб і ўнеслі неабходныя змены ў склад аргкамітэта, а таксама зацвердзілі старшынь журы, якое і вызначыць пераможцаў па ўсіх 12 намінацыях.**

Пачатак акцыі ўражвае маштабамі, але дадатковы піар “Зорцы” не пашкодзіць, прыйшлі да высновы арганізатары. “Інфармацыйную працу па “Зорцы” трэба ўзмацніць, — упэўнены старшыня арганізацыйнага камітэта Конкурсу, міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка. — Сродкі масавай інфармацыі добра адгукнуліся на ідэю Конкурсу, змястоўна асвятлялі падзеі першага этапа. Але хацелася б, каб гэтае асвятленне было больш актыўным. “Зорка” — адзін з новых праектаў Міністэрства, прызначаны для таго, каб выявіць максімальную колькасць маладых талентаў, таму і інфармацыйны ахоп аўдыторыі павінен быць самым шырокім, — выказаў сваё меркаванне кіраўнік Міністэрства культуры. — Але колькасць удзельнікаў — яшчэ не паказчык становішча спраў у канкрэтным раёне. Галоўнае — якасць! Па якасці прадстаўленых на Конкурс работ і выступленняў можна будзе атрымаць уяўленне і аб працы мясцовых органаў культуры. У гэтым сэнсе “Зорка” дапаможа атрымаць каштоўныя звесткі і зрабіць пэўны аналіз становішча на месцах”, — зазначыў на нарадзе Павел Латушка.

Члены аргкамітэта пагадзіліся і з тым, што такому буйному мерапрыемству, як “Зорка”, не пашкодзіць свая “разыначка”. Пакуль што Конкурс праходзіць па звыклым, добра вядомым сцэнарыі рэспубліканскага агляду. Каб атрымаць найвялікшую долю глядацкай увагі на абласных і рэспубліканскіх этапах, ён павінен нечым моцна здзівіць беларусаў. У сувязі з гэтым было вырашана актывізаваць працу з тэлебачаннем: асноўныя спадзяванні — на Нацыянальную тэлерадыёкампанію як на галоўнага інфармацыйнага партнёра “Зоркі”. Свая “фірмовая” рубрыка або прысвечаная Конкурсу перадача дапамогуць маладым “зоркам” прыйсці ў кожны дом. Прысутныя на нарадзе пагадзіліся з тым, што большую ўвагу на другі этап Конкурсу павінны звярнуць і рэгіянальныя сродкі масавай інфармацыі. Нагадаем, што Рэспубліканскі прэс-цэнтр “Зоркі” працуе на базе РВУ “Культура і мастацтва”, а галоўнай інфармацыйнай пляцоўкай для аператыўнай інфармацыі з’яўляюцца газета “Культура” і яе інтэрнет-сайт www.kimpress.by.

Між тым, шмат у якія беларускія хаты Конкурс ужо завітаў. Як падкрэслівалі амаль усе ўдзельнікі нарады, першы этап Конкурсу прайшоў пры вялікай цікаўнасці і актыўнасці ўдзельнікаў. Зразумела, найбольш актыўнымі былі намінанты ў катэгорыі “Эстрадныя спевы”. Гэтая тэндэнцыя, аб якой “К” пісала амаль з самага пачатку, праявілася ва ўсіх, без выключэння, 118 раёнах. Аднак — што прыемна — відавочных “правалаў” у астатніх 11 намінацыях нідзе не было. Няхай спецыялістаў па масавых святах і па скульптуры сярод удзельнікаў Конкурсу не так шмат, як эстраднікаў, але яны знайшліся і актыўна прадставілі свае праекты.

Праўда, колькасць удзельнікаў у розных раёнах вельмі адрознівалася. Напрыклад, на Віцебшчыне самымі актыўнымі былі маладыя таленты ў Міёрскім раёне — 150 чалавек, менш за ўсё ахвотных паўдзельнічаць у Конкурсе знайшлося ў Бешанковіцкім раёне — усяго 15. Але такая розніца зусім не сведчыць аб узроўні падрыхтоўкі саміх канкурсантаў і іх талентах. Тым не менш, пэўныя складанасці могуць узнікнуць, у першую чаргу, у тых удзельнікаў, якія пакуль не маюць акадэмічнай адукацыі і могуць фармальна не выканаць патрабаванняў абавязковай праграмы Конкурсу па асобных намінацыях. Каб такога не адбылося, на нарадзе вырашана яшчэ раз удакладніць праграму па мастацкіх дысцыплінах.

Другі этап (а распачнецца ён, як плануецца, ужо 10 лютага) будзе праходзіць з удзелам рэспубліканскага журы. У яго склад увайшлі самыя вопытныя прафесіяналы ў сваёй галіне, вядомыя не толькі ў краіне, але і за яе межамі. Такім чынам, старшынямі намінацый сталі: “Аўтарскія спевы” — Барыс Вайханскі, вядучы майстар сцэны Магілёўскай абласной філармоніі; “Жывапіс”, “Графіка”, “Скульптура”, “Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва” — Уладзімір Зінкевіч, загадчык кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў; “Дызайн” — Крысціна Стрыкелева, дэкан факультэта дызайну Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў; “Народныя спевы” — Міхась Дрынеўскі, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору імя Г.Цітовіча; “Эстрадныя спевы” — Міхаіл Фінберг, мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Рэспублікі Беларусь; “Размоўны жанр” — Ірына Кабанава, загадчык кафедры сцэнічнай мовы і вакалу Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў; “Сучасны танец” — Святлана Гуткоўская, загадчык кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў; “Фатаграфія” — Настасся Суханава, загадчык кафедры аператарскага мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў; “Сацыяльная рэклама” — Павел Іваноў, прафесар кафедры рэжысуры кіно і тэлебачання Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў; “Рэжысура масавых святаў, тэатралізаваных прадстаўленняў і шоу-праграм” — вопытны рэжысёр Ніна Осіпава.

Больш падрабязна аб выніках першага і аб умовах правядзення другога этапа Конкурсу прадстаўнікі прэсы змогуць даведацца на прэс-канферэнцыі, якая пройдзе неўзабаве.

**Антон СІДАРЭНКА**

# Культурны падмурак для паспяховай дзяржавы

## З даклада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Паўла Латушкі

*(Працяг. Пачатак на стар. 2, 4, 6, 8, 10, 12, 14, 16, 18)*

У адпаведнасці з Бюджэтным кодэксам вызначаюцца канкрэтныя меры дзяржаўнай падтрымкі дзейнасці тэатральна-відовішчных арганізацый, паркаў культуры і адпачынку, заапаркаў, арганізацый кінематаграфіі, у сувязі з чым намі распрацаваны і цяпер знаходзіцца на разглядзе ў Міністэрстве фінансаў адпаведны праект Указа Прэзідэнта, які дазволіць забяспечыць стабільную дзейнасць названых арганізацый.

Да ўжо агучанага дадам, што 2010 год Міністэрства культуры плануе абазначыць шэрагам новых праектаў. Асобныя з іх ужо рэалізаваны, у прыватнасці — Навагодні баль у Вялікім тэатры оперы і балета, які знайшоў водгук грамадскасці, калядаванні з удзелам творчага калектыву нашага Універсітэта культуры і мастацтваў у міністэрствах і пасольствах у Мінску. Хочацца таксама адзначыць Навагодні баль у Магілёве, калядныя гулянні, якія прайшлі ў Мінскай вобласці, іншых рэгіёнах рэспублікі. Мы павінны памятаць, што актыўнае вяртанне да традыцый будзе спрыяць і актыўнай самаідэнтыфікацыі, павышэнню нацыянальнай самасвядомасці суграмадзян. Міністэрства прапануе правесці гэтыя акцыі ва ўсіх абласцях рэспублікі напрыканцы 2010-га — пачатку 2011 года.

Важнай грамадска-культурнай падзеяй павінен стаць праект “Культурная сталіца года”. Сімвалічна, што ён распачаўся ў Полацку — сталіцы старажытнага княства, адкуль бяруць вытокі беларускія дзяржаўнасць і культура. У будучым на атрыманне гэтага звання змогуць прэтэндаваць іншыя гарады, што дазволіць значна ўзбагаціць культурную палітру, актывізаваць мясцовыя ініцыятывы і стварыць шырокія ўмовы для даступнасці лепшых здабыткаў нацыянальнай культуры мясцовым жыхарам. Міністэрства звяртаецца да ўсіх прадстаўнікоў рэгіёнаў з запрашэннем прыняць удзел у конкурсе на абвяшчэнне культурнай сталіцы 2011 года. Тэрмін падачы заявак — да 1 чэрвеня.

Важным праектам для нашай сферы павінен стаць культурна-гістарычны турызм з шырокім выкарыстаннем аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, музейных і бібліятэчных устаноў, распрацоўкай і забеспячэннем спецыялізаваных турыстычных і экскурсійных маршрутаў.

Важным з’яўляецца рэалізацыя сумеснай пастановы калегіі Міністэрства культуры і Міністэрства спорту і турызму, якая адбылася напрыканцы 2009 года.

Нам неабходна працаваць над стварэннем культурна-турыстычных брэндаў краіны, якія б маглі яскрава і дакладна прадстаўляць яе за мяжой. У якасці ідэі можна прывесці пазіцыянаванне брэнда Беларусі — “Краіна замкаў”.

Важнай справай для сферы культуры ў 2010 годзе стане арганізацыя шырокага святкавання 65-годдзя Вялікай Перамогі — святой для кожнага беларуса даты.

Памятаючы пра наша гістарычнае мінулае, мы плануем адзначыць і 600-годдзе Грундвальскай бітвы. Шэраг мерапрыемстваў пройдзе па краіне, а асноўныя — у Навагрудку.

Мы правядзём нямала імпрэз да 80-годдзя Уладзіміра Караткевіча. Важнай падзеяй павінна стаць усталяванне помніка У.Караткевічу ў Кіеве.

Міністэрству і абласным упраўленням неабходна актывізаваць узаемадзеянне і супрацоўніцтва з творчымі саюзамі. Важную ролю мы надаём узаемадзеянню з Канфедэрацыяй творчых саюзаў...

Для пашырэння грамадскага дыялога ў сферы культуры, паляпшэння ўзаемадзеяння Міністэрства культуры з творчымі саюзамі і дзеячамі культуры наспеў час аднавіць дзейнасць Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтваў пры Міністэрстве культуры.

Спадзяюся на актывізацыю працы экспертных Саветаў, якія дзейнічаюць пры Міністэрстве. Бліжэйшым часам нам неабходна аднавіць працу Рэстаўрацыйнага савета. Неабходна ўзмацніць ролю Савета па манументальным мастацтве ў справах развіцця гэтага жанру як у сталіцы краіны, абласных цэнтрах, так і ў рэгіёнах. Кампетэнцыя Савета павінна распаўсюджвацца і на пытанні ўзвядзення помнікаў за мяжой за кошт бюджэтных сродкаў.

У мэтах павышэння эфектыўнасці работы будзе праведзена аптымізацыя штатнага раскладу цэнтральнага апарата Міністэрства культуры, якая скіравана на ўдакладненне і пераразмеркаванне функцый упраўленняў, павелічэнне супрацоўнікаў, адказных менавіта за справы культуры і мастацтва.

Напрыканцы мінулага года Саветам Міністраў прынята рашэнне аб перападпарадкаванні Дэпартамента кінематаграфіі кіраўніцтву Міністэрства культуры, аб перадачы фінансава-эканамічных і юрыдычных функцый Дэпартамента Міністэрству.

У Міністэрстве будзе павялічана штатная колькасць упраўленняў мастацтваў, устаноў культуры, будзе створаны аддзел канцэртна-фестывальнай дзейнасці, ад якога чакаецца паляпшэнне ўзроўню арганізацыі найважнейшых культурных мерапрыемстваў нашай краіны. Спадзяюся на павелічэнне ролі ў гэтай справе “Белканцэрта” Белдзяржфілармоніі. Будзе створаны аддзел навучальных устаноў і творчай моладзі, праца з якой з’яўляецца прыярытэтнай у сферы культуры. У Міністэрстве з’явіцца і сектар кадравай працы.

*(Працяг на стар. 22)*

**З выступлення**

## Святлана СУХАВЕЙ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

# З улікам практыкі прымянення

— Сваё выступленне хачу прысвяціць пытанням заканадаўства ў сферы культуры і мастацтва.

Нагадаю, у канцы 90-х гадоў у Рэспубліцы Беларусь у цэлым сфарміравалася даволі стройная сістэма заканадаўства аб культуры. Сёння яна складаецца з базавага Закону аб культуры і 6 тэматычных законаў, якімі рэгулююцца грамадскія адносіны ў сферы бібліятэчнай і музейнай справы, кінематаграфіі, аховы гісторыка-культурнай спадчыны, народнай творчасці, уключаючы народныя промыслы і рамёствы, а таксама Закону аб творчых саюзах і творчых работніках.

З 2000 года пачаўся новы этап удасканалення заканадаўства аб культуры з улікам практыкі яго прымянення. Гэтаму садзейнічала ўкараненне ў практыку працы ўстаноў культуры інфармацыйных тэхналогій, змяненне ўмоў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і пашырэнне сістэмы права.

У мінулым 2009 годзе падлягалі карэкціроўцы законы аб культуры, аб музеях і Музейным фондзе, аб народным мастацтве і народных промыслах і рамёствах, аб кінематаграфіі і іншыя, а таксама ратыфікавана з агаворкай Пагадненне аб сумеснай фільмавытворчасці.

Выяўленню праблем у практыцы прымянення заканадаўства ў сферы культуры і іх заканадаўчаму вырашэнню садзейнічалі такія формы работы, як выязныя пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе і семінары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, што праводзіліся з удзелам Міністэрства культуры.

На выязным семінары, які адбыўся 29 кастрычніка 2009 г. на базе аб’ектаў — горада Нясвіжа і гарадскога пасёлка Мір, дэпутаты азнаёміліся з практыкай прымянення заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Выходзячы з дакладаў, што прагучалі на семінары, у кароткатэрміновай перспектыве дадзены закон карэкціроўкі не патрабуе. Разам з тым, сумесна мы павінны прагназаваць развіццё заканадаўчай базы аховы гісторыка-культурнай спадчыны з улікам такіх фактараў, як лібералізацыя эканомікі, павышэнне дзелавой актыўнасці насельніцтва, у тым ліку ў сферы турызму, інтэграцыя ў сусветныя эканамічныя і культурныя працэсы. Акрамя таго, у заканадаўстве аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны больш шырока павінны прымяняцца палажэнні міжнародных нарматыўных дакументаў UNESCO, а таксама адлюстроўвацца пытанні інвестыцыйнай дзейнасці.

На падставе рашэння камісіі, якое было прынята па выніках выязнога пасяджэння 19 студзеня 2009 года на базе Нацыянальнага мастацкага музея, Міністэрства культуры ініцыявала ўключэнне ў план падрыхтоўкі законапраектаў на 2010 год падрыхтоўку праекта Закону “Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь “Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь” з улікам практыкі яго прымянення.

Да слова, перспектыўным планам работы камісіі прадугледжваецца вывучэнне практыкі прымянення заканадаўства аб народным мастацтве, народных промыслах і рамёствах. У свой час гэты Закон, прыняты ў 1999 годзе, сыграў вялікую ролю ў справе захавання, падтрымкі і развіцця народных промыслаў і рамёстваў, традыцыйнага мастацтва ў цэлым. Лічым, што дадзены закон таксама патрабуе ўдасканалення.

Цяпер хацела б больш падрабязна спыніцца на наступным. У пункце 1 артыкула 44 Закону аб культуры дакладна вызначана, што асаблівасці прававога статуса і парадак дзейнасці творчых саюзаў і творчых работнікаў вызначаюцца заканадаўствам аб творчых саюзах і творчых работніках. Трэба адзначыць, што Закон “Аб творчых саюзах і творчых работніках”, прыняты ў 1999 годзе, быў станоўча ўспрыняты творчай супольнасцю. Аднак ужо дастаткова працяглы час творчыя саюзы рэспублікі ажыццяўляюць сваю дзейнасць у рамках Закону “Аб грамадскіх аб’яднаннях”. У гэтым заканадаўчым акце існуе шэраг палажэнняў, якія, як паказаў час, не садзейнічаюць паўнацэннаму развіццю культурнай дзейнасці творчых саюзаў і рэальнай падтрымцы творчых работнікаў. Не бярэцца пад увагу, што іх дзейнасць у многім адрозніваецца ад дзейнасці іншых грамадскіх аб’яднанняў. Прапаную Міністэрству культуры сумесна з Міністэрствам юстыцыі з удзелам прадстаўнікоў творчых саюзаў уважліва прааналізаваць існуючае заканадаўства ў гэтай сферы і накіраваць усе намаганні, каб заканадаўча замацаваць асаблівасці функцыянавання ў Рэспубліцы Беларусь творчых саюзаў.

Што да заканадаўчай дзейнасці парламента ў 2010 годзе, дык яна будзе здзяйсняцца ў адпаведнасці з планам падрыхтоўкі законапраектаў, зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Сумесна з Міністэрствам культуры намі запланавана сур’ёзная праца над праектамі законаў: “Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь “Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь” (аб ім я казала вышэй) і “Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь “Аб кінематаграфіі ў Рэспублікі Беларусь” з улікам практыкі іх прымянення. Члены нашай камісіі гатовы актыўна падключыцца да працы на стадыі іх распрацоўкі.

Хачу праінфармаваць вас яшчэ аб адным вельмі важным для творчых работнікаў законе. Вясной 2010 года ў Палату прадстаўнікоў паступіць законапраект, што рэгулюе пытанні аўтарскага права і сумежных правоў. У склад працоўнай групы, якая засядала на базе Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці, увайшлі і прадстаўнікі нашай камісіі. Гэты законапраект накіраваны на ўдасканаленне аховы правоў аўтараў, выканаўцаў, вытворцаў фанаграм з улікам міжнароднага права і ў сувязі з шырокім выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій, што ўвесь час развіваюцца. Важнае месца ў законапраекце адводзіцца пытанням калектыўнага ўпраўлення правамі, стварэння службовых твораў і спосабаў абароны парушаных правоў. Хачу адзначыць, што юрыдычнай службай Міністэрства культуры ўнесены значны ўклад у распрацоўку дадзенага праекта. Мы спадзяёмся на далейшую сумесную працу над законапраектам у парламенце, каб Закон “Аб аўтарскім праве і сумежных правах” сапраўды спраўджваў спадзяванні іх уладальнікаў.

І апошняе. Нашай камісіяй рыхтуецца да разгляду ў Палаце прадстаўнікоў у другім чытанні праект Кодэкса аб адукацыі, які атрымаў шырокі грамадскі рэзананс. Сустрэчы ў маёй выбарчай акрузе паказваюць, што бацькі, настаўнікі і выкладчыкі дзяржаўных устаноў адукацыі занепакоены выключэннем з вучэбных планаў

**Кулуары: з дыктафоннай стужкі**

### Міхаіл ШАВЕЛЬ, дырэктар Брэсцкага тэатра лялек:

— Літаральна днямі ў нас адбылася прэм’ера “Русалачкі”, якая выклікала вялікую цікавасць сярод гледачоў. А ўжо ў красавіку нам давядзецца вызваліць стары будынак тэатра: распачнецца рэканструкцыя — праект разлічаны на тры гады. Для нас гэта вельмі складаная сітуацыя, але жыццё ўсё роўна працягваецца, і мы будзем працаваць у тым жа рытме, што і раней: плануем наведаць 7 — 8 міжнародных фестываляў. І ўпершыню ў гэтых складаных умовах мяркуем выпусціць не тры новыя спектаклі, а 4 — 5, у тым ліку і з запрашэннем цікавых творцаў з-за мяжы.

*Паважаныя сябры, дзякую за ўвагу і шчыра жадаю ўсім прысутным добрага здароўя, творчых поспехаў, дабрабыту і плённага сумеснага супрацоўніцтва на карысць развіцця нацыянальнай культуры і мастацтва.*

**Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення сацыяльна-культурнай палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ірына ДРЫГА:**

# “На Беларусі няма падзелу на сталіцу і правінцыю. У нас ёсць адзіная культурная прастора”

## З выступлення

— Перш за ўсё хачу падзякаваць работнікам культуры за плённую творчую працу ў мінулым годзе. Асабліва варта адзначыць правядзенне вельмі цікавых справаздачных канцэртаў абласцей у рамках шырокага святкавання 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Вынікі вашай працы былі ацэнены на самым высокім узроўні. Пра гэта сведчаць штогадовыя прэміі Кіраўніка дзяржавы. На Беларусі няма падзелу на сталіцу і правінцыю. У нас ёсць адзіная культурная прастора, у якой важны як Вялікі тэатр, так і маленькі музей “Бездзежскі фартушок”.

Але зараз хацелася б перайсці да праблемных аспектаў, датычных выканання даручэнняў Кіраўніка дзяржавы ў галіне культуры.

Хацелася б спадзявацца, што святкаванне 65-годдзя Вялікай Перамогі адбудзецца гэтаксама цікава і маштабна, як і мерапрыемствы, прымеркаваныя да юбілею вызвалення Беларусі. Але, на жаль, пачутае сёння на калегіі і аналіз сабраных матэрыялаў сведчаць аб тым, што сфера культуры і, у прыватнасці, Міністэрства культуры краіны рыхтуецца да гэтай вялікай даты не вельмі творча. Пакуль не чуваць пра нейкія новыя ініцыятывы, адметныя праекты, — плануецца хіба традыцыйны святочны канцэрт. І калі б не сумесныя мерапрыемствы, якія прапанавалі замежныя партнёры, дык гэтая дата наогул прайшла б на перыферыі культурнага жыцця краіны.

Хацелася б звярнуць увагу ўсіх прысутных на тое, што 65-годдзе Вялікай Перамогі павінна стаць для вас асноўнай падзеяй — нягледзячы на ўсе іншыя гістарычныя юбілеі, якія прыпадаюць на гэты год. Спадзяюся, што вартыя ўвагі ініцыятывы яшчэ з’явяцца.

Дзяржаўная канцэпцыя развіцця кінематографа ў Рэспубліцы Беларусь... Ад часу яе ўзнікнення прайшоў першы год, і ўжо з’явіліся прычыны для насцярожанасці. Па-першае, было недастаткова часу на падрыхтоўку нарматыўна-прававых актаў у сферы кінематаграфіі, якія з’яўляюцца асновай рэфармавання галіны. Зразумела, час яшчэ ёсць, але для таго, каб перайсці да практычных дзеянняў, трэба больш аператыўна працаваць над распрацоўкай закону і звязаных з імі падзаконнымі актамі. І, самае галоўнае, — над тымі нарматыўнымі дакументамі, якія тычацца кінапракату. У мінулым годзе пасля калегіі ўсе нашы пракатчыкі адзначалі наяўнасць пытанняў, якія патрабуюць дэталёвай распрацоўкі. Але пакуль яшчэ адпаведных прававых актаў не з’явілася.

Другі праблемны момант, датычны згаданай канцэпцыі, звязаны з павышэннем акупнасці айчыннай кінапрадукцыі, развіцця супрацоўніцтва з замежнымі кінавытворчымі і кінапракатнымі арганізацыямі, мадэрнізацыяй матэрыяльнай базы нашых кінатэатраў, пераўтварэннем іх у сучасныя культурна-забаўляльныя цэнтры, стварэннем мультыплексаў.

Аб акупнасці нашай кінематаграфічнай прадукцыі Кіраўнік дзяржавы не раз гаварыў і не раз даваў адпаведныя даручэнні. Пакуль яшчэ вялікіх зрухаў, на жаль, не адбылося. У цэлым за 2007 — 2009 гады былі вернуты толькі 6,2% сродкаў, укладзеных у вытворчасць усіх відаў кінапрадукцыі. Пэўныя станоўчыя зрухі датычаць мастацкіх стужак і тэлесерыялаў сумеснай вытворчасці. Чатыры фільмы дасягнулі акупнасці ў 20 — 30%. Але па астатніх мастацкіх стужках паказчыкі куды больш сціплыя: ад 0,4% да 14%. Таму вельмі правільна, што ў праект рашэння калегіі ўключаны пункт аб давядзенні гэтага паказчыка хаця б да 30%.

Хацелася б звярнуць увагу і на іншы аспект гэтага пытання. Мы гаворым аб мастацкім кіно. Але ж немалыя сродкі ўкладваюцца таксама і ў анімацыйнае і дакументальнае кіно. Зразумела, ніхто нават не спрабуе ставіць задачу, каб дакументальныя стужкі поўнасцю акупляліся. Але тыя паказчыкі акупнасці, якія ёсць па анімацыі і па дакументалістыцы (ад 0,1% у 2009 годзе да 2,3% за тры гады продажу), не могуць задавальняць. І што асабліва выклікае трывогу: ад траціны да паловы дакументальных фільмаў увогуле не прадаюцца. У 2007 годзе створана 31 дакументальная карціна, не прададзена — 14. У 2008 годзе з 31 стужкі не прададзена — 11. У 2009 годзе створана 36, не прададзена 34 (Я думаю, што яшчэ проста няшмат часу прайшло.). Дык, можа, трэба неяк і перагледзець падыходы да планавання, да выбару тэматыкі дакументальных фільмаў? Бо яны павінны выходзіць да гледача, а не ляжаць на паліцах. Кінамастацтва не можа ператварыцца толькі ў “мастацтва дзеля мастацтва”.

Яшчэ адна важная праблема: ажыццяўленне рэстаўрацыі, рэканструкцыі і будаўніцтва аб’ектаў культуры. Як вы ведаеце, важкую частку Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы штогод складаюць менавіта аб’екты культуры. Але тыя сродкі — вялікія або, можа, часам і не вельмі вялікія, — якія выдаткоўваюцца паводле Праграмы, павінны выкарыстоўвацца ашчадна і рацыянальна. Практыка сведчыць, што, на жаль, гэта адбываецца не заўжды. Напрыклад, па выніках праведзенай Камітэтам дзяржаўнага кантролю праверкі рэстаўрацыі Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь былі выяўлены парушэнні. Паводле гэтых даных, больш як дзесяць мільярдаў рублёў былі выкарыстаны з парушэннямі заканадаўства. Цяпер у сферы культуры рэстаўруюцца тры такія буйныя аб’екты — гэта Мірскі замак, палацавы комплекс у Нясвіжы і тэатр імя Янкі Купалы, работы вядуцца таксама і на шэрагу іншых аб’ектаў. Трэба звярнуць увагу на тое, каб падобных парушэнняў не было, каб усё, што выдаткоўваецца з бюджэту, выкарыстоўвалася належным чынам.

Ашчадна і рацыянальна трэба падысці і да ўсталявання аб’ектаў манументальнага мастацтва. Па загадзе Адміністрацыі Прэзідэнта Міністэрства культуры краіны і аблвыканкамы распрацавалі праект Плана стварэння манументальных збудаванняў на 2009 — 2011 гады. Але тое, што нам прадстаўлена, на жаль, не магло быць зацверджана. У спісе — 93 пазіцыі! Прычым сярод іх — як вельмі значныя праекты, так і тыя, без якіх, па шчырасці, можна і абысціся. І толькі па 16 з іх прадугледжана частковае фінансаванне з пазабюджэтных сродкаў.

Таму гэты праект быў вернуты для дапрацоўкі. Прашу звярнуць увагу на тое, каб туды ўвайшлі сапраўды важныя ініцыятывы, што неабходныя нават у наш няпросты эканамічны час. Праект трэба перагледзець з улікам рацыянальнага выдаткоўвання сродкаў, а таксама гістарычнай важнасці тых асоб і падзей, якія прапануецца ўвекавечыць, іх сувязей з той тэрыторыяй, дзе плануецца ўсталяваць помнік.

Хачу яшчэ звярнуць увагу і на неабходнасць захавання заканадаўства аб устаноўцы помнікаў. У сталіцы і абласных цэнтрах яны павінны з’яўляцца толькі па ўзгадненні з Кіраўніком дзяржавы, у рэгіёнах — па ўзгадненні з аблвыканкамамі. Трэба прыпыніць тую шкодную практыку, якая, на жаль, мела месца і ў гэтым годзе: калі спачатку мясцовыя ўлады прымаюць рашэнне аб усталяванні помніка, абвяшчаюць конкурс, нават паспяваюць заказаць скульптуру, а потым ужо звяртаюцца да Кіраўніка дзяржавы. Такога быць не павінна!

Працэс стварэння помнікаў за кошт бюджэтных сродкаў павінен знаходзіцца пад няспынным кантролем дзяржаўных структур. Напэўна, усе ведаюць тую сітуацыю, якая склалася з помнікам тысячагоддзя Брэста. З прычыны элементарнага недагляду было дапушчана 70 памылак у надпісах. Уражанне ад гэтага выдатнага твора манументальнага мастацтва было сапсавана. Таму кантроль павінен быць ад першага да апошняга этапа стварэння помніка.

Яшчэ хачу звярнуць увагу і рэгіёнаў, і Міністэрства культуры на неабходнасць кантролю за выкананнем даручэння Кіраўніка дзяржавы аб упарадкаванні колькасці фестываляў і павышэння ўдзельнай вагі пазабюджэтных сродкаў у іх фінансаванні. Былі ўзгоднены спісы фестываляў, якія фінансуюцца з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў. Здавалася б, яснасці па гэтым пытанні ўдалося дасягнуць. Але вось, гляджу, у рамках праекта “Культурная сталіца Беларусі” ў Полацку сёлета запланавана правядзенне ажно васьмі фестываляў! Прычым традыцыйнымі з’яўляюцца толькі два з іх. Напэўна, усе гэтыя фестывалі фінансуюцца за кошт бюджэтных сродкаў. Ці не занадта гэта многа нават для культурнай сталіцы? Калі такія фестывалі прыносяць прыбытак або працуюць на прыцягненне турыстаў, іх правядзенне мэтазгодна, але калі фестываль ладзіцца “дзеля фестывалю”... Такога ў наш час не павінна быць.

Хацелася б таксама закрануць тую частку даручэння, якая тычыцца павелічэння ўдзельнай вагі пазабюджэтных сродкаў у каштарысе фестываляў. Напэўна, многім вядома тая сітуацыя, што склалася па выніках правядзення XVIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”. З-за праліку планавання і з-за павышэння па мясцовай ініцыятыве цэн пражывання ў гатэлях і транспартных паслуг дырэкцыя фестывалю спрацавала з мінусам і атрымала крэдыторскую запазычанасць больш як у 400 мільёнаў рублёў, якая, на жаль, дагэтуль не пагашана. Таму просьба да арганізатараў усіх мерапрыемстваў: плануйце і выдаткі, і даходы фестывалю. Не запрашайце выканаўцаў толькі дзеля павышэння маштабнасці або пашырэння геаграфіі. А да мясцовых улад просьба такая: не стварайце штучныя перашкоды на шляху правядзення культурных мерапрыемстваў.

І апошняе пытанне — праца з маладымі талентамі. Па даручэнні Кіраўніка дзяржавы Урад краіны сумесна з Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь працуе над праектам Указа аб падтрымцы таленавітай моладзі. Гэта спроба стварэння новай сістэмы працы з талентамі. Яе мэта — каб артыст, які хаця б аднойчы быў адзначаны на прэстыжным конкурсе, не выпаў з поля нашай увагі, каб ён меў дапамогу, пэўныя гарантыі і дзяржаўную падтрымку ў рэалізацыі ўласных творчых праектаў, у сваім прафесійным станаўленні. На жаль, з-за адсутнасці пакуль такога Указа гэта адбываецца не заўсёды. Малады талент перамагае на фестывалі, а потым нярэдка залежыць ад “волі лёсу”. Мне, напрыклад, не зразумела, куды падзеўся пераможца чарговага Фестывалю беларускай песні і паэзіі. На вялікіх рэспубліканскіх канцэртах яго не відаць. І вельмі не хацелася б, каб такі лёс напаткаў фіналістаў конкурсу “Зорка ўзышла над Беларуссю”... Ужо цяпер трэба думаць не толькі як іх адзначыць, але і як выкарыстоўваць іх творчы патэнцыял, як даць ім магчымасць рэалізаваць свае творчыя праекты.

Спадзяюся, на гэтыя пытанні будзе звернута адпаведная ўвага, і ў 2010 годзе даручэнні Кіраўніка дзяржавы будуць выкананы ў поўным аб’ёме.

## Кулуары: з дыктафоннай стужкі

**Аляксандр ЛУКАШЭНКА, начальнік аддзела культуры Пінскага гарвыканкама:**

— Я лічу, што за апошнія гады па галіновай праграме “Захаванне і развіццё культуры на 2006 — 2010 гады” ў сталіцы Палесся зроблена шмат. Значныя сродкі ўкладзены ў гарадскі Дом культуры, праведзены капітальны рамонт дзіцячай бібліятэкі, адкрыты драматычны тэатр, скончаны рамонт гістарычнага будынка канца XVIII стагоддзя “Палац Бутрымовічаў”, дзе цяпер знаходзіцца ЗАГС і дзе плануем адкрыць філіял Музея Беларускага Палесся з экспазіцыяй, прысвечанай роду Бутрымовічаў. Плануем сёлета завяршыць аднаўленне цэнтральнай бібліятэкі горада, а таксама распачаць рамонт і рэканструкцыю кінатэатра “Перамога”, рэканструкцыю і капітальны рамонт ДШМ № 1.

## У фотааб’ектыве...

# Культурны падмурак для паспяховай дзяржавы

## З даклада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Паўла Латушкі

*(Працяг. Пачатак на стар. 2, 4, 6, 8, 10, 12, 14, 16, 18, 20)*

**Сёння мы працуем над надзвычай актуальнай праблемай стварэння або аднаўлення навукова-даследчага, інфармацыйна-аналітычнага і арганізацыйна-метадычнага цэнтра — Інстытута культуры Беларусі. Інстытут павінен заняцца навукова-метадычным забеспячэннем сферы культуры, распрацоўкай стратэгіі і яе развіцця, больш актыўным прасоўваннем беларускай культуры за мяжой.**

Вынікі апошняга сацыялагічнага даследавання Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь паказваюць, што ў структуры каштоўнасных арыентацый моладзі лідзіруючае становішча займаюць матэрыяльны дабрабыт, здароўе і сям’я. Усё гэта, зразумела, важна. Аднак толькі 48 працэнтаў сельскай і 42 працэнты гарадской моладзі паказалі, што сярод важкіх каштоўнасцей пазіцыянуецца… культура. Такая сітуацыя не можа задавальняць.

Павінна адбывацца паляпшэнне **інфармацыйнага забеспячэння дзейнасці сферы культуры** за кошт максімальнага напаўнення інфармацыйнай прасторы падзеямі культурнага жыцця, пашырэння рэкламнага забеспячэння. У Міністэрстве будзе ўведзена пасада прэс-сакратара.

З мэтай больш поўнага асвятлення актуальных пытанняў развіцця сферы культуры плануецца рэалізаваць шэраг сумежных праектаў з беларускімі тэлеканаламі.

Трэба адзначыць важную ролю газеты “Культура”, якая сёння з’яўляецца найбольш запатрабаванай. У 2009 годзе “Культура” ўвайшла ў тройку лепшых цэнтральных выданняў краіны па выніках V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ. На базе рэдакцыйна-выдавецкай установы “Культура і мастацтва” будзе створаны Інфармацыйны цэнтр.

Плануецца таксама мадэрнізацыя Банка даных аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь з мэтай прывядзення яго ў адпаведнасць з сучаснымі нормамі стварэння інфармацыйных рэсурсаў.

У працэсе фарміравання пазітыўнага іміджа Беларусі за мяжой мы мяркуем рэалізоўваць сумесныя праекты з Міністэрствам замежных спраў Беларусі, беларускімі і замежнымі дыпламатычнымі ўстановамі. Важна праводзіць актыўную працу па пашырэнні супрацоўніцтва з беларусамі замежжа.

З улікам прыярытэтнасці развіцця сферы культуры ўнутры рэспублікі Міністэрства культуры адначасова плануе прадоўжыць дзейнасць, скіраваную на развіццё **супрацоўніцтва ў галіне культуры з суседнімі краінамі**, краінамі — стратэгічнымі партнёрамі Беларусі, і ў рамках ініцыятывы ЕС “Усходняе партнёрства” з выкарыстаннем дадатковых фінансавых магчымасцей.

Цягам 2010 года Міністэрства з улікам сваіх рэальных магчымасцей плануе правядзенне Года культуры Беларусі ў Расіі, Дзён культуры Беларусі ў Арменіі, Венгрыі, Кітаі, Літве, Славеніі і Дзён культуры Казахстана і Туркменістана ў Беларусі.

Абсалютна натуральным асяроддзем для **пашырэння выкарыстання беларускай мовы** з’яўляецца наша сфера — сфера культуры. Развіццё нашай культуры ўзаемазвязана з развіццём нацыянальнай мовы. Пры гэтым важна падкрэсліць, што ў гэтай справе недапушчальным з’яўляецца прымус. Гэта павінен быць натуральны шлях усведамлення асобай патрэбы захавання мовы. Паводле вынікаў сацыялагічнага даследавання, праведзенага ў мінулым годзе Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі Прэзідэнта, палова жыхароў падтрымлівае больш шырокае выкарыстанне беларускай мовы. Зразумела, што пры рэалізацыі гэтай, як і любой іншай ідэі, не павінна быць хібаў.

**Спадзяюся, што расстаўленыя акцэнты па найбольш важных накірунках развіцця сферы культуры знойдуць водгук і разуменне ў падыходах да якаснай працы. І тут нельга не працытаваць словы Прэзідэнта краіны, які падкрэсліў: “…Асаблівую ўвагу будзем надаваць захаванню і развіццю духоўна-культурнай сферы грамадства… Гэтыя тонкія матэрыі не даюць непасрэднага ўкладу ў эканоміку, але менавіта яны вызначаюць клімат у нашым грамадстве, забяспечваюць яго адзінства і цэласнасць”.**

Несумненна, 2010 год будзе багаты на культурныя падзеі ў нашай краіне. Вельмі важна, каб мы прадоўжылі актыўную падтрымку культуры ў рэгіёнах, далі новае аблічча традыцыйным цэнтральным мерапрыемствам, скіравалі сваю ўвагу на неабходнасць узмацнення працы па захаванні матэрыяльнай спадчыны краіны, патрэбу аднаўлення і развіцця самабытных беларускіх традыцый, стварэння дадатковых магчымасцей для развіцця прафесійнага мастацтва, далі новы штуршок у развіцці нацыянальнага кіно, скіравалі намаганні на неабходнасць далейшага павышэння ўзроўню падрыхтоўкі кадраў.

Запатрабаванымі будуць новыя ідэі, праекты, крэатыўныя падыходы. Зроблена шмат, але застаецца і невычэрпны патэнцыял.

## Ад рэдакцыі.

*Пасяджэнне калегіі Міністэрства культуры, дзе ішла гаворка пра выкананне галіновай праграмы “Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006 — 2010 гг.” і задачы арганізацый культуры на 2010 год, было дынамічным па сваім ходзе і вострым па надзённасці праблем, што ўзніміліся ў прамове міністра, у спрэчках па яе абмеркаванні, у кулуарных гутарках шматлікіх удзельнікаў, якія напоўніцу прадставілі культуру і мастацтва сённяшняй Беларусі. Былі імправізаваныя, пазарэгламентныя выступленні. Прадстаўнікі міністэрстваў фінансаў, надзвычайных сітуацый, іншых ведамстваў і арганізацый гаварылі пра ўзаемадзеянне дзяржаўна-гаспадарчых структур з арганізацыямі культуры, аналізавалі праблемныя нюансы, прапаноўвалі перспектыўныя кірункі творчых стасункаў.*

*Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка падкрэсліў напрыканцы пасяджэння, што залог поспеху — у партнёрскіх адносінах. А кожная прапанова, якая прагучала пад час выніковай калегіі ад работнікаў культуры, прадстаўнікоў іншых ведамстваў, Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а таксама парламентарыяў , будзе ўважліва прааналізавана і ўнесена ў праект рашэння калегіі. Па словах міністра, пад увагу ўзяты ўсе праблемныя моманты, якія сёння хвалююць кожнага работніка сферы. І выкананне задач, пастаўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, Урадам нашай краіны, стане сёлета гэткім жа няўхільным абавязкам, як і летась.*

## ЗАЦВЕРДЖАНА
## Распараджэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
## 31.12.2009 № 358рп

# РАШЭННЕ
## Савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі
## 29 кастрычніка 2009 г. пратакол № 2 г. Мінск

*(Працяг. Пачатак у № 4 за 2009 г.)*

**ПЛАТАВАЙ Кацярыне Аляксееўне —** навучэнцы Аршанскай дзіцячай школы мастацтваў № 2, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**ПАНЦЯЛЕЕНКА Вікторыі Уладзіміраўне —** навучэнцы дзіцячай школы мастацтваў № 2 г. Гомеля, лаўрэату II прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**ПРАКАПЕНКУ Аляксею Дзмітрыевічу —** навучэнцу ўстановы пазашкольнага выхавання і навучання “Дзіцячая музычная школа № 11” г. Мінска, уладальніку Гран-пры Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**ПРАЦКО Марыі Сяргееўне —** навучэнцы Светлагорскай дзіцячай школы мастацтваў, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**РАДЗЕВІЧ Вікторыі Віктараўне —** навучэнцы школы мастацтваў упраўлення культуры Мінскага гарвыканкама, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**РАВІНОК Дар’і Васільеўне —** навучэнцы дзяржаўнай установы адукацыі “Рэспубліканская гімназія-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі”, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**РЫМАШЭЎСКАМУ Цімафею Ігаравічу —** навучэнцу Салігорскай дзіцячай музычнай школы, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**РЫШКЕВІЧУ Яўгену Юр’евічу —** навучэнцу Роскай дзіцячай школы мастацтваў Ваўкавыскага раёна, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**РАСІНАЙ Карыне Эдуардаўне —** навучэнцы Гродзенскай дзіцячай школы мастацтваў, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**САВАСЦЕЕВАЙ Марыі Ігараўне —** навучэнцы Чавускай раённай дзіцячай школы мастацтваў, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**СЕЛІВЁРСТАВАЙ Яўгеніі Барысаўне —** навучэнцы ўстановы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны каледж мастацтваў імя Н.Ф. Сакалоўскага”, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**СТЭЛЬМАХОВАЙ Дар’і Уладзіміраўне —** навучэнцы ўстановы культуры “Магілёўская дзяржаўная дзіцячая школа мастацтваў № 2 імя М.Н. Салдатава”, лаўрэату II прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**УГОРЦЫНУ Дзянісу Дзмітрыевічу —** навучэнцу ўстановы адукацыі “Дзяржаўная гімназія № 3 г. Віцебска імя А.С. Пушкіна”, лаўрэату I прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**УСАТАВУ Аляксандру Андрэевічу —** навучэнцу ўстановы пазашкольнага выхавання і навучання “Дзіцячая музычная школа № 5” г. Мінска, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**ФІРСАВАЙ Крысціне Анатольеўне —** навучэнцы ўстановы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны музычны каледж імя М.А. Рымскага-Корсакава”, лаўрэату I прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**ФРЫГІНУ Уладзіславу Юр’евічу —** навучэнцу дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская дзіцячая школа мастацтваў № 1 з пачатковай школай”, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**ХАМІЦЭВІЧ Ганне Алегаўне —** навучэнцы Слуцкай дзіцячай музычнай школы, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**ХМЯЛЕЎСКАЙ Юліі Віктараўне —** навучэнцы Бярозаўскай дзіцячай школы мастацтваў, лаўрэату II прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**ХАРАШКО Дзмітрыю Станіслававічу —** навучэнцу Гродзенскай дзіцячай школы мастацтваў, лаўрэату II прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**ЧЭРНІКАВАЙ Дар’і Ігараўне —** навучэнцы дзіцячай музычнай школы № 5 г. Магілёва, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**ШАФІРАВАЙ Дар’і Сяргееўне —** навучэнцы дзяржаўнай установы адукацыі “Музычная гімназія № 4 г. Брэста”, лаўрэату I прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**ЮРКОВУ Івану Мікалаевічу —** навучэнцу Гомельскай дзіцячай школы мастацтваў № 5, лаўрэату I прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**ЮХНОВАЙ Кацярыне Васільеўне —** навучэнцы ўстановы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны музычны каледж імя М.А. Рымскага-Корсакава”, лаўрэату II прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**ЯТУСЕВІЧУ Дзмітрыю Сцяпанавічу —** навучэнцу ўстановы культуры “Пінская дзіцячая музычная школа № 1”, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**ЯШЫНУ Дзмітрыю Аляксандравічу —** навучэнцу ўстановы адукацыі “Магілёўская дзяржаўная гімназія-каледж мастацтваў”, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**ЯШЧУК Жанне Сяргееўне —** навучэнцы ўстановы адукацыі “Маладзечанскае дзяржаўнае музычнае вучылішча імя М.К. Агінскага”, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**у другой узроставай катэгорыі (ад 16 да 20 гадоў) —**
*у памеры 140 тыс. рублёў кожная*

**АНКУНДЗІНАВАЙ Таццяне Валер’еўне —** навучэнцы ўстановы адукацыі “Магілёўская дзяржаўная гімназія-каледж мастацтваў”, лаўрэату II прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**БЕНЯШ Алесі Аляксандраўне —** навучэнцы ўстановы адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны музычны каледж імя Рыгора Шырмы”, лаўрэату II прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**БАРЫСЮКУ Уладзіміру Аляксандравічу —** студэнту ўстановы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі”, лаўрэату Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча, дыплом II ступені (Беларусь, 2009 год);

**ДЗЕДУСЕНКУ Ігару Вітальевічу —** студэнту ўстановы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі”, лаўрэату Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча, дыплом I ступені (Беларусь, 2009 год);

**ДАЎЖЭНКУ Андрэю Сяргеевічу —** навучэнцу ўстановы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны каледж мастацтваў імя Н.Ф. Сакалоўскага”, лаўрэату Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча, дыплом III ступені (Беларусь, 2009 год);

**ЖЫЛЯКОВАЙ Кацярыне Міхайлаўне —** навучэнцы ўстановы адукацыі “Мінскае дзяржаўнае музычнае вучылішча імя М.І. Глінкі”, лаўрэату Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча, дыплом III ступені (Беларусь, 2009 год);

**КАБУШКА Дзіяне Ігараўне —** навучэнцы дзяржаўнай установы адукацыі “Рэспубліканская гімназія-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі”, лаўрэату II прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**КАЧУБУ Яўгену Сяргеевічу —** навучэнцу ўстановы адукацыі “Мінскае дзяржаўнае музычнае вучылішча імя М.І. Глінкі”, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**КАВАЛЁВАЙ Кацярыне Віктараўне —** навучэнцы ўстановы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны каледж мастацтваў імя Н.Ф. Сакалоўскага”, лаўрэату II прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**КРАЎЧАНКУ Сяргею Сяргеевічу —** навучэнцу ўстановы адукацыі “Мінскае дзяржаўнае музычнае вучылішча імя М.І. Глінкі”, лаўрэату Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча, дыплом III ступені (Беларусь, 2009 год);

**ЛЕФЕРД Марыі Аляксандраўне —** навучэнцы дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя агульнаадукацыйная школа № 53 г. Гомеля з эстэтычным напрамкам”, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год);

**ЛАБКОВУ Дзянісу Леанідавічу —** навучэнцу Шклоўскай дзіцячай школы мастацтваў, лаўрэату III прэміі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча (Беларусь, 2009 год).

*(Працяг у бліжэйшых нумарах “К”)*

Пасля цырымоніі ўручэння памятных медалёў “10 гадоў падпісанню Дамовы аб стварэнні Саюзнай дзяржавы”.

# Высокая ацэнка Саюзнай дзяржавы

**Перад пасяджэннем выніковай калегіі Міністэрства культуры ў памяшканні Нацыянальнай бібліятэкі ў ганаровай абстаноўцы адбылося ўручэнне памятнага медаля “10 гадоў падпісанню Дамовы аб стварэнні Саюзнай дзяржавы”, якое правёў намеснік кіраўніка прадстаўніцтва Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску Павел Куземчак.**

Уладальнікамі медаля сталі міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка, першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімір Рылатка, начальнік упраўлення мастацтваў Міхаіл Казловіч, начальнік упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Наталля Аўдзеева, начальнік аддзела міжнародных сувязей Міхаіл Кажура, намеснік начальніка эканамічнага ўпраўлення Сняжана Галоўчыц, начальнік упраўлення бухгалтарскага ўліку Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Ларыса Орса (Цяпер — галоўны бухгалтар Нацыянальнага Акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь. — **Рэд.**), генеральны дырэктар установы “Беларуская дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія” Аляксандр Гарбар, вядучы майстар сцэны Тэатра-студыі кінаакцёра РУП “Нацыянальная студыя “Беларусьфільм” Уладзімір Гасцюхін, кіраўнік майстэрні скульптуры дзяржаўнай установы культуры “Творчыя акадэмічныя майстэрні жывапісу, графікі і скульптуры” Леў Гумілеўскі, старшыня Беларускага саюза тэатральных дзеячаў Аляксей Дудараў, мастацкі кіраўнік Тэатра-студыі кінаакцёра РУП “Нацыянальная студыя “Беларусьфільм” Аляксандр Яфрэмаў, дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі “Рэспубліканская гімназія-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі” Андрэй Калядзіч, дырэктар установы “Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь” Уладзімір Пракапцоў, кіраўнік дзяржаўнай установы культуры “Творчыя акадэмічныя майстэрні жывапісу, графікі і скульптуры” Міхаіл Савіцкі, дырэктар — мастацкі кіраўнік дзяржаўнай установы “Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь “Нацыянальны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь” Міхаіл Фінберг, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, тэлевядучая Ірына Дарафеева, дырэктар ДУ “Нацыянальная бібліятэка Беларусі” Раман Матульскі, дырэктар АСП “Белканцэрт” Белдзяржфілармоніі Наталля Галіноўская, дырэктар РУП “Беларусьфільм” Уладзімір Замяталін, вядучы майстар сцэны ДУ “Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М.Горкага” Расціслаў Янкоўскі.

# Узнагароджаны за плён і прафесіяналізм

**На пачатку пасяджэння міністр культуры Павел Латушка зачытаў Прывітанне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь народнай артыстцы Беларусі Святлане Лясун.**

Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь былі ўзнагароджаны Марыя Далідовіч, загадчык аддзела навуковай прапаганды ўстановы “Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа”, — за значны ўклад у арганізацыю экспазіцыйнай работы музея, плённую асветніцкую працу сярод моладзі; Ірына Морых, выкладчык музычна-тэарэтычных дысцыплін Брэсцкай дзіцячай музычнай школы № 1, — за высокае прафесійнае майстэрства, значны асабісты ўклад у эстэтычнае выхаванне дзяцей і моладзі.

Нагрудным знакам Міністэрства культуры “За ўклад у развіццё культуры Беларусі” быў узнагароджаны Анатоль Курмакін, артыст аркестра вышэйшай катэгорыі Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І.Жыновіча ўстановы “Беларуская дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія”, — за шматгадовую плённую працу, высокае выканальніцкае майстэрства, значны асабісты ўклад у развіццё і прапаганду нацыянальнага музычнага мастацтва.

Заахвочванні ад Беларускага прафсаюза работнікаў культуры за вялікі ўклад у развіццё і ўмацаванне сацыяльнага партнёрства з БПРК атрамалі Уладзімір Карачэўскі, начальнік упраўлення культуры Мінскага абласнога выканаўчага камітэта; Алена Палавец, начальнік аддзела культуры Светлагорскага райвыканкама; Наталля Рамановіч, старшыня Гродзенскай раённай арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў культуры.

Ганаровай граматай Беларускага прафсаюза работнікаў культуры ўзнагароджаны Алена Баброва, казначэй пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі ўпраўлення культуры Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта; Лілія Балонкіна, старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі ўпраўлення культуры Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта; Валянціна Макарава, старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі ўпраўлення культуры Мінскага абласнога выканаўчага камітэта.

## Кулуары: з дыктафоннай стужкі

### Рыгор ВАЛЖАНКОЎ, начальнік аддзела культуры Клічаўскага райвыканкама:

— Мінулы год быў незвычайны. Маю на ўвазе і 65-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і справаздачны канцэрт нашай вобласці з тае нагоды ў Палацы Рэспублікі.

За 2009 год на рамонтах устаноў культуры асвоена больш за 1,5 мільярда рублёў. Увялі два аграгарадкі — “Новыя Максімавічы” і “Дзмітраўка”. План платных паслуг выканалі на 125 працэнтаў у супастаўных цэнах. Справіліся і з заданнем па энергазберажэнні, па росце зарплаты.

Прыярытэтны кірунак дзейнасці года бягучага — падрыхтоўка клубаў і бібліятэк у апошніх двух аграгарадках, што будуць здадзены сёлета. І работы гэтыя мы распачалі яшчэ летась.

### Рыма МУРАВЕЙ, начальнік аддзела культуры Глыбоцкага райвыканкама:

— У першую чаргу мы ставім акцэнт у сваёй працы на выкананне платных паслуг. Упраўленнем Віцебскай вобласці нам даведзена задача выканаць план на 200%, таму будзем працаваць інтэнсіўна. Абавязкова задзейнічаем аб’екты турызму: культурна-турыстычны комплекс у Івесі, Мосарскі культурна-дэндралагічны комплекс.

Нас сёлета напаткала сумная падзея: пайшоў з жыцця ксёндз Ёзэф Булька. Сёння ўжо прынята рашэнне аб стварэнні музея ў яго гонар, помніка. Таксама імкнёмся надаць статус асобнай установы культуры комплексу ў Мосары. Ён з’яўляўся філіялам музея ў Глыбокім, цяпер жа гаворка ідзе пра асобную ўстанову і, адпаведна, спецыяльны штат.

Хочам супакоіць усіх, хто турбуецца аб далейшым лёсе спадчыны Ёзэфа Булькі: ксёндз пакінуў завяшчанне, згодна з чым мы будзем далей крочыць яго шляхам і запаветам — і ствараць тыя аб’екты, аб якіх марыў святар.

### Рычард СМОЛЬСКІ, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі:

— Сапраўды, вельмі спадзяюся і веру, што 2010 год будзе адметным для Акадэміі мастацтваў. Мы адкрываем новы факультэт (а гэта здараецца вельмі рэдка) — факультэт экранных мастацтваў. Як я яго называю, “наш маленькі беларускі ВГИК”, дзе мы на сістэмным, высокапрафесійным узроўні будзем рыхтаваць творчыя кадры для экранных відаў мастацтваў — кінематографа, тэлебачання. У сувязі з адкрыццём гэтага факультэта ў нас значна пашырацца міжнародныя сувязі з аналагічнымі замежнымі ВНУ: выйдзе на новы ўзровень супрацоўніцтва з ВГИКам, наладзяцца кантакты з Вышэйшай кінашколай у Лодзі. І студэнты, адпаведна, атрымаюць магчымасць ездзіць на стажыроўкі ў суседнія краіны.

Мы рэгулярна будзем выпускаць маладых беларускіх кінарэжысёраў, кінааператараў, сцэнарыстаў, гукарэжысёраў, прадзюсераў, менеджэраў. Разам з тым, развіццё кінакультуры будзе істотна дапамагаць развіццю ўсёй нацыянальнай культуры, у прыватнасці, тэатру, выяўленчаму мастацтву, дызайну, таму што ўсе гэтыя сумежныя спецыяльнасці, віды мастацтва запатрабаваны і для кіно. У выніку гэтага значнага кроку беларускае нацыянальнае прафесійнае мастацтва атрымае істотнае падмацаванне.

# АК Афіша "К"

з 30 студзеня — да 5 лютага

## МУЗЕІ *

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 227 45 62.*

■ Мастацтва Беларусі XII — XIX стст.
■ Мастацтва Беларусі канца XIX — пач. XXI стст.
■ Мастацтва Расіі XVIII — пачатку XX стст.
■ Мастацтва краін Усходу XV — XX стст.
■ Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI—XX стст.
■ Экспазіцыя жывапісу, скульптуры, графікі мастакоў 1940-х — 1980-х гг.
■ Выстаўка **"Слуцкія паясы"**.
■ Выстаўка М.Ісаёнак **"Каляровыя імпрэсіі"**.
■ Выстаўка **"Сімфонія фарбаў"**.
■ **"Васіль Сумараў. Настаўнік і вучні"**.
■ Выстаўка адной карціны: **"Ноч на востраве Радос" І.Айвазоўскага**

*Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея РБ:*

### МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст."

*г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 227 87 96.*

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Евангельскія і біблейскія сюжэты ў італьянскай гравюры XVIII ст."**.

### ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

*г.п. Мір, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. Тэл.: (8–01596) 2 30 35.*

■ Фотадакументальная выстаўка **"Патрыятычнае служэнне Праваслаўнай Царквы"**.

### МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА ў в. Раўбічы

*Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі р-н. Тэл.: 507 44 68.*

■ Выстаўка **"З глыбінь у будучыню"**.

### МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ ў г. МАГІЛЁВЕ

*г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.*

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"The best of V.Tsesler & S.Voichenko"**.

## МУЗЕІ *

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 227 43 22.*

Экспазіцыі:
■ **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пачатку XX стст."**.
■ **"Старажытная Беларусь"**.
■ **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы"**.
■ **"З крыніц адвечнай прыгажосці"**.
■ **"Касцярэзнае рамяство Беларусі ад першабытнасці да Сярэднявечча"**.

Выстаўкі:
■ Калекцыя твораў Ю.Пэна са збору Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.
■ **"Пейзаж, які ўсміхаецца"**.
■ **"Светлае свята Ражджаства"**.

*Дом-музей I з'езда РСДРП г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.*

■ Пастаянная экспазіцыя **"Гісторыя I з'езда РСДРП"**.
■ Выстаўка **"У аб'ектыве — случчане"**.

### ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

*г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.*

■ Пастаянная літаратурна-мемарыяльная экспазіцыя "Якуб Колас. Жыццё і творчасць".
■ Выстаўка **"І паўтарыўся бацька ў сыне"** (да 95-годдзя з дня нараджэння першага дырэктара музея Д.К. Міцкевіча).
■ Тэатралізаваная экскурсія паводле казак Якуба Коласа.

### ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

*г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 72 61.*

Выстаўкі:
■ **"Васіль Быкаў. Шлях, вызначаны лёсам"**.
■ **"Спадарожнікі дзяцінства"**.
■ Выстаўка, прысвечаная 85-годдзю В.Быкава.
■ Выстаўка **"Фарбы роднай зямлі"**.
■ Выстаўка **"Гарадскія фантазіі"**.

### БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

*г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.*

Экспазіцыі:
■ Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
■ Праект **"Бітва за Беларусь. Верасень 1943 г. — ліпень 1944 г."**.
■ **"Все судьбы в единую слиты..."**. Ваенная тэма ў творчасці Уладзіміра Высоцкага.
■ **"Музей і час"**.
■ Акцыя-выстаўка **"Былі ў мяне мядзведзі"**.
■ Выстаўка карцін Алега Высоцкага **"Сусвет: заслона падымаецца..."**.

### ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

*г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.*

*Цэнтральная частка палаца Румянцавых і Паскевічаў*

Выстаўкі:
■ Юбілейная выстаўка **"Скарбы гомельскага палаца"**.
■ **"Гістарычны касцюм XVI — XIX стст."**.
■ **"Паштовы дыліжанс"** — сумесны праект з РУП "Белпошта".
■ Выстаўка скульптара Д.Папова **"Паўднёвы вецер"**.
■ Выстаўка жывапісу І.Саладоўніка **"Магія кропкі, магія пачуццяў"**.
■ **"Выратаваныя каштоўнасці"**.
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"**.

Экспазіцыі:
■ **"Культавыя прадметы"**.
■ **"Загадкавыя фантазіі мора"** *(грот палаца)*.
■ **Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.**
■ **"Чырвоная гасцёўня"**.
■ **"ART-елка"** *(у рыцарскай зале)*.
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў"**.

*Вежа палаца Румянцавых і Паскевічаў*

Гісторыка-мемарыяльная экспазіцыя **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

■ **"Па гарадах і краінах"**.
■ **"На скрыжаванні гандлёвых шляхоў"**.

*Паўночнае крыло палаца*

Выстаўкі:
■ **"Ад чыстага вытоку"** *(выстаўка Пятра Шалюты)*.
■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.
■ Працуе куток жывых экзатычных рэптылій.

*Зімовы сад*

■ Свет субтрапічных раслін і жывёл.

### ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

*г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.*

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Лакальныя экспазіцыі ў санітарным вагоне; у партызанскай зямлянцы.
■ **"Музы не маўчалі"**.
■ Пастаянная выстаўка ваеннай тэхнікі.
■ На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.
■ У выставачнай зале: **выстаўка новых паступленняў з фондаў музея.**

## ГАЛЕРЭІ*

### ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

*г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 290 60 10.*

■ Юбілейная выстаўка мастака **Генадзя Сухамлінава.**
■ Выстаўка мастака **Мікалая Андруковіча.**
■ Персанальныя выстаўкі **А.Зінчука, А.Концуба, Р.Сіплевіч, А.Мацієвіча.**

### МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

*г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1 (Палац Рэспублікі). Тэл.: 227 26 12.*

■ Выстаўка **"BigInterPhoto"**.

### ГАЛЕРЭЯ ТЫЗЕНГАУЗА

*г. Гродна, пл. Тызенгауза, 4. Тэл./факс: (8–0152) 72 27 57.*

■ Выстаўка беларускіх мастакоў.

### КАРЦІННАЯ ГАЛЕРЭЯ Г.ВАШЧАНКІ

*г. Гомель, вул. Карповіча, 4. Тэл.: (8–0232) 77 75 20.*

Экспазіцыя:
■ **"Гаўрыла Харытонавіч Вашчанка"**.

Выстаўка:
■ **Выстаўка жывапісу і графікі Аляксандра Ісачова з калекцыі сям'і мастака.**

УВАГА!

**Паважаныя чытачы!**

**ІДЗЕ ПАДПІСКА**

**на газету "Культура"**
**Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 63875, ведамасная падпіска — 638752;**

**на часопіс "Мастацтва"**
**Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 74958, ведамасная падпіска — 749582.**

**НА САКАВІК І НАСТУПНЫЯ МЕСЯЦЫ 2010 ГОДА!**

## ТЭАТРЫ*

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.*

■ **30 — "Багема"** Дж.Пучыні.
■ **31 — "Бахчысарайскі фантан"** Б.Асаф'ева.
■ **2 лютага — "Князь Ігар"** А.Барадзіна.
■ **3 — "Лебядзінае возера"** П.Чайкоўскага.
■ **4 — "Севільскі цырульнік"** В-А. Моцарта.
■ **5 — "Папялушка"** С.Пракоф'ева.

### РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ

*г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44; Тэл./факс: 334 60 08.*

■ **30 — "Белы анёл з чорнымі крыламі"** Д.Балыка.
■ **31 — "Неба ў дыяментах"** А.Чэхава.
■ **2 лютага — "Адэль"** Я.Таганава.
■ **3 — "Вяртанне Галадара"** С.Кавалёва.

### БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

*г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.*

■ **30 — "Воўк і раз, два, тры"** Н.Мацяш.
■ **31 — "Яшчэ раз пра Чырвоны Каптурык"** С.Яфрэмава, С.Коган.

КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637**
**Галоўны рэдактар — Людміла КРУШЫНСКАЯ**

**Рэдакцыйная калегія:**
**Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Уладзімір ЗАМЯТАЛІН, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Аляксандр РАШЧУПКІН, Барыс СВЯТЛОЎ, Рычард СМОЛЬСКІ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.**

**Рэдакцыя:**
**Сяргей ТРАФІЛАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Пётр ОВАД (адказны сакратар).**

**Рэдактары аддзелаў:**
**Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілля СВІРЫН, Антон СІДАРЭНКА.**

**Спецкарэспандэнты:**
**Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Алена САБАЛЕЎСКАЯ, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.**

**Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ**
**Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС**
**Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД**

**Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр.Незалежнасці,77.**
**Тэлефон: (017) 289-34-66 (прыёмная) (017) 286-07-97, (017) 334-57-23**
**Тэлефон/факс: (017) 334-57-35**
**Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334-57-41**
**www.kimpress.by**
**E-MAIL: kultura@tut.by**

Выдавец — **Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"**
**Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0494414 ад 17 красавіка 2009 г.**
**220013, Мінск, пр.Незалежнасці, 77. Тэл. (017) 289-34-66.**
**Бухгалтэрыя: тэл. (017) 334-57-35**
**Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.**
**Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца работы, зваротны адрас.**
**Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.**
**Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.**
***Матэрыял на правах рэкламы.**

**© "Культура", 2010.**

**Індэкс 63875**
**Наклад 9828**
**Падпісана ў свет 28.1.2009 у 18.30**
**Замова 341**
**РУП "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".**
**ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009.**
**Пр.Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.**

ISSN 1994-4780